# ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ



Беларускія народныя казкі



 



# ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ

Беларускія
народныя
казкі

**Мінск «Юнацтва» 1988**

ББК84Бел7
Л93

Апрацоўка А. ЯКІМОВІЧА

Мастак В. СЛАВУК

Л $\frac{4803010200-152}{М307(03)-88}$ 35—87

ISBN 5-7880-0296-6

©Ілюстрацыі. Выдавецтва «Юнацтва», 1987.





## СТАРЫ БАЦЬКА

Даўней было так: як састарэе бацька, то сын завязе яго ў глухую пушчу ды і пакіне там...

Вось аднаго разу павёз сын бацьку ў пушчу. Шкада яму бацькі — моцна любіў ён яго, але што зробіш? Не павязеш — людзі смяяцца будуць: старых, скажуць, звычаяў не трымаецца. Яшчэ з сяла выганяць...

Едзе ён так маркотны, аж бацька і кажа яму:

— Няўжо ты, сынку, мяне, старога ды няду-жага, аднаго ў пушчы пакінеш?

Падумаў сын, змахнуў слязу і кажа:

— Не, бацька, не пакіну. Але для людзей хоць трэба зрабіць гэта. Уночы я прыеду па цябе, забяру і буду трымаць да смерці ў цёмнай каморцы, каб ніхто не бачыў.

Так сын і зрабіў.

Як прыйшла ноч, прывёз ён бацьку з пушчы ды схаваў у цёмнай каморцы.

Здарылася няшчасце: град усё жыта выбіў і няма чым нават новага пасеяць.

Прыйшоў сын да бацькі ў цёмную каморку, бядуе:

— Што рабіць? Не пасеем жыта — і налета без хлеба будзем.

Бацька кажа:

— Не, сынку, пакуль я жыў, без хлеба мы не будзем. Слухай мяне. Як ты быў яшчэ малы, тады я гумно ставіў. А ў тым годзе быў вельмі ж добры ўраджай. Дык я немалочаным жытам гумно накрыў. Здзяры страху, абмалаці і мецьмеш[1] насенне.

Сын так і зрабіў. Садраў страху з гумна, абмалаціў і пасеяў увосень жыта.

Суседзі дзівяцца: адкуль ён насенне ўзяў?

А сын маўчыць, бо нельга ж прызнацца, што гэта стары бацька яму памог.

Прыйшла зіма. Няма чаго есці. Зноў ідзе сын да бацькі ў цёмную каморку.

— Так і так,— кажа,— давядзецца з голаду паміраць...

— Не,— кажа бацька,— з голаду не памром. Слухай, што я табе скажу. Вазьмі рыдлёўку ды пакапайся ў хаце пад лаваю. Там я некалі, як быў яшчэ малады і дужы, закапаў трохі грошай на чорны дзень. Жыццё, сынку, пражыць — не поле перайсці: усё можа здарыцца. Так я думаў, так і рабіў.

Зарадаваўся сын, выкапаў бацькавы грошы і купіў збожжа. Сам з сям'ёю хлеб есць ды яшчэ і суседзям пазычае. Вось яны і пытаюцца ў яго:

— Скажы ты нам, браце, адкуль ты хлеб бярэш?

---

[1] Мецьмеш — будзеш мець.

Прызнаўся сын.

— Бацька,— кажа,— мяне корміць.

— Як жа так? — дзівяцца суседзі.— Ты ж завёз свайго бацьку ў лес, як і ўсе добрыя сыны!

— Не,— кажа ён,— я не рабіў так, як вы робіце, а пакінуў бацьку пры сабе дажываць веку. Затое, як прыйшла бяда,— бацька мне і памог. Старыя людзі большы розум маюць, чым маладыя.

Перасталі з таго часу сыны бацькоў у пушчу вазіць, а пачалі пад старасць шанаваць іх і даглядаць.



# ЯК МУЖЫК ЦАРСКАГА ГЕНЕРАЛА ПРАВУЧЫЎ

Капаў мужык склеп і выкапаў кавалак золата. Ачысціў яго ад пяску і думае: «Што ж мне з ім рабіць? Занесці пану, дык пан адбярэ і нічога за яго не дасць. Занесці карчмару, дык той ашукае: скажа, што гэта не золата. Пакінуць дома — могуць зладзеі ўкрасці... Не, панясу лепш самому цару. Што ён дасць, тое і вазьму».

Апрануў мужык новую світку, абуў новыя лапці і панёс цару золата.

Можа, тыдзень ішоў, можа, два — прыходзіць нарэшце ў царскую сталіцу. Падышоў да царскага палаца.

— Куды, дзядзька, ідзеш? — спытаў яго вартавы салдат.

— Да цара, служывенькі.

— Чаго?

— Ды вось нясу яму кавалак золата.

Салдат прапусціў мужыка за браму.

Падышоў ён да царскіх пакояў. А там на варце сам царскі генерал стаіць.

— Куды, мужык, лезеш? — грозна закрычаў генерал на мужыка.

— Да цара,— кажа мужык.

— Чаго?

— Дык вось, капаў я склеп на агародзе і выкапаў кавалак золата. Дык нясу цару — можа, ён што дасць за яго.

— Пакажы,— кажа генерал,— золата.

Паказаў яму мужык золата. Паглядзеў генерал: праўда, што золата.

Падумаў генерал, паскуб сябе за вусы і кажа:

— Калі дасі мне палавіну таго, што табе цар за золата дасць, дык пушчу, а не — дык ідзі назад.

— Добра, панок, дам! — кажа мужык.

Генерал далажыў цару. Цар выйшаў, забраў золата і пытаецца ў мужыка:

— Што ж табе, мужычок, даць за яго?

— Анічога, царочак-паночак. Калі ёсць чым пачаставаць, то пачастуй: бо я з вялікай дарогі, дужа есці захацеў.

Цар загадаў, і слугі прынеслі мужыку каравай белага хлеба і бутэльку віна.

Паглядзеў мужык на далікатны пачастунак і кажа:

— Царочак-паночак! Мой дзед і прадзед такога хлеба не елі, такога віна не пілі — і я да гэтага не прывык. Ці няма ў цябе салдацкага хлеба?

Прынеслі мужыку чорнага салдацкага хлеба. Наеўся і дзякуе цару.

— Ну, а што яшчэ ты хочаш, мужычок?

Анічога, царочак-паночак. Цяпер дазволь паскакаць трохі ў тваіх пакоях.

— Гэй, музыку! — клікнуў цар.

Прыйшла палкавая музыка.

— Не,— кажа мужык,— я пад такую музыку не ўмею скакаць.

— А пад якую ж ты ўмееш?

— Пад дуду.

Знайшлі дудара з дудою. Зайграў дудар, а мужык як пайшоў скакаць, аж царскія пакоі трасуцца. Наскакаўся ўволю, усе лапці стаптаў, а потым кажа:

— До[1].

Дудар перастаў іграць.

А цяпер, царочак-паночак,— кажа мужык,— ёсць у мяне яшчэ адна, апошняя, просьба.

— Якая?

— Ды вось я табе тут нашумеў, насмяціў сваімі лапцямі — дык дай мне за гэта сто розаг.

— Навошта табе розгі? — кажа цар.— Ты ж мне золата прынёс!

— Не, царочак-паночак, дай розаг, бо я ад цябе так не пайду.

Ну, рабіць няма чаго. Паклікаў цар ка́таў з розгамі. Палажылі мужыка на ўслон. Ка́ты намачылі розгі ў салёнай вадзе і падрыхтаваліся біць яго.

А мужык раптам як закрычыць:

— Пачакай, царочак-паночак! У мяне ёсць палавіннік.

— Які палавіннік?

— Ды вось, калі я ішоў да цябе, дык мяне тут адзін твой генерал не пускаў. «Калі дасі,— кажа,— палавіну таго, што табе цар дасць за зо-

---

[1] До — досыць.

лата, то пушчу». Я абяцаў яму аддаць палавіну. Дык дайце яму першаму яго палавіну — усё ж ён не мне раўня, я яму сваю чаргу мушу пераступіць.

Прывялі генерала. Убачыў ён розгі, задрыжаў, пачаў нешта гаварыць, ды язык яго не слухаецца.

А мужык кажа:

— Не бойся, панок-генерал, я цябе не ашукаю: тваю долю спаўна аддаю. Дайце яму пяцьдзесят, а потым рэшту мне.

Раздзелі генерала, палажылі на ўслоне і пачалі лупцаваць розгамі.

Як налічылі роўна пяцьдзесят, мужык кажа:

— Царочак-паночак! Ён табе добра служыць, дай яму і маю палавіну. Мне не шкада.

Далі генералу яшчэ пяцьдзесят розаг. А мужык шапку ў ахапку ды за парог.



## АД КРАДЗЕНАГА НЕ ПАСЫЦЕЕШ

Былі ў аднаго чалавека два сыны. Як выраслі яны, бацька сказаў:

— Пара, сыны, за сталую работу брацца. Хто з вас чым хоча заняцца?

Маўчаць сыны — не ведаюць, якую сабе работу выбраць.

— Ну, дык пойдзем,— кажа бацька,— у свет, паходзім, паглядзім, што людзі робяць.

Сабраліся і пайшлі.

Ідуць так памаленьку, сыны да ўсяго прыглядаюцца, думаюць, якую работу ім выбраць.

Падышлі да адной вёскі. Бачаць — стаіць пры канцы вёскі кузня. Зайшлі яны ў кузню. Прывіталіся да каваля, пагаварылі. Старэйшы сын нават молат у рукі ўзяў — памог кавалю нарог выкаваць.

І зноў далей рушылі.

Падышлі да другой вёскі. Старэйшы сын паглядзеў туды-сюды: не відаць кузні ў гэтай вёсцы. Вось ён і кажа да бацькі:

— А чаму б і тут кузню не паставіць? Я мог бы за каваля застацца. Мне гэта работа падабаецца.

Бацька зарадаваўся: знайшоў, думае, большы сын сабе спосаб да жыцця!

— Добра,— кажа,— будзь кавалём у гэтай вёсцы.

Паставіў ён сыну кузню, той і пачаў кавальскаю справаю займацца. Людзі яго хваляць, і сам ён сваёю работаю задаволены.

А меншы сын, колькі ні ходзіць,— ніяк не можа работу па густу выбраць.

Ідзе ён аднаго разу з бацькам каля лугу. Бачыць — пасецца на лузе вол. А вёска далекавата, і пастуха не відаць.

— Ці не пачаць мне, бацька, валоў красці? — кажа сын.— Работа гэта лёгкая, і кожны дзень з мясам буду. Растаўсцею і сам, як вол.

— Крадзь,— кажа бацька.— На тое ж я цябе і ваджу, каб ты сабе які сталы занятак выбраў.

Заняў сын вала і пагнаў дахаты. А бацька кажа:

— Пачакай мяне пры лесе — мне трэба яшчэ ў гэтую вёску заглянуць: там адзін мой знаёмы жыве...

Гоніць сын вала ды ўсё азіраецца, як воўк, ці не бяжыць хто за ім. Пакуль да лесу дагнаў, дык добра такі перадрыжаў. Аж млосна ад страху зрабілася.

Пачакаў ён на ўзлеску, пакуль бацька вярнуўся, і пагналі разам вала дахаты.

Зарэзалі дома вала, знялі шкуру ды пачалі варыць свежаніну.

Наварылі, бацька кажа сыну:

— Вось што, сынку, давай знімем меркі і паглядзім, хто з нас ад гэтага вала пасыцее.

Узяў ён шнурок, змераў шыю сабе і сыну і завязаў вузельчыкі.

Селі за стол. Бацька есць спакойна, а сын усё на дзверы паглядае: ці не ідзе хто вала шукаць? Забрэша сабака, пройдзе ці праедзе хто — сын за мяса ды ў каморку хаваецца... А ў самога рукі і ногі дрыжаць.

І пайшло так дзень за днём.

З'елі нарэшце таго вала. Бацька кажа сыну:

— А цяпер давай шыі мераць: хто з нас пасыцеў?

Памералі, дык у бацькі шыя ўдвая патаўсцела, а ў сына ўдвая патанчэла.

Дзівіцца сын:

— Чаму гэта так?

— Бо ты еў крадзенага вала,— кажа бацька.

— Дык жа і ты крадзенага еў!

— Не, я заплаціў за вала гаспадару і еў як свайго. Таму я і пасыцеў. А ты як сядзеш за стол, дык страх адразу на шыю скок і душыць! Праз гэта яна і худзее. Ад крадзенага, брат, не пасыцееш!



## СТРАШНЫ ЗАЛОМ

Даўней бадай што ў кожным сяле быў свой вядзьмар. А што ні вядзьмар — то найпершы чмут. Вядзьмар і шэпча, і заломы[1] вырывае, і ўсялякім чарадзействам займаецца. Людзі баяліся іх, дагаджалі, як ліхой скуле.

Дык вось, быў у адным сяле такі вядзьмар. Яго ведалі не толькі ва ўсёй аколіцы, а і ў цэлай акрузе. Ніхто не асмельваўся сказаць яму што насуперак, каб не зрабіў чаго ліхога.

Але быў у тым сяле адзін смелы чалавек. Звалі яго Тодарам. Многа ён па свеце хадзіў, шмат дзе быў, шмат чаго бачыў.

— Чмуціць ён, ваш вядзьмар,— кажа Тодар суседзям.— Нічога ён не знае і не ведае.

---

[1] З а л о́ м — пераламаны пучок жыта. Паводле старых забабонаў зало́м рабіўся ліхадзеямі, каб наклікаць на гаспадара бяду. Вырваць яго мог толькі вядзьмар за пэўную плату.

— Што ты гаворыш! — не верацъ суседзі.— Глядзі, каб не наслаў ён на цябе бяды...

— Ну, то самі ўбачыце, праўду я кажу ці не.

Пайшоў Тодар у сваё жыта і заламаў там залом. Праз колькі дзён прыходзіць да ведзьмара.

— Так і так,— кажа,— нейкі ліхадзей заламаў у маім жыце залом. Баюся, каб што благое мне не сталася. Схадзі вырві. Ты ж з гэтаю нячыстаю сілаю знаешся. Я табе заплачу што захочаш.

Пачуўшы пра плату, вядзьмар ахвотна згадзіўся. Пайшлі на поле. Вядзьмар паглядзеў на залом здалёк і кажа:

— Вельмі ж страшны залом. Так да яго падступацца я і сам баюся.

Скінуў ён сарочку, каб большага туману напусціць на Тодара, і ракам папоўз да залома.

Паўзе вядзьмар і ўсё крэхча, што страшны залом нехта заламаў: відаць, на гаспадарову смерць. Давядзецца даражэй узяць з Тодара за такі залом.

Падышлі сюды і Тодаравы суседзі падзівіцца, як вядзьмар будзе страшны залом вырываць.

Тут Тодар, доўга не думаючы, уссеў на ведзьмара верхам, дастаў з-пад крыса дручок ды давай дубасіць ашуканца:

— Я ж табе, шэльма, пакажу, які гэта страшны залом! Я ж яго сам і заламаў!

Раве вядзьмар немым голасам, а Тодар дубасіць яго па чым папала. Біў, біў, а потым пытаецца:

— Будзеш добрым людзям галовы дурыць?

— Не,— енчыць вядзьмар,— пусці толькі жывога.

Пусціў Тодар ведзьмара. Усхапіўся той ды наўцекача — і сарочкі адрокся.

Напужаліся суседзі, думалі — вядзьмар са свету Тодара зжыве: ён жа ўсё можа зрабіць... Ажно мінае тыдзень, другі, а Тодар жыве і на ведзьмара чхае.

Вядзьмар жа керхаў, керхаў ды і скапыціўся: відаць, Тодараў дручок быў мацнейшы за яго чары.



## ЯК СЦЕПКА З ПАНАМ ГАВАРЫЎ

Жыў некалі адзін пан, ды такі злосны, што бяда: ніхто не мог яму дагадзіць. Усе яго баяліся, як чорта. Бывала, прыйдзе да яго хто штонебудзь прасіць, а ён як крыкне: «Што скажаш?» — дык той ад страху забудзецца і аб сваёй просьбе.

— Нічога, паночку, усё добра,— адказвае бядак калоцячыся.

— А па добрым што?

— Не ведаю, паночку...

— На стайню яго, галгана! — раве пан.— Даць яму розаг, каб больш сюды не хадзіў!

Іначай той пан і не ўмеў з людзьмі гаварыць. І людзі баяліся з ім гаварыць, бо скажаш што не так, не па шэрсці — да смерці засячэ.

Аднойчы гуляў пан у карты і выйграў у суседняга пана маёнтак. Было гэта вясною. Са-

браўся пан ды паехаў аглядаць свой новы маёнтак. Як паехаў, дык і застаўся там на ўсё лета: вельмі ж яму спадабаўся новы маёнтак. Праўду бо кажуць, што новае сіта на калочку вісіць, а старое пад лавай ляжыць.

Тым часам у старым маёнтку нарабілася шмат бяды. «Як,— думае аканом,— сказаць пану пра бяду?» Сам ехаць да яго баіцца. Надумаўся ён паслаць каго з дваровых. Ды няма ахвотніка. Каму хочацца дастаць ад пана лішніх розаг?

А жыў там адзін чалавек. З выгляду так сабе — недалужны, затое на язык бойкі: за словам у кішэнь не лезе. Імя ён меў Сцяпан, але ўсе звалі яго проста Сцёпка. Малы, бач, ён быў ростам і шчуплы.

Дачуўся Сцёпка, што аканом шукае пасланца да пана, прыйшоў да яго і кажа:

— Пашліце мяне — я ўмею з панам гаварыць.

Рад аканом, ледзь не цалуе Сцёпку. Даў ён яму хлеба, сала, цэлую жменю медзякоў і выправіў у дарогу.

Ідзе Сцёпка, медзякамі пазвоньвае, ніводнай карчмы не мінае.

Доўга ішоў ён ці коратка, прыходзіць нарэшце ў новы маёнтак.

Хацеў Сцёпка проста ў панскі дом ісці, ды лёкай спыніў:

— Ты чаго тут, валацуга, цягаешся!

І нацкаваў на яго сабак.

Сцёпка дастаў з торбачкі кавалак хлеба, кінуў сабакам. Тыя і перасталі брахаць. Тады Сцёпка зноў падышоў да ганка.

— Што табе трэба? — крычыць лёкай.— Тут сам пан жыве!

Сцёпка пакланіўся лёкаю і кажа:

— А мой паночку, а мой даражэнькі, вось жа мне і патрэбен гэты сам-пан. Я прыйшоў да яго са старога маёнтка.

Лёкай памякчэў.

— Добра,— кажа,— я далажу пану пра цябе. Але скажы ж ты мне, адкуль ты ведаеш, што і я — пан?

— Гм,— хітра кашлянуў Сцёпка,— бачу: ты пан не пан, а так сабе паўпанак, бо ў цябе лоб нізкі, нос слізкі, от і відаць, што лізаў панскія міскі.

Узлаваўся лёкай, схапіў Сцёпку за каўнер ды давай тузаць. Убачыў гэта пан з акна і паклікаў лёкая да сябе.

— Які там хлоп[1]? — Пытаецца пан у лёкая.

— Ды валацуга нейкі са старога панскага маёнтка,— адказаў лёкай і нізка пакланіўся пану.

Пан успомніў, што даўно не быў у старым маёнтку.

— Пакліч яго сюды,— загадаў ён лёкаю.

Пабег лёкай клікаць Сцёпку, а той дастаў капшук, набіў люльку тытунём ды пачаў агонь крэсіць. Выкрасіў агню, закурыў люлечку. Курыць ды паплёўвае на чысты панскі ганак.

— Ідзі ў пакоі, цябе пан кліча! — крычыць яму лёкай.

— Не трасца пана трасе, пачакае,— адказвае Сцёпка і пакурвае сабе люлечку.

— Ды хутчэй жа ты! — злуецца лёкай.— А то пан цябе розгамі засячэ...

— Не засячэ! Вось дакуру люльку, тады і пайду.

---

[1] Хлоп — халоп, абразлівая клічка прыгонных сялян.

Чакаў, чакаў пан Сцёпку, не дачакаўся. Кліча зноў лёкая:

— Чаму хлоп не ідзе?

— Люльку, пане, курыць.

Пан узлаваўся:

— Гані яго сюды!

Сцёпка дакурыў люльку, выбіў з яе попел, схаваў за пазуху і толькі тады падаўся памаленьку ў панскія пакоі. Лёкай бяжыць наперадзе, адчыняе Сцёпку дзверы, як пану.

Увайшоў Сцёпка да пана ды і закашляўся пасля моцнага тытуню. Кашляе, а пан чакае, толькі злосна вачыма зіркае. Адкашляўся сяк-так Сцёпка і кажа:

— Добры дзень, паночку!

— Што скажаш? — хмурыцца пан.

— Усё добра, паночку.

— А па добрым што?

— Ды вось, паночку, прыслаў мяне аканом. Бачыце, панскі сцізорык зламаўся.

— Які сцізорык?

— Ды, мабыць, той, якім пану пер'і вастрылі.

— Як жа яго зламалі?

— Кажуць жа, пане, што без начыння і лапця не спляцеш. А ўсялякае начынне пры рабоце псуецца. Вось так і панскі сцізорык. Хацелі пану на боты злупіць з выжла[1] шкуру, узялі сцізорык. Але на панскім выжле вельмі ж моцная шкура была. Ну, сцізорык і зламаўся.

— Якога выжла? Што ты пляцеш, галган? — закрычаў злосны пан і хацеў ужо загадаць слугам, каб забралі Сцёпку на стайню і далі розаг. Але Сцёпка пачаў расказваць далей:

— Панскі выжал, гэта той самы, можа, пан

[1] Выжал — паляўнічы сабака.

памятае, што ўскочыў быў у студню, а Мікіту пасылалі даставаць, дык ён і ўтапіўся там. Эге ж, той самы выжал, што пан любіў яго браць на паляванне. Здаецца, калі не мыляюся, пан аддаў за таго выжла суседняму пану трох мужыкоў...

— Што ж, мой лепшы выжал здох?

— Здох, пане.

— З чаго ж ён здох?

— Каніны аб'еўся, дык адразу і ногі выпруціў.

— Якой каніны?

— Ды мяса жарабца.

— Якога жарабца?

— Панскага ж буланага жарабца, з лысінкаю.

— Што ж, і ён здох?

— Здох, пане. А шкада, добры жарабец быў.

— О, я нешчаслівы!

— Э, пане, чаго вельмі турбавацца. Ужо ж ведама, калі жарабятка ўродзіцца з лысінкаю, то яно ці здохне, ці яго воўк з'есць.

— З чаго ж жарабец здох?

— Падарваўся, мабыць.

— Што ж на ім рабілі? Шпарка ездзілі, ці што?

— Ды не, пане, на ім не ездзілі, ён заўсёды на стайні стаяў.

— А што ж?

— Ваду, пане, вазілі.

— Але ж нашто была тая вада?

— Людзі ж кажуць, паночку, што як топішся, дык і за брытву ўхопішся. Як загарэўся панскі свінушнік, дык аканом загадаў і на жарабцы ваду вазіць.

— Што ж, і свінушнік згарэў?

— Згарэў, пане.

— Як жа ён загарэўся?

— Бачыш, пане, ён быў блізка каля аборы[1], дык ад яе і загарэўся.

— То і абора згарэла?

— Згарэла, пане, як свечка.

— З чаго ж яна загарэлася?

— Вось гэтага, паночку, добра не ведаю: ці ад абозні, ці мо ад пакояў.

— О, то і пакоі згарэлі?

— Згарэлі, пане, начыста, от быццам хто языком злізаў.

— І ўвесь двор згарэў?

— Увесь, пане: чыста, гладка, хоць рэпу сей.

Ухапіўся пан за галаву ды давай божкаць.

— Але з чаго ж загарэліся пакоі? — зноў пытаецца пан у Сцёпкі.

— Ад свечак, пане.

— Для чаго ж паліліся свечкі?

— Ну як жа, пане, вядома, заўсёды свечкі паляць, як хто памрэ.

— Хто ж там памёр?

— Вечны пакой, каб ёй на тым свеце лёгка ікнулася,— пані памерла.

— Што, што ты кажаш?.. Пані памерла?!

Пачуўшы такія навіны, пан зваліўся з крэсла, а Сцёпка закурыў люлечку ды падаўся сабе дахаты.

---

[1] Абора — хлеў.





## ПАЛЕШУКІ І ПАЛЕВІКІ

Было ў бацькі дванаццаць сыноў, усе рослыя ды ўдалыя хлопцы.

Жылі яны на вялікай палянцы, між цёмнага лесу. Вялі там сваю гаспадарку, палявалі на дзікіх звяроў і птушак. Стары бацька, сівы, як голуб, сядзеў сабе ў кажушку і ўлетку ды толькі камандаваў. І былі ў сям'і лад ды згода.

Пажаніліся сыны, пайшлі ў іх свае дзеці. Вялікая вырасла сям'я. Ды ўсе слухалі старога бацьку, і кожны рабіў сваю работу.

Але вось па некаторым часе памёр бацька. І пачаліся ў сям'і нелады. Жонкі братоў сварацца, адна адну заядаюць — рады няма. Такая пайшла між імі калатня, што і мужыкі нічога зрабіць не могуць. Крычаць жонкі, хочуць дзяліцца.

«Ну што ж,— думаюць браты,— трэба дзяліцца».

Пачалі дзяліцца. Ды справа гэтая не такая і лёгкая, як ім здавалася. Сяк-так з крыкам ды зыкам падзялілі дабро і жывёлу. А як дайшло да зямлі, дык тут чуць адзін аднаго не пазабівалі: ніяк не могуць падзяліць сваю палянку, каб нікому крыўды не было. Перасварыліся браты і сталі адзін аднаму ворагамі.

Толькі два малодшыя браты жылі між сабою ў вялікай згодзе: куды адзін, туды і другі. Не захацелі яны калаціцца з братамі за зямлю, пакінулі бацькаву хату ды падаліся ў свет шукаць іншага прытулку.

Зрабілі браты з двух дубоў вялікія сані, запрэглі ў іх шэсць пар валоў, наклалі дабра, пасадзілі жонак з дзецьмі ды паехалі на санях па пяску. А каровы і дробная жывёла ззаду за імі пайшлі.

Працягнулі трохі валы дубовыя сані па пяску ды сталі як укопаныя. Калёс тыя браты не мелі і нічога пра іх не ведалі. Бо нікуды яны з свайго лесу не толькі ўлетку, але і зімою не ездзілі.

Пачалі браты адпілоўваць круглыя калодкі ды падкладваць пад палазы. Коцяцца калодкі, і сані паўзуць уперад.

Надакучыла меншаму брату падкладваць калодкі пад палазы, вось ён і кажа большаму:

— Давай зробім так, каб калодкі самі круціліся пад палазамі.

І зрабілі яны першыя ў тым краі калёсы. Лёгка пайшлі цяпер валы, так што браты і самі паселі на воз. Едуць і дзівяцца, як яны да гэтага часу абыходзіліся без калёс.

Ехалі яны, ехалі, даехалі да вялікай ракі. Агледзелі раку — усюды глыбока, нідзе няма зручнага месца, каб пераехаць уброд. А тут такая навальніца ўсхадзілася, што лес, як звер,

раве. Ломіць навальніца дрэвы, як саломінкі, ды шпурляе ў раку. Плывуць яны па вадзе цэлымі сціртамі.

Паглядзеў на іх малодшы брат, падумаў і здагадаўся, як перабрацца цераз раку.

Налавілі яны з братам дрэў, ачысцілі галлё, калоды звязалі адну з адной і зрабілі моцны плыт. А як сціхла навальніца, узвезлі свой воз на плыт. Самі стаяць на плыце ды кіруюць доўгімі жэрдкамі-бусакамі, а плыт плыве, як карабель.

Убачылі каровы, што валы паплылі на другі бераг, кінуліся ў раку ды за імі наўздагон. Толькі свінні і авечкі не адважыліся скакаць у ваду. Стаяць на беразе, бляюць, рохкаюць. Вярнуліся потым браты з плытом назад і забралі іх. Гэтак усе і пераправіліся цераз шырокую і глыбокую раку. Паехалі яны далей і забраліся ў такую пушчу, што і канца ёй няма.

Пачалі браты церабіць прасекі ў пушчы ды масціць грэблі. Але дзе там! Чым далей, тым лес гусцей, а ў ім такія нетры, што і выбрацца нельга. Большы брат змарыўся, аслабеў.

— Застануся,— кажа ён меншаму брату,— я тут, бо не хопіць у мяне сілы з гэтага лесу выцерабіцца.

І застаўся з сваёю сям'ёю жыць у лесе.

З таго часу і яго самога, і ўвесь яго род пачалі зваць палешукамі.

А малодшы брат не захацеў заставацца ў лесе. Быў ён дужы, як тур, і спадзяваўся на сваю сілу. Ён адзін церабіў прасекі, масціў грэблі і ехаў далей.

І да гэтых часоў засталіся яшчэ на Палессі тыя прасекі ды грэблі, што нарабіў малодшы брат.



Ці доўга ён так выбіраўся з цёмнага лесу, ці не, але вось нарэшце пачалі трапляцца прагаліны ды палянкі з пяскамі. Асеў малодшы брат на гэтых палянках, пачаў іх араць і сеяць збожжа.

І з таго часу празвалі яго самога і ўвесь яго род палевікамі.

А потым рассяліліся палешукі і палевікі, занялі новыя лясы і палі ды сталі добрымі суседзямі.

Так і цяпер жывуць.

 

## ДУРНАЯ ПАНІ
## І «РАЗУМНЫ» ПАН

Быў адзін мужык. Да ўсяго спрыцён. Што ні надумаецца — тое і зробіць. І ўсё яму гладка ўдавалася.

Захацелася яму з паноў пажартаваць. Пайшоў ён на панскі двор. Бачыць: ходзіць па двары белая свіння з парасятамі. Мужык зняў шапку, пачаў кланяцца свінні.

Убачыла гэта пані з балкона.

— Чаго ты, мужык, кланяешся маёй Белцы? — пытаецца.

Мужык пачухаў патыліцу ды кажа заклапочана:

— Бачыш, панечка, справа якая: ваша Белка даводзіцца маёй Рабцы роднай цёткай. Рабка выходзіць замуж, дык прыслала мяне запрасіць цётку на вяселле. А цётка нешта ўсё гнецца, не хоча ісці. Вось я ёй і кланяюся...

— А я і не ведала, што ў маёй Белкі ёсць пляменніца! — здзівілася пані.

— Ёсць, ёсць! — кажа мужык.— Яна такая ж добрая, ціхая ды рахманая, як і яе цётка.

— Дык як жа ты яе — павядзеш ці павязеш? — пытаецца пані.

— Павяду, панечка: няма ў мяне на чым везці.

— А парасяты як — дома застануцца?

— Не, панечка. Рабка запрашала цётку з дзеткамі...

— Дык жа яны малыя: ці дойдуць?

— Так, так, панечка,— кажа мужык,— могуць і не дайсці: дарога няблізкая.

— Дык я загадаю, каб запрэглі каня.

— Вядома, панечка, на возе ім лепш было б: усё ж яны не простыя парасяты, а панскія.

Тут як бачыш падалі мужыку павозку. Звязаў ён Белку, палажыў на воз, а парасят паўкідаў у мяшок.

— Ці скора ж чакаць Белку з дзеткамі з вяселля? — пытаецца пані.

— А так пасля дожджыку ў чацвер,— адказаў мужык.

Сеў ён на воз і паехаў дахаты.

Вярнуўся пан з палявання. Пані яму і расказала, што іх Белка паехала на вяселле да пляменніцы і вернецца пасля дожджыку ў чацвер.

— Ах,— кажа пан,— якая ж ты дурная! Падмануў цябе мужык: прападзе і свіння з парасятамі, і фурманка. Ну, ды мяне ён не абдурыць!

Загадаў пан запрэгчы тройку коней, сеў з фурманом і памчаўся даганяць мужыка.

Ляціць тройка па дарозе, толькі пыл курыць ды званок пад дугою звініць.

Пачуў мужык званок і думае: «Ці не пагоня гэта?» Звярнуў каня ў лес, прывязаў да дрэва. А сам выйшаў на дарогу, накрыў шапкаю жабу і сеў каля яе, аберуч за шапку трымаючыся.

Пад'ехаў пан.

— Набок! — крычыць мужыку.

— Не, панок,— кажа мужык,— аб'язджайце вы, бо мне нельга з гэтага месца сысці.

Аб'ехаў пан, потым спыніўся і пытаецца:

— Гэй, мужык, ці не бачыў ты тут чалавека з свіннёю і з парасятамі?

— Бачыў, пане.

— А ведаеш, куды ён паехаў?

— Ведаю, панок.

— Дык пакажы нам дарогу.

— Не магу, панок, рук падняць. Я лепш раскажу вам: едзьце проста, потым завернеце крута-крута направа, потым крута-крута налева і гэтак далей.

Пан пытаецца ў фурмана:

— Зразумеў?

— Не, пане.

Тады пан пытаецца ў мужыка:

— А ты сам дагнаў бы яго?

— Чаму ж не! Я яго як бачыш дагнаў бы!

— Дык дагані, я табе заплачу.

— Не магу. Мне няможна нават з месца скрануцца.

— Чаму?

— Дык гэта ж, бачыце, якая справа: ехаў гэтай дарогай мой пан, сустрэўся з другім панам, а той падарыў яму заморскага шчыгла. Дык пан загадаў мне вартаваць шчыгла, пакуль ён не вернецца.

— Ну, то едзь ты з маім фурманом, а я буду вартаваць шчыгла,— кажа пан.

— Не, пане, не магу: ты выпусціш шчыгла, тады мне бяда будзе.

— Ну, дык я буду вартаваць з фурманом, а ты даганяй адзін.

— Не, не магу...

— То на табе сто рублёў — толькі даганяй.

Падумаў мужык і кажа:

— Добра. Але глядзіце ж — мацней трымайце шапку, каб шчыгол не вылецеў!

Узяў мужык сто рублёў, сеў у панскую карэту і паехаў. Па дарозе адчапіў званок, заехаў у лес, забраў падводу з Белкаю ды рушыў дахаты.

Сядзяць пан з фурманом над шапкаю з гадзіну — няма мужыка. Пачакалі яшчэ гадзіну — нікога не чуваць. Фурман пакруціў галавою і кажа:

— Пані была дурная — аддала мужыку каня з Белкаю і парасятамі, а пан яшчэ дурнейшы: аддаў за нейкага заморскага шчыгла тройку лепшых коней з карэтаю ды яшчэ сто рублёў у прыдачу.

Пан узлаваўся:

— Што ты брэшаш, галган! Не можа таго быць, каб мужык перахітрыў мяне! Я калі дам аб'яву, дык адразу даведаюся, чый шчыгол, і тады знайду мужыка.

Сядзелі яны, сядзелі над шапкаю, а тут ужо і звечарэла. Фурман і кажа:

— Пане, есці хочацца. Пара дадому...

Пану таксама есці захацелася, ды і рукі знямелі. Ён і кажа:

— Возьмем шчыгла і пойдзем. А там я знайду гэтага мужыка! Ну, я шапку буду падымаць, а ты лаві шчыгла.

— Ой, пане,— калоціцца фурман,— баюся: яшчэ выпушчу.

— Ну, дык ты падымай шапку, а я лавіць буду. Я не такі разявака, як ты!

Прыўзняў фурман шапку, а пан цоп абедзвюма рукамі за жабу!

Агледзеўся пан ды як закрычыць, як замахае рукамі...

А фурман смяецца, узяўшыся ў бокі:

— Ці не казаў я, што пані дурная, а пан яшчэ дурнейшы!

— Маўчы,— просіць пан фурмана,— не кажы хоць пані...

І паваloкся пан дадому як мыла з'еўшы.





## ШАПТУХА

Жыла ў адным сяльцы старэнькая бабка. Сяльцо было маленькае, хат з дзесяць. І на самым канцы яго стаяла бабчына хатка. Была яна такая ж старэнькая, як і сама бабка. Знайшоўся якісьці добры чалавек, нарабіў бабінай хатцы падпорак і абклаў яе прызбаю. Вось і стаіць яна, бо не ведае, у які бок паваліцца. Назбірае бабка трэсак, падпаліць у печы і грэецца перад агнём. Ведама, старому дык і ўлетку холадна. Калі ёсць што, то з'есць, а няма — і так абыдзецца.

Ехаў аднаго разу праз тое сяльцо пан. Убачыў ён знаёмую бабку ды і здзівіўся.

— Хіба ж ты яшчэ жы́ва? — пытаецца.

— Жыва, паночку. Не ідзе смерць па мяне...

— А колькі ж табе гадоў?

— Ды я сваім гадам і ліку не ведаю...

— А як жа ты жывеш?

— Якое маё жыццё! Як так жыць, то лепей

гніць: рабіць не магу, а дзеці і ўнукі ўсе даўно паўміралі. Адна я цяпер, як тая былінка ў полі. Няма каму і вады падаць. Ці не памог бы ты, паночку, чым-небудзь старому чалавеку?

Пан быў скупы. Не было яшчэ таго, каб ён каму памог у бядзе. Падумаў ён і кажа:

— Чаму ж ты, старая, не шэпчаш ці не варожыш?

— Не ўмею, панок.

— Дык я цябе навучу.

— А навучы, голубе, навучы, каб і я недарэмна свет займала.

Нахіліўся пан да бабчынага вуха ды кажа:

— Як паклічуць цябе да хворага, ты пахукай на яго тройчы і шапчы: «Сіголаў жыў, сіголаў не». Пашапчы гэтак трохі, дай яму выпіць вады з бутэлечкі — ён і ачуняе. А не ачуняе, то сіголаў яго бяры.

Падзякавала бабка пану і пачала шаптаць, як ён яе навучыў.

Пайшла чутка па аколіцы, што аб'явілася такая бабка-шаптуха, якая вельмі ж добра лечыць і людзей і жывёлу. Ды не толькі лечыць, але і ўсё ўгадвае.

Павалілі да тае бабкі людзі адусюль. Нясуць і вязуць ёй усялякага дабра. Жыве бабка і паміраць не хоча.

Тым часам паехаў аднойчы пан на паляванне. Дзень быў халодны. Пан доўга ганяўся за зайцамі, крычаў на ўсё горла супраць ветру, вось і села яму скула ў горле. Пан і да аднаго доктара, і да другога — ніхто не можа скулы тае вылечыць. А яна вось-вось задушыць яго.

Жонка кажа, што трэба паклікаць шаптуху, а пан і слухаць не хоча: ведае ж ён гэтую шаптуху!

Цярпеў, цярпеў ён, а нарэшце, як не стала моцы, дык і згадзіўся, каб паклікалі бабку.

Прывезлі бабку, а пан ужо ледзь дыхае. Давай тут бабка хутчэй хукаць ды шаптаць: «Сіголаў жыў, сіголаў не...»

Пачуў пан, што бабка шэпча тое, чаму ён яе дзеля жарту навучыў, дык яго аж смех апанаваў. Бабка ж не зважае ні на што — шэпча: «Сіголаў жыў, сіголаў не...»

Слухаў, слухаў пан, а потым як зарагоча — дык скула ў горле і лопнула...

Ачухаўся пан ды давай дзякаваць бабцы, што адратавала ад смерці.

— І гэта ты ўсё так лечыш, як я цябе навучыў? — пытаецца ён.

— Эге ж, панок, так і лячу.

— Ну, а як жа ты ўгадваеш?

— Ды як прыйдзецца...

— Угадай жа, што я цяпер думаю.

Паглядзела бабка пану ў вочы і кажа:

— Думаеш: заплаціць мне за шэпты ці не?

Пан засмяяўся:

— А няхай цябе, бабка, качкі стопчуць: як жа ты ўгадала?

— А гэта, пане, кожны ўгадае, хто цябе знае...



## НЕДАЛІКАТНЫ СЫН

Жыў у аднаго чалавека сын. Вялікі ўжо вырас, а ніколі бацьку бацькам не назваў.

— Кузьма,— крычыць сын на бацьку,— ідзі араць! Кузьма, загані свіней у хлеў!

Крыўдна бацьку, ды што зробіш: малога не перавучыў, а цяпер і рады не дасі.

Смяюцца людзі з Кузьмовага сына.

— Дурань,— кажуць,— як гэта можна, каб бацьку не паважаць!

А яму хоць бы што: не слухае ні бацькі, ні людзей.

Аднаго разу паехаў Кузьма з сынам па сена. Наклалі вазы ды едуць дахаты: бацька на адным возе, сын — на другім. Мінулі гладкую дарогу, уехалі ў лес. Тут пайшлі карчы ды выбоіны.

Злез бацька з сена, ідзе збоку, за возам наглядае, каб не абярнуўся. А сын ляжыць на сваім возе ды толькі камандуе:

— Кузьма, вунь яма — падтрымай воз! Кузьма, правядзі маю кабылу па ўзбочыне, а то кола за корч зачэпіцца!

Бегае бацька ад воза да воза, не можа ўправіцца. А сын толькі выскаляецца з яго:

— Маладзец, Кузьма! Добра стараешся.

Узлаваўся бацька і перастаў бегаць да сынавага воза.

У адным месцы сынаў воз трапіў у глыбокую выбоіну і перакуліўся... Сын шлёпнуўся носам у гразь.

Устаў ён і лае бацьку:

— Бачыш, Кузьма, што ты нарабіў!

Паднялі воз і паехалі далей. Сын ужо і на сена не палез. Ідзе збоку ды ўсё бурчыць на бацьку.

Даехалі да крутога павароту. Бацька свой воз падпёр плячом і аб'ехаў паварот, а сын пашкадаваў сілы траціць. Воз перакуліўся і падмяў яго пад сябе.

— Кузьма! — крычыць сын з-пад сена.— Падымі воз!

Маўчыць бацька як вады ў рот набраўшы. Дастаў з кішэні капшук, закурыў люльку. «Паляжы ж там, калі ты такі разумны»,— думае бацька.

Клікаў, клікаў сын Кузьму, а той як аглух. Сыну ўжо і дыхаць цяжка. Напалохаўся ён, заенчыў не сваім голасам:

— Бацька, ратуй!

Зарадаваўся Кузьма, што сын нарэшце такі назваў яго бацькам. Падняў воз і кажа да сына, усміхаючыся:

— На свеце, брат, жывучы, усяго нажывеш — і Кузьму бацькам назавеш!

З таго часу і пайшла гэтая прыказка.





## СТРАЛЕЦ І РЫБАК

Жылі ў бацькі два сыны. Выраслі яны, як дубы, а бацьку ўсё няма палёгкі.

Большы, праўда, старанны быў хлопец, ды вось бяда: змалку ўсё розныя насткі майстраваў, а як падрос, дык дастаў сабе стрэльбу і не разлучаецца з ёю. Людзі на работу ідуць, а ён стрэльбу на плячо ды шмыг у лес ці на балота. Цягаецца ўвесь дзень, дахаты ж з пустымі рукамі ідзе, галодны як воўк. Топча лапці, а прыбытку ніякага. Калі ж часам і ўпалюе якое зайчаня, дык хутчэй нясе пану, каб той даў пораху. Перш сварыўся на яго бацька, потым бачыць — нічога не зробіш, калі ў сына такая ахвота.

А меншы сын такі гультай удаўся, што хоць ты яго з хаты гані. Дзень і ноч сядзіць з вудаю на рэчцы, за гаспадарку ж ані не бярэцца. Наловіць жменю печкуроў ці яршоў — якая ад іх карысць? Хіба што кату́ паласавацца.

Пачаў і на яго бацька сварыцца, што толькі час марна траціць. Але і меншы сын не слухае бацькі, бо, ведама, ахвота горш няволі.

А каб апраўдацца перад бацькам, што с пустымі рукамі прыходзяць, выдумляюць сыны розныя прычыны. Стралец расказвае:

— Сёння з самага ранку натрапіў я на чараду коз. Была там каза з казлянятамі ды стары казёл барадаты. Але толькі я зладжыўся, каб стрэліць, ажно ў казла, ліха на яго, у ноздрах восы заказыталі. Ён як чмыхнуў, дык цэлы рой восаў вылецеў з ноздраў. Давай тыя восы казу з казлянятамі кусаць... Ну, яны і пасмалілі як шалёныя ў гушчар. Я за імі. Выскачыў на палянку, а там стаіць на задніх лапах вялізны, як вол, мядзведзь. Чмыхае мядзведзь носам ды абараняецца пярэднімі лапамі ад чмялёў. Ну, думаю, гэта, відаць, толькі што выйшаў з яго чмяліны рой. У такі час мядзведзі вельмі злосныя. Пабаяўся я страляць у яго, а хутчэй скокнуў на елку. Дык вось і сядзеў там, на елцы, увесь дзень, пакуль мядзведзь не пайшоў...

Рыбак расказвае:

— Сяджу гэта я на беразе, цікую за паплаўком. Раптам нейкі шчупачышча цоп за кручок — і на дно! Я за вудзільна, цягну, ажно жылы ў мяне трашчаць. Давалок да берага, а шчупак віль хвастом — і будзь здароў... Бадай цябе! Закінуў другі раз вуду. Зноў той шчупачышча-дурнішча папаўся. Падцягнуў яго да берага, хацеў рукамі ўхапіць, ды не ўтрымаўся і — шабулдых у ваду!.. Насілу жывы выкарабкаўся.

Слухае іх бацька і толькі галавоюківае:

— Праўду бо людзі кажуць, што ў стральца дым густы, ды абед пусты, а рыбак як намочыцца, дык і рыбы яму не захочацца.

Думаў, думаў бацька, як яму адвучыць сыноў ад благой прывычкі, ды нічога не можа прыдумаць.

Аднойчы зайшоў да яго стары жабрак і папрасіўся нанач. Разгаварыўся бацька з жабраком, на сыноў паскардзіўся.

— Выгадаваў,— кажа,— дзяцей, а падмогі на старасці ніякай. Бо вядома: стралец страляе, а гаспадарка гуляе!

Выслухаў жабрак бацькаву скаргу і параіў, што яму зрабіць, каб прывучыць сыноў да гаспадаркі.

Назаўтра бацька кажа сынам:

— Вось што, сынкі, ёсць у мяне адна далёкая радня. Пайду я да яе. А вы сабе жывіце як хочаце.

Сабраўся і пайшоў.

Засталіся сыны гаспадарамі. Доўга яны гаспадарылі ці нядоўга, але хутка дажыліся так, што няма чаго, як кажуць, і на зуб палажыць. Пачалі браты спрачацца, хто вінаваты. Спрачаліся, спрачаліся, а да праўды так і не дайшлі.

Толькі вось праз нейкі час зноў завітаў да іх той жабрак. Ну, вядома, трэба накарміць падарожнага чалавека, а ў братоў ні кавалка хлеба.

Стралец дакарае рыбака:

— Няхай бы ты хоць якую рыбіну злавіў, каб было чым чужога чалавека прыняць.

Рыбак адказвае стральцу:

— Няхай бы ты хоць якое казляня падстрэліў...

Паслухаў іх жабрак і кажа:

— Дзякую вам, хлопчыкі, за клопат. Ёсць у мяне хлеб, што добрыя людзі далі.

Дастаў ён з торбы хлеб, сала і пачаў частаваць стральца і рыбака. Сорамна ім прымаць

пачастунак ад беднага жабрака, ды голад не цётка. Накінуліся браты на жабракову торбу і як бачыш усю апрасталі.

— Чаму вы такія бедныя? — пытаецца ў іх жабрак.— Хіба ў вас няшчасце якое, ці што?

Браты цяжка ўздыхнулі:

— Зусім, дзядуля, прапала наша гаспадарка...

— А як жа вы раней жылі?

— Бацька гаспадарыў, дык хлеб і вёўся.

— А што ваш бацька: малады ці стары?

— Ды зусім ужо стары.

— Вось бачыце,— кажа жабрак,— ён стары, ды гаспадаркаю карміўся сам і вас карміў. А вы маладыя, дужыя і без хлеба галееце...

Брыдка стала братам, радзей пачалі яны са стрэльбай ды вудай цягацца, а больш гаспадаркай займацца.

Мінуў год-другі, і зажылі яны як трэба.

Тым часам вярнуўся бацька з гасцей. Паглядзеў: гаспадарка як мае быць! Зарадаваўся ён і кажа:

— Вось цяпер я магу спакойна і паміраць, бо бачу, што вы розуму набраліся, ловіце, страляеце і гаспадарку даглядаеце.



## НАДАКУЧЛІВЫЯ ГОСЦІ

Жылі два браты. Гаспадарку мелі невялікую, ды сяк-так кідаліся.

Прыехалі да іх аднойчы госці: два гультаі-гулякі, аднаго поля ягады. Прынялі браты гасцей як трэба: пачаставалі, чым мелі, павесяліліся як умелі.

Тым часам мінае дзень, мінае другі, тыдзень мінае, а госці і не думаюць дамоў выбірацца: п'юць, гуляюць ды яшчэ і гаспадароў ад работы адрываюць.

Надакучылі госці братам. Пачалі яны думаць, як ад іх збавіцца.

Думалі, думалі, нарэшце дадумаліся. Пайшлі малаціць, а там слова за слова давай сварыцца, каб госці чулі.

Меншы брат крычыць на большага:

— Хоць ты і старэйшы, а ў крыўду я табе не дамся! Будзем дзяліцца!

— Давай! — крычыць і большы брат.— Дзяліцца дык дзяліцца!

Вярнуліся ў хату і пачалі дзяліцца. Падзялілі ўсю гаспадарку. Дайшло да гасцей.

— Давай і гасцей дзяліць! — кажа меншы брат.— Я вазьму аднаго госця на сваю палавіну хаты, а ты другога — на сваю.

— Добра,— згадзіўся большы брат.— Дзяліцца дык дзяліцца!

Падзялілі і гасцей.

Прыйшла пара абедаць.

Большы брат згатаваў добры абед, нават два скруткі кілбасы на стол палажыў. А меншы нарыў капусты, ды і то нішчымнай.

Селі есці.

Меншы брат кажа свайму госцю:

— Няма ў мяне, дарагі госць, чым цябе частаваць: бачыш, брат усю скаромніну пры дзяльбе забраў. Вазьмі ў яго хоць скрутак кілбасы.

Госць быў ласы на чужыя кілбасы. Але толькі працягнуў ён руку па кілбасу, як большы брат — трах! — яго лыжкай па лбе.

Тут меншы брат схапіў апалонік.

— Як! — закрычаў ён на большага брата.— Дык ты майго дарагога госця будзеш біць лыжкай?! Калі ж так, то я твайго апалонікам трэсну!

Ды так трэснуў госця па галаве, што таму аж неба з аўчынку здалося.

Тады большы брат схапіў качаргу.

— А калі ты майго,— кажа,— яшчэ даражэйшага госця, чым твой, будзеш біць апалонікам, дык я твайго качаргою перацягну!

— А калі ты майго качаргою,— бушуе меншы брат,— дык я твайго зусім вон выкіну!

І ён схапіў госця большага брата за каўнер ды павалок за парог.

— Ах! — закрычаў большы брат.— Калі так, дык няхай жа і твой ідзе за маім!

Пры гэтых словах ён схапіў госця меншага брата і вытурыў за дзверы.

Ачухаліся госці ад такога пачастунку, пабралі лахі пад пахі ды і ходу дадому.

Так браты і збавіліся ад надакучлівых гасцей.



## ЗАМЫКАЙ

Вёз чалавек у горад дровы прадаваць. Даганяе яго пан у брычцы.

— Гэй, мужык! — крычыць пан.— Прэч з дарогі!

Мужык пакінуў воз, сышоў з дарогі і кажа:

— Едзь, пане, хоць да д'ябла!

Пан падумаў, што мужык дурны, не зразумеў яго.

— Прэч з канём! — растлумачыў ён мужыку.

Мужык выпраг каня, звёў убок, а воз пакінуў на дарозе. Узлаваўся пан на мужыка:

— Прэч з возам, пся крэў!

— То так бы ты адразу і казаў! — усміхнуўся мужык.

Запрог ён каня і з'ехаў з дарогі.

Прыехаў пан у горад, пераначаваў, а назаўтра пайшоў на рынак шукаць аўса. Ходзіць па

рынку ды распытваецца, хто прадае авёс. Падышоў і да таго чалавека, якога ўчора дагнаў на дарозе. Людзей на рынку многа, і пан яго не пазнаў.

— Ці не чуваць тут аўса? — пытаецца пан у мужыка.

— Аўса? — перапытаў мужык.

— Але, аўса.

— Пачакай, пане,— кажа мужык,— зараз даведаемся.

Узлез ён на воз і ветрыць носам. Панюхаў, панюхаў і адказвае:

— Не, пане, не чуваць...

Бачыць пан — жартуе з яго мужык.

— Ці не ўчарашні ты? — пытаецца пан.

— Бадай цябе, пане, качкі стапталі! — адказвае мужык.— Мне ўжо гадоў за сорак мінула, а ты кажаш — учарашні!

Пан злуецца:

— Чый ты, мужык?

— Мар'янін.

— А хто Мар'яна?

— Жонка мая.

— А хто ў вас старшы?

— Есць у нас, пане, адна бабка, Даміцэля, дык ёй ужо гадоў за сотню будзе: яна за ўсіх старэйшая.

Плюнуў пан:

— Я не аб тым цябе пытаю: каго вы слухаеце?

— А-а... То так бы і казаў! Есць у нас у вёсцы хлопчык гадоў васьмі ці дзевяці. Ен як пачне іграць на дудачцы, дык уся вёска збягаецца слухаць.

— Ды не! — тупае пан.— Я пытаюся, каго ты баішся?

— А-а... Есць у нашага Піліпа сучка паганая, дык мы ўсе яе баімся: хто каля Піліпавага двара ідзе, палку нясе.

— Вось жа бесталковы мужык! Я пытаюся, хто ў вас вышэй за ўсіх!

— А ёсць у нас, пане, мужык Аўдзей — ён за ўсіх вышэй.

Бачыць пан, што з мужыком не згаварыцца, пачаў у другіх дапытвацца, чый гэта мужык: якога пана?

Дапытаўся і паехаў да таго пана.

— Твой мужык з мяне жартуе,— скардзіцца ён пану.

Загадаў пан цівуну прывесці мужыка на допыт.

Павёў цівун мужыка ў панскія пакоі. Мужык ішоў ззаду за цівуном і не зачыніў за сабою дзверы. Пан убачыў гэта і закрычаў:

— Мужык, замы́кай[1]!

— Му-у! — замыкаў мужык на ўвесь пакой.

Пан аж за галаву хапіўся.

— Ну, бачыш,— кажа ён прыезджаму пану,— ён і з мяне жартуе! Што мне з ім рабіць?

— Даць розаг! — раіць пан-госць.

— Гэй, цівун, даць мужыку розаг! — загадаў пан.

Прынёс цівун пук розаг. Мужык узяў розгі ў цівуна з рук і пакланіўся панам:

— Дзякуй вам, паночкі, за розгі: яны мне ў гаспадарцы спатрэбяцца.

Паны так і аслупянелі — не маглі нічога адказаць мужыку. А той узяў розгі пад паху ды шусь за парог.

---

[1] З а м ы́ к а й *(польск.)* — зачыняй, замыка́й.





## ПАНУ НАВУКА

Ну, дык слухайце! Скажу вам не казку, а праўду.

Было гэта яшчэ за панамі. А ліхія ж былі паны! Не людзі, а звяр'ё. Трапіш да такога пана, то хоць кладзіся ды памірай: нічым яму не дагодзіш. Кажуць жа: зачыні чорту дзверы, дык ён у акно ўлезе. Гэтак і пан. Ты яму выстранчаеш, шчыра робіш, а ён усё крычыць: «Не так, шэльма, не так, галган[1], не так, пся крэў[2]!» І есць цябе поедам, здзекуецца, зневажае. А чуць што не ўнаровіш — жыўцом скуру зніме.

Ой цяжка, вельмі цяжка было жыць за панамі!

Дык вось. Быў у адным маёнтку такі ліхі пан. Чаго ён толькі не вытвараў! Як толькі не здзека-

---

[1] Галган — абразлівая клічка: абадранец, жабрак.
[2] Пся крэў — сабачая кроў.

ваўся з людзей! Не аднаго насмерць засек. Прыгонных сваіх і за людзей не лічыў.

Загадаў аднойчы паганы пан, каб усе, хто мае валоў на продаж, прыводзілі іх толькі ў яго маёнтак. Паставіў па канцах сяла варту і не дазваляў праехаць туды ніводнаму купцу. Прывядзе хто вала ў маёнтак на продаж, а пан паглядзіць і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл!

І заплаціць, як за казла. А хто пярэчыць уздумае — пашле на стайню ды ўсыпле розаг.

Доўга мучыліся людзі з такім паганым панам, доўга цярпелі — бо што зробіш, каму паскардзішся? Паны ж тады ўсюды сядзелі — і ў маёнтках і ў судах.

Ды знайшоўся нарэшце адзін чалавек, што адплаціў пану за ўсе людскія слёзы і крыўды.

Гэта быў здатны і ўдалы дзяцюк. Звалі яго Рымша. Рана ён асірацеў, але і адзін неяк такі ўзбіўся на гаспадарку. Горды быў хлапец Рымша. Ніхто не адважваўся яго і пальцам крануць.

Прывёў Рымша ў маёнтак вала прадаваць. Выйшаў пан на ганак і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл!

Глянуў Рымша, што нікога блізка няма, паказаў пану паплiску[1] ды пытаецца:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прывёў табе вала, а не казла!

І давай дубасіць пана паплiскаю. Біў, біў, пакуль рука не забалела.

— Вось табе,— кажа,— за тое, што з людзей здзекуешся! Калі вычухаеш, чакай мяне ў госці.

---

[1] П а п л і с к а — паплецiна, лазiна.

Сказаў гэта Рымша, кінуў вала і ўцёк у лес.

Знайшлі дваровыя людзі пана без памяці — так змясіў яго Рымша. Толькі на трэці дзень апрытомнеў пан.

— Злавіць мне Рымшу! — загадаў ён слугам.

Ды дзе там! Таго і след ветрам замяло. Лясы даўней былі цёмныя, густыя. Жыві ў іх колькі хочаш, ніхто цябе і не ўбачыць.

Мінае дзень за днём, а пан ніяк ачуняць не можа. Якіх толькі дактароў не клікалі — ніхто рады не дасць: мусіць, яму Рымша добра такі адсадзіў пячонкі.

Тым часам прыехаў у маёнтак новы доктар з поўным сундуком усялякіх лекаў. Паклікаў пан да сябе новага доктара, частуе і просіць, каб палячыў яго.

— Добра,— кажа доктар,— я пана вылечу. Трэба толькі нацяпліць лазню.

Нацяплілі слугі лазню. Павёў доктар пана ў лазню, пасадзіў на палок ды загадаў трымацца аберуч за жэрдку. А сам пачаў націраць яго ўсялякімі мазямі.

Сядзіць пан, трымаецца за жэрдку ды толькі крэхча.

Але нядоўга ён крахтаў. Дастаў неўзабаве доктар з кішэні сырамятны пасак, прывязаў ім да жэрдкі панавы рукі і заткнуў яму вехцем рот. Пасля ўзяў папліску і кажа:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла...

Бачыць пан, што гэта Рымша, а не доктар, хоча крычаць, ды не можа — вехаць у горле!

Круціцца пан, як уюн на гарачай патэльні, а Рымша лупіць яго папліскаю па чым папала. Траха не ўсю скуру садраў з пана. Потым сеў на каня і паехаў. Толькі яго і бачылі.

Доўга хварэў пан. Усе думалі, што капцы ўжо яму. Ды ліхога і смерць не бярэ: пад вясну акрыяў пан і надумаўся за граніцу, на воды, ехаць. Пачаў збірацца, а тут якраз грошай не хапае. Парашыў ён прадаць лес. Пусціў пагалоску, і пачалі прыязджаць купцы аглядаць лес. Таргаваліся, таргаваліся, ды ніяк не могуць у цане сысціся: пан, бач, скупы быў і надта даражыўся.

Аднаго дня прыехаў у маёнтак нейкі вельмі ж багаты з выгляду купец. Павёў яго пан аглядаць лес. Пан хваліць лес, хоча даражэй з купца злупіць, а купец усё падтаквае яму ды адводзіць далей у гушчарнік. Забраліся яны ў такую нетру, што і свету не відаць. Тут купец давай рукамі хвоі абнімаць, сажнем таўшчыню мераць. Абхапіў і пан адну хваіну.

— Вось,— кажа,— глядзі, якая калодзішча! Золата, а не лес.

А купец выхапіў з кішэні пасак ды прывязаў пана да хвоі. Потым дастаў з-пад крыса́ паплiску, паказаў пану і пытаецца:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла!

І пачаў пярэсціць пана...

Біў, біў колькі ўлезла, ды так і пакінуў прывязаным да хвоі. Увесь дзень прастаяў пан каля дрэва, пакуль не знайшлі яго дваровыя людзі.

Можа, з год пасля таго пракачаўся пан, а ўсё няма ачунку.

Зноў раяць яму дактары ехаць на воды. Прадаў пан лес, збожжа, жывёлу. Набраў шмат грошай і сабраўся ехаць за граніцу, на воды. А Рымша ўсё цікуе за панам. Даведаўся ён, па якой дарозе будзе ехаць пан, і зрабіў на яго пастку: паставіў у лесе за ганок трое адзін ад аднаго двух конных хлапцоў з паплiскамі.



Пад'ехаў пан да першага хлапца, а той здалёк патрос паплёскаю і крычыць:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза?

— Хапай, хапай яго! — крычыць пан на фурмана.—Гэта ж Рымша!

Фурман шась нажом па пастронках, сеў на прыпражнога каня і пагнаўся за хлапцом.

Як толькі ён знік з вачэй, да панскага воза пад'ехаў другі такі ж хлапец. Замахнуўся паплёскаю і кажа:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза?

— Хапай, хапай яго, галгана! — закрычаў пан на лёкая.— Гэта ж Рымша!

Ускочыў лёкай на другога каня і памчаўся за хлапцом. Застаўся пан адзін у карэце. Тут ні адсюль ні адтуль перад ім апынуўся сам Рымша. Дастаў ён з-пад крыса паплёску, патрос ёю і пытаецца:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла!

Збіў Рымша пана на горкі яблык, забраў грошы і пайшоў у лес, у сваю зямлянку.

Шмат дабра потым рабіў Рымша бедным людзям: і грашыма памагаў, і ад ліхіх паноў бараніў.

Яшчэ і да гэтага часу ў цёмным лесе паміж Заполлем і Навасёлкамі[1] стаіць гара. Завуць яе Рымшаваю гарою. Кажуць, там і жыў той горды і смелы дзяцюк Рымша.

---

[1] На Мазыршчыне.



## ДВА КАМЕНІ

Ляжаў пры дарозе вялікі камень. Хто ні ідзе, спыніцца каля яго, пасядзіць, адпачне, а то і падсілкуецца трохі. Людзі з усяе акругі ведалі той камень і шанавалі яго.

Пабудаваў у тых мясцінах адзін чалавек новы млын. Але не было ў яго камянёў для жорнаў. Паехаў ён у горад, купіў там верхні жарнавы камень і вязе яго на валах дахаты. Убачыў жарнавік свайго таварыша пры дарозе і заганарыўся.

— Вось бачыш, які я пан! Мяне на валах возяць, а ты нікому не патрэбен. Валяешся тут, як ламачына. Прэч з дарогі, бо расцісну, як порхаўку!

Тут на валоў напалі авадні ды сляпні. Закруцілі валы хвастамі ды як скокнулі ўбок... Зачапіўся воз за камень, што ляжаў пры дарозе, вось зламалася, і ганарысты жарнавік паляцеў далоў.

Ды так рэзнуўся аб прыдарожны камень, што аж усярэдзіне ў яго нешта трэснула.

Ляжыць жарнавік і траха са злосці не лопаецца, што давялося апынуцца побач з такім брыдкім каменем.

Тым часам млынар пачаў прыглядацца да прыдарожнага каменя. «Ці не зрабіць мне з яго споднік для жорнаў?» — думае.

Паклікаў ён майстра. Агледзеў майстар камень ды выкаваў з яго споднік для млынавых жорнаў.

Прывёз млынар абодва камені і зрабіў з іх жорны: камень, што валяўся пры дарозе, палажыў пад спод, а куплены — наверх.

Меле сподні камень муку ды толькі радуецца, што цяпер ён яшчэ лепш служыць людзям. А верхні камень аж скрыгоча ад злосці, фанабэрыцца перад таварышам:

— Куды табе да мяне! Я калі захачу, дык задушу цябе! Не ты, а я мялю муку!

Пры гэтым ён так закруціўся, так зашумеў, што аж распаўся на кавалкі.

Пабедаваў млынар ды выкінуў тыя кавалкі ў гразь як непатрэбныя.

Купіў млынар новы жарнавік, доўга малоў ім, але і той зламаўся.

А сподні камень трапіўся такі моцны ды ўдалы, што і да гэтага часу меле.



## СЛЯПЫ, ГЛУХІ І БЯЗНОГІ

Жылі ў адной вёсцы сляпы, глухі і бязногі.

Пачалася ў тым краі вайна. Людзі пабралі сваё дабро ды падаліся ў лес ад вайны хавацца.

Сляпы чуе, што статак рыкае на вуліцы, калёсы грукацяць на грэблі, людзі крычаць ды некуды бягуць, але нічога не бачыць, што робіцца.

Глухі сядзіць на загуменні ў халадку пад ліпаю і пляце лапці. Ён бачыць, што за вёскаю падняўся пыл ад калёс, людзі кудысьці спяшаюцца, але нічога не ведае, што робіцца.

Бязногі ўсё бачыць і чуе, ды сам зрушыцца з месца не можа: сядзіць на прызбе, мух адганяе.

Тым часам уварваліся ў вёску ворагі. Ператрэслі ўсё, забралі хлеб і што з дабра засталося, падпалілі хаты ды пайшлі далей.

Гарыць вёска, як сухая салома, і няма каму яе ратаваць.

Сляпы куды ні сунецца, усё на агонь натыкаецца. Пачаў ён крычаць, на дапамогу клікаць. Пачуў яго бязногі. Але і самому яму няма ратунку ад агню.

Скаціўся бязногі з прызбы ды папоўз на руках на загуменне. Убачыў там глухога. Пачаў яму тлумачыць, што трэба сляпога ратаваць. Ды глухі не разумее, што бязногі ад яго хоча. Узлез тады бязногі глухому на плечы і паказвае, куды яму ісці. Дайшлі яны гэтак да сляпога. Узяў глухі сляпога за руку і вывеў з агню.

Згарэла вёска ўшчэнт: ні кала ні двара не засталося.

Пачалі сляпы, глухі і бязногі раіцца, як ім далей жыць. І парашылі больш не пакідаць адзін аднаго ў бядзе, а рабіць усё згодна, як адзін чалавек.

Пайшоў глухі на загуменне, знайшоў там старую каламажку. Сеў бязногі ў каламажку, а сляпы і глухі ўзяліся за аглоблі.

Сляпы і глухі вязуць каламажку, а бязногі сядзіць і кіруе. І едуць яны як мае быць: дзе яма, там пакажа глухі, дзе выюць галодныя ваўкі, там перасцеражэ сляпы, бо слых у сляпога самы чуткі, а дзе трэба ў сустрэчнага запытацца дарогі, там паможа бязногі.

Пад'ехалі яны гэтак да адной уцалелай вёскі. А ў ёй ні жывой душы. Бязногі застаўся сядзець у каламажцы, а сляпы і глухі пабраліся за рукі і пайшлі шукаць якой-небудзь спажывы.

Чуе сляпы — цурчыць недалёка вада. Штурхнуў ён глухога пад бок, той пагледзеў навокал і ўбачыў крыніцу пад вярбою. Напіліся яны вады, набралі ў запас і пайшлі далей.

Бачыць глухі — кружацца каля аднаго двара вароны і сарокі. Пайшоў ён туды з таварышам,

паглядзеў, а там поўна сыроў у клеці! Забралі яны сыры і рушылі назад.

Чуе па дарозе сляпы — пішчаць дзесьці парасяты. Паштурхаў ён глухога, той азірнуўся і ўбачыў на адным двары парасят.

Гэтак знайшлі яны ўсё, што ім трэба, ды засталіся жыць у той вёсцы, пакуль не вернуцца людзі. Удзень на сонейку грэюцца, а ўночы залезуць у гумно ў салому ды спяць спакойна.

Сляпы не бачыць, затое добра чуе, і ніхто блізка да іх не падкрадзецца. Глухі не чуе, затое бачыць, як арол. Заўважаць яны якую небяспеку, схопяць бязногага ды ў схованку.

Так пражылі сляпы, глухі і бязногі, пакуль не скончылася вайна. Вярнуліся людзі ў вёску, знайшлі іх і дзівяцца:

— Як гэта вы, калекамі будучы, пражылі такі ліхі час?

— Бо мы былі між сабою ў згодзе, як адзін чалавек, дык і пражылі,— адказалі сляпы, глухі і бязногі.





## НЕ СІЛА, А СМЕЛАСЦЬ

Жыла ў адной вёсцы дзяўчына Марыля. Маленькая ўдалася ростам, дык усе яе не Марыляй звалі, а Марылькай. І сілу яна мела, як у таго камара.

Жартуюць з яе сяброўкі. «На цябе,— кажуць,— хлопец як дзьмухне, дык ты і паляціш, як пух!»

Ды затое была Марылька такая смелая, што і хлопец другі не дакажа. Бывала, убачыць, што большы крыўдзіць меншага,— як ястраб налятае на крыўдзіцеля, і той адступае перад ёю.

Пачалі аднаго разу сяброўкі жартаваць з Марылькі:

— Ды ты не такая і смелая, як думаеш. Схадзі вось уночы на могілкі, тады паверым.

— І схаджу! — адказвае Марылька.

— Нябось убачыш там пень, дык душа ў пяткі схаваецца...

— А вось жа, на злосць вам, пайду! — кажа Марылька.

Настала ноч. Марылька пакінула сябровак на вуліцы, а сама пабегла на могілкі.

Бяжыць і не азіраецца. Каля могілак супынілася ды пайшла ціха. А каб не было страшна, заспявала песню. Ходзіць так па могілках ды спявае — няхай чуюць сяброўкі, што яна тут!

Здарылася якраз, што ў тую ноч зладзеі абакралі аднаго багатага гаспадара і везлі яго дабро каля могілак у свой лес. Пачулі яны песню, напужаліся, кінулі воз ды пабеглі хавацца, хто куды.

Падышла Марылька да воза, паклікала — ніхто не адгукаецца. Агледзела воз, а там усялякага дабра поўна. Здагадалася яна, што гэта зладзейская работа, бо ад зладзеяў у іх аколіцы шмат хто бяду меў. Ніхто не ведаў, адкуль яны прыходзяць і куды крадзенае возяць.

Села Марылька на воз ды пагнала каня ў вёску.

Убачылі зладзеі, што тут усяго толькі адна малая дзяўчынка, кінуліся за ёю, але так і не дагналі.

Вярнула смелая Марылька гаспадару каня і ўсё дабро. Зарадаваўся гаспадар і даў ёй за гэта вялікія грошы. Купіла яна за тыя грошы сабе новую суkенку, чаравікі, прыхарашылася так, што ўсе сяброўкі зайздросцяць ёй.

А зладзеі ніяк не могуць сабе дараваць, што такая малая дзяўчынка паразганяла іх, як зайцоў. Ды і накрадзенага дабра шкада ім. Вось і надумаліся яны завабіць смялячку ў свой лес і адпомсціць ёй.

Прыехаў да Марылькі праз колькі дзён адзін з тых зладзеяў у сваты. Марылька кажа яму:

— Ты чалавек мне не знаёмы, я раней хачу паглядзець, дзе ты жывеш і як жывеш.

Злодзей, вядома, і рад: сама трапіць у іх рукі! Расказаў ён ёй, дзе яго шукаць, і паехаў.

Сабралася Марылька ў розведы да жаніха. Маці пачала яе адгаворваць, не пускаць. Ды дзе там — нічога не зробіш з упартаю дачкою! Запрэгла яна сваю кабылку, села і паехала.

Даехала да лесу, бачыць — збоку паваротка, а каля яе на кусце заламана галінка. Яна і завярнула на гэтую паваротку. Праехала крыху, а там новая паваротка і зноў галінка заламана.

Ехала яна, ехала, даехала да нейкага балотца. А за ім пайшоў лес такі густы, што і носа не ўбіць. І ніякай дарожкі нідзе няма. Прывязала яна да бярэзіны кабылку, а сама пайшла ў гушчар. Пралезла мо з ганкі і ўбачыла прасвет, а на ім хатку. Падкралася да хаткі, глядзіць праз акенца, аж там зладзеі дзеляць накрадзенае дабро. Лаюцца, крычаць, ледзь не з нажамі адзін на аднаго кідаюцца. Прыгледзелася Марылька і пазнала сярод іх таго, хто да яе ў сваты прыязджаў... Стаіць ён, размахвае вялізным нажом, разнімае другіх. «Відаць, гэта сам атаман разбойнікаў»,— думае Марылька.

Завярнулася яна ды пайшла хутчэй да кабылкі.

Плішчылася яна, плішчылася праз гушчэчу, усё адзенне на сабе парвала і заблудзілася. Туды-сюды кідаецца — няма кабылкі! Раптам перагарадзілі ёй дарогу два ваўкі... Стаяць ды зубамі ляскаюць. «Ну,— думае Марылька,— з'елі яны маю кабылку». Узяла яе злосць на ваўкоў, схапіла яна патарчаку і з крыкам кінулася на іх. Спалохаліся ваўкі смелай дзяўчыны, падцялі хвасты ды падаліся ў гушчар.

Прабіраецца Марылька далей. Вось ужо і сонейка зайшло, птушкі сціхлі, толькі пугач крычыць сваё «пу-гу!» ды сава падлятае да яе на сваіх мяккіх крылах, чуць не на галаву садзіцца. А як адляціць ды пачне выгукваць ды плакаць, бы малое дзіця, дык аж пошчак ідзе па лесе.

Выбралася гэтак Марылька на нейкую дарожку, бачыць — едзе на яе кабылцы якісьці чалавек. Прыгледзелася, аж гэта іх сусед, стары Ахрэм. Хадзіў ён па лесе з сякераю, шукаў якой патрэбнай дзеравякі ды натрапіў на прывязаную кабылку. Пагукаў — няма гаспадара. «Мабыць, яе зладзеі ўкралі ды схавалі тут»,— падумаў Ахрэм. Адвязаў ён кабылку, сеў у драбінкі ды і падаўся дахаты.

Пачуў Ахрэм голас, азірнуўся: гоніцца за ім нейкая не то русалка, не то ведзьма: косы распушчаны, адзенне на кавалкі пашматана... Давай ён кабылку паганяць, ад бяды ўцякаць.

А русалка ўсё бяжыць за ім і нават па імені кліча...

Бачыць Ахрэм, што не ўцячы яму на кабылцы ад гэтай мары́[1]. Саскочыў ён з воза, схапіў сваю сякеру ды так паджгаў, што толькі пяты замільгалі.

Прыехала Марылька дахаты і расказала ўсім, дзе зладзеі жывуць. Сабраліся хлопцы, зрабілі ў лесе аблаву і палавілі іх.

Зажылі з таго часу людзі ў той аколіцы ціха ды мірна.

Праўду бо кажуць: бярэ не сіла, а смеласць.

---

[1] Мара́ — здань.



## ПАН І КАЗАЧНІК

Адзін багаты пан вельмі любіў слухаць казкі. Бывала, хто яму што ні нахлусіць — ён з усім згаджаецца.

Захацелася таму пану паслухаць хоць адну казку, якой бы ён не паверыў. Абвясціў ён усюды: «Хто раскажа мне такую казку, каб я сказаў: «Ілжэш», таму дам талерку золата».

Знайшоўся адзін такі казачнік. Звалі яго Янка. Прыйшоў ён да пана:

— Стаў, пане, талерку золата, буду казку казаць!

Паставіў пан на падлозе талерку золата, а сам рассеўся ў крэсле і закурыў люльку з доўгім цыбуком.

— Ну, кажы. Толькі глядзі, каб замест золата розаг не дастаў...

Прысеў Янка на кукішках перед талеркай і пачаў казаць:

— Чаго, панок, на свеце не бывае. Вось якая аднойчы са мною прыгода трапілася. Было гэта тады, калі мой бацька яшчэ і на свет не нарадзіўся. Жыў я з дзедам. Рабіць дома няма чаго, дык дзед аддаў мяне да аднаго гаспадара пчол пасвіць. А было ў таго гаспадара аж пяцьдзесят раёў пчол. Кожнага дня раніцай трэба ўсіх пчол пералічыць ды на пашу гнаць. А ўвечары прыгнаць, зноў пералічыць, падаіць і ў вуллі пазаганяць. Бо гаспадар мне цвёрда сказаў: «Калі хоць адну пчалу згубіш, то не заплачу табе за цэлы год». Вось якая гэта нялёгкая работа была!

— Усё можа быць,— згаджаецца пан.

Зірнуў Янка на талерку золата ды кажа далей:

— Аднаго разу прыгнаў я пчол з пашы, пералічыў: няма адной пчалы... Бацейкі! Бяда будзе! Я бягом назад — пчалу шукаць. А ўжо і змяркацца пачало. Пабегаў туды-сюды — няма пчалы. Аж раптам чую: недзе пчала раве. Я туды. Гляджу, а там, за ракою, сем ваўкоў апанавалі маю пчалу. Яна ж, небарака, адбіваецца ад іх з усяе сілы, не здаецца ваўкам. Кінуўся я пчале на дапамогу. Прыбег да ракі — перавозу няма. Што рабіць? А тут вось-вось ваўкі пчалу разарвуць. Я гэта, доўга не думаючы, схапіў сябе за чуб, разгайдаўся ды — гоп цераз раку! Але не даляцеў да другога берага — плюхнуўся проста пасярод ракі. І як камень пайшоў на дно. Ачухаўся сяк-так, пачаў дарогу шукаць, каб наверх выйсці. А тут, як на ліха, на дне ракі нехта агню наклаў ды такога курадыму нарабіў, што дым вочы выядае, нават рыба чмыхае насамі. І дарогі з-за курадыму не відаць. Іду гэта я вобмацкам, аж бачу: мядзведзь стаіць. Хацеў я ўхапіць яго за хвост, ды ён да мяне галавою па-

вярнуўся. Я гэта засунуў яму руку ў горла, дабраўся да хваста і ўхапіўся за яго. Мядзведзь напужаўся ды як ірванецца наверх — так і выцягнуў мяне. Сам пабег з перапуду ў лес, а я застаўся на беразе, ды не на тым, што трэба. Тут я зноў ухапіў сябе за чуб, разгайдаўся яшчэ мацней, чым першы раз, і — гоп на другі бераг!

— Свет вялік,— кажа пан,— можа, і праўда.

— Праўда-то праўда, пане, хоць і шчарбатая. Ну, дык вось. Пераскочыў я на другі бераг, але з разгону як грымнуўся аб зямлю, дык па пояс і ўвяз. Я і туды, і сюды — не вылезці. Без рыдлёўкі, думаю, нічога не зробіш. Пабег дадому, схапіў рыдлёўку ды назад. Адкапаў сябе ды бягу пчале на дапамогу. Прыбег, адагнаў ваўкоў, а пчала ўжо і ногі выпруціла: задушылі яе ваўкі, пакуль я бегаў туды-сюды. Што ж рабіць? Накрыў я пчалу галінкаю, каб ваўкі не з'елі, а сам пайшоў да гаспадара. «Бяда,— кажу,— здарылася».— «Што за бяда?» — пытаецца гаспадар. «Ваўкі пчалу задушылі...» Як узлуецца гаспадар, як затупае на мяне: «Цяпер табе за год работы ні гроша не дам!» Маўчу я. Вінаваты. Гаспадар пазлаваўся ды пытаецца: «А ваўкі яшчэ не з'елі пчалу?» — «Не»,— кажу. «Ну то добра, што хоць пчала цэлая. Паедзем забяром». Запрэглі мы дзве пары валоў — паехалі. На лузе абялілі пчалу, пасеклі на кавалкі ды прывезлі мяса дамоў. Дома пасалілі — аж дванаццаць кадушак насалілі! Цэлы год тое мяса з гаспадаром елі.

— Свет вялік,— кажа пан,— можа, і праўда.

— Ну, а як скончыўся год, гаспадар выгнаў мяне і ні гроша не даў. Толькі выпрасіў я ў яго кавалак воску. Зляпіў я з воску кабылку, сеў і паехаў да дзеда, бо бацькі ў мяне ўсё яшчэ не было. Еду, еду — прыехаў у лес. А тут і есці за-

хацелася. Панюхаў носам — чую: на хвойцы печаным пахне. Пад'ехаў я да хвойкі, аж там, у дупле, печаныя дзятлы пішчаць. Ну, голад не цётка. Палез я ў дупло па дзятлаў. Лезу рукою — не ўлез, лезу нагою — не ўлез, лезу галавою — не ўлез, кінуўся ўсім тулавам — улез. Наеўся дзятлаў колькі хацеў, ды назад. Лезу рукою — не вылез, лезу нагою — не вылез, лезу галавою — не вылез, усім тулавам кінуўся — таксама не вылез. Успомніў я, што ў гаспадара за лаваю сякерка тарчыць. Пабег, узяў сякерку, прасек у дупле большую дзірку і вылез.

— Свет вялік,— кажа пан,— можа, і праўда.

— Вылез я, сеў на кабылку, сякерку за пояс заткнуў і далей еду. А сякерка цюк ды цюк, цюк ды цюк... Раптам кабылка стала і ні з месца. Азірнуўся я — палавіны кабылкі няма: адсекла яе сякерка! Бадай цябе ліха! Выразаў я ракітавы дубец, сшыў кабылку ды зноў еду. А ракіта як расці ды расці — вырасла да неба. Ну, думаю, палезу на неба, пагляджу, што там робіцца.

Пан перастаў пыхкаць люлькай:

— І што ж ты там бачыў на небе?

— Шмат чаго, пане, бачыў. Іду гэта па небе, аж у адной хаце святыя вечарынку спраўляюць: п'юць, гуляюць, вясёлыя песні спяваюць. Хацелася мне зайсці да іх, але ж не, думаю: з п'янымі лепш не чапайся, а то яшчэ грымакоў надаюць. Іду далей. У другой хаце святы Мікола храпе пад сталом як пшаніцу прадаўшы. Відаць, добра гарэлкі нажлукціўся.

— Свет вялік, можа, і праўда,— кажа пан.

— Дзіва што праўда! Я ж на свае вочы бачыў. Заглянуў я да Міколы, думаў, можа, пажывлюся чым. Ды дзе там! Бутэлькі на стале пустыя, хлеба ні крошкі. Пакруціўся я, бачу: валяецца

каля гаспадара залатая шапка. Вазьму, думаю, хоць Міколаву шапку. Зайду дзе па дарозе ў карчму, мяне за яе і накормяць. Узяў шапку ды назад. Тым часам Мікола прачнуўся, пачаў шукаць шапку. А яе няма. Нарабіў ён крыку, зыку... Трэба дадому ўцякаць, думаю, бо як зловяць — бяды не мінеш. А тут ніяк не знайду таго месца, дзе ракіта на кабылцы расце. Я і туды, і сюды — няма ракіты. Аж бачу: у гумне святыя грэчку веюць, мякіна так і рассыпаецца па ўсім небе. Я гэта давай яе лавіць ды вяроўку віць. Зві́ў, прывязаў адным канцом да неба і пачаў спускацца на зямлю. Спусціўся да канца вяроўкі, а зямлі ўсё не відаць. Вішу між небам і зямлёю. Добра яшчэ, што пры мне сякерка была. Я гэта адсяку канец вяроўкі, знізу падтачу ды спускаюся далей.

— Свет вялік,— кажа пан,— можа, і праўда.

— Тачыў гэтак, тачыў ды не агледзеўся, як прамінуў зямлю і апынуўся ў пекле. Іду гэта я па пекле, разглядаю, як там і што. Аж бачу... панаў бацька-нябожчык — худы, босы, абшарпаны — свіней пасе.

Пан вылупіў вочы, люлька выпала з зубоў.

— Ілжэш, хаме! — закрычаў ён.— Не можа таго быць, каб мой бацька свіней пасвіў!

А Янка цап за талерку з золатам ды за дзверы!



## ЯК КСЯНДЗЫ ВЫЛЕЧЫЛІСЯ

Жылі-былі тры ксяндзы.

Растаўсцелі яны так, што бяда. Што ні рабілі, якіх лекаў ні ўжывалі — нічога не памагае.

Параілі ім дактары на воды ехаць: можа, кажуць, вада з вас лішняе сала выцягне...

Пайшлі ксяндзы па людзях грошы збіраць на дарогу. Зайшлі да аднаго чалавека. Звалі таго чалавека Адась. Усё жыццё рабіў ён у панскім бровары і надта быў здатны на ўсялякія выдумкі.

Выслухаў Адась тоўстых ксяндзоў, падумаў крыху, а потым і кажа:

— Навошта вам, паны ксяндзы, самім па людзях хадзіць. Пажывіце ў мяне трохі, а я за вас зраблю гэтую работу.

— Добра,— кажуць ксяндзы.— Для нас гэта яшчэ лепш, бо нам самім цяжка хадзіць.

Пачаў Адась ксяндзоў частаваць.

П'юць ксяндзы, хваляць гаспадара: вось жа

які чалавек знайшоўся — нічога для божых служкаў не шкадуе!

Напіліся дармовай гарэлкі і захраплі на ўсю хату.

Пакінуў іх гаспадар, а сам пайшоў да сваіх сяброў — броварскіх рабочых.

— Так і так,— кажа,— памажыце, хлопцы, тоўстых ксяндзоў вылечыць...

— Гэта мы можам,— адказваюць сябры.— Чым мы не дактары?

Прыйшлі яны да Адася, пераадзелі п'яных сонных ксяндзоў у рабочую вопратку і ўвечары перанеслі іх у панскі бровар.

Назаўтра прачухаліся ксяндзы. Глядзяць — дзе ж гэта яны? Паглядзелі адзін на аднаго і яшчэ больш дзіву даліся — замест сутанаў на іх парваныя сялянскія світкі, на нагах стаптаныя апоркі... Усё такое ж, як у рабочых панскага бровара! Але нядоўга дзівіліся ксяндзы. Падышоў да іх панскі прыганяты ды як крыкне:

— Вы чаго тут паразлягаліся? Марш бульбу насіць у катлы!

Прыганяты падумаў, што гэта пан новых рабочых наняў, а тыя прыйшлі сюды адлежвацца, а не работу рабіць.

Хацелі ксяндзы заспрачацца з прыганятым, ды той і гаварыць не даўся, а пачаў свянціць іх бізуном.

Ксяндзы заенчылі:

— Мы не рабочыя, а ксяндзы!

— Э, дык вы яшчэ і жартаваць з мяне ўздумалі!

І прыганяты зноў пачаў лупіць іх, яшчэ мацней.

Круціліся, круціліся ксяндзы, бачаць — рады няма.

— Пойдзем, пойдзем,— кажуць,— на работу.

— Вось так бы адразу і гаварылі! — супакоіўся прыганяты.— А то выдумалі — ксяндзы! Я вас наксенджу!

Падумалі ксяндзы: «А і праўда: можа, гэта ім толькі прыснілася, што яны былі ксяндзамі?»

Пайшлі яны бульбу насіць. Узваляць ім рабочыя на плечы па мяшку — тыя крэхчуць, а нясуць, толькі касавурацца на прыганятага з бізуном. Да паўдня цэлы капец бульбы перанасілі: дужыя былі ксяндзы!

Пасля абеду даў ім прыганяты новую работу — дровы пілаваць. А дровы трапіліся дубовыя, сукаватыя. Пілуюць ксяндзы і ўсё на сонца паглядваюць: ці скора вечар? Дачакаліся сяк-так вечара і, не еўшы, тут жа каля цёплага катла паснулі як забітыя.

Назаўтра ўсхапіліся, паелі трохі бульбы разам з рабочымі ды за пілу: баяцца, каб зноў прыганяты не адлупцаваў.

Робяць ксяндзы ў бровары разам з усімі што трэба, разам ядуць, разам спяць.

Мінуў тыдзень-другі, пачало з ксяндзоў сала спадаць, а праз месяц вырабіліся яны, як тыя харты. Паглядзяць адзін на аднаго і пазнаць не могуць — так схуднелі. «Мусіць,— думаюць,— гэта нас чэрці ўхапілі ды засадзілі ў бровар на пакуту».

Вось аднаго разу, моцна напрацаваўшыся, ксяндзы заснулі без памяці. Узялі тады іх рабочыя, перанеслі да Адася ў хату, знялі брудную вопратку ды палажылі ксяндзоўскую.

Прахапіліся назаўтра ксяндзы позна і аж калоцяцца: баяцца, што работу праспалі... Пачалі хутчэй вопратку шукаць. Але бачаць: ляжаць

каля іх сапраўдныя ксяндзоўскія сутаны! Дзівяцца ксяндзы — вачам не верацъ.

Тут заходзіць да іх гаспадар са скаварадою яечні. Запахла яечня на ўсю хату — аж нос казыча.

— Уставайце, уставайце, панове ксяндзы,— кажа гаспадар.— Снедаць пара.

Адзеліся ксяндзы ды за стол. Ядуць і пераглядаюць моўчкі адзін на аднаго: відаць, зноў сон сніцца!

Паснедалі гэтак моўчкі ды збіраюцца дадому.

Адась кажа:

— Пачакайце, панове, я ж вам яшчэ грошай не сабраў на воды ехаць...

— Не, не,— замахалі рукамі ксяндзы,— не трэба нам водаў: мы ўжо вылечыліся...

І кулём адзін за адным кінуліся за дзверы.

Выскачылі ксяндзы на двор ды ходу кожны ў свой касцёл. І так шпарка памчаліся, што і на кані не дагоніш.



## КІСЕЛЬ

Ажаніўся адзін хлопец і ўзяў сабе жонку з далёкай вёскі. Пажыў ён трохі з маладою жонкаю ды паехаў у госці да цешчы.

Цешча прыняла зяця як трэба: напаіла і накарміла ўсякімі стравамі. А на закуску паставіла кісель з цукрам.

Зяцю ўсё спадабалася. А найбольш кісель. Ніколі такой стравы ён яшчэ не еў: у іх вёсцы ніхто кісялю не варыў.

— Што гэта, маці, за кулеш такі смачны ў цябе? — пытаецца зяць у цешчы.

— Гэта не кулеш, зяцёк, а кісель,— кажа.

— А ці ўмее ж мая Параска яго варыць?

— Дзіва што! Скажы ёй толькі — і яна наварыць.

Паехаў зяць дахаты, а каб не забыцца, як завецца гэты смачны кулеш, усё бубніў сабе пад нос: «Кісель, кісель...»

Па дарозе сустрэў чалавека. Той даў яму «добры дзень». Хлопец адказаў і адразу забыўся, як завецца кісель. Вярнуўся да цешчы.

— Забыўся,— кажа,— як зваць твой смачны кулеш...

— Кісель, зяцюхна, кісель.

— Дай мне яго, маці, лепш напаказ з сабою, а то я зноў забудуся.

Цешча ўзяла кубачак і наліла ў яго крыху кісялю. Узяў зяць той кубачак у правую руку і паехаў. Цяпер яму ўжо не было патрэбы бубніць сабе пад нос: кісель, кісель... «Вось,— думае зяць,— пакажу жонцы кубачак з гэтым куляшом, яна і здагадаецца, што трэба наварыць».

Тым часам едзе насустрач пан у брычцы. Убачыў яго хлопец і падняў па прывычцы руку, каб зняць шапку. А кісель з кубка — плюх! — і выліўся. Ды не ў воз, а за воз, у лужыну.

— А каб на цябе ліха, панок! — вылаяўся са злосці хлопец.— Праз цябе такую дарагую рэч упусціў...

Саскочыў ён з воза і давай боўтацца ў лужыне — кісель шукаць.

Пан спыніўся і пытаецца:

— Што ты, мужык, згубіў тут?

— Кажу ж табе: дужа дарагую рэч,— адказаў засмучаны хлопец.

Пан таксама злез з брычкі ды пачаў у лужыне плюхацца. «Калі знайду,— думае,— гэтую дарагую рэч, то трасцу аддам мужыку».

Плюхаліся яны, плюхаліся ў бруднай лужыне, але нічога не знайшлі.

Разагнуў пан спіну і кажа:

— А нех цябе д'яблы возьмуць! Змясілі толькі дарэмна гразь на кісель...

Тут хлопец як падскочыць:

— Дзякуй, паночку: кісель, кісель!

А сам хутчэй на воз ды па кані.

«Вар'ят нейкі»,— падумаў пан і паехаў сваёю дарогаю.

Прымчаўся хлопец дахаты і да жонкі:

— Умееш кісель варыць?

— Чаму ж не.

— То хутчэй вары, а то я зноў забудуся, як ён завецца.

 

## МУЖЫК І ЖОНКА

Адзін мужык часта сварыўся з жонкаю.

— Гультайка ты! — крычыць на яе.— Я і ару, і кашу, а ты нават абед лянуешся прынесці мне ў поле!

— Ды ў мяне дома работы больш, чым у цябе ў полі,— адказвае жонка.— Калі мне насіць табе абед?

Мужык не верыць жонцы:

— Якая дома работа! Такую работу я гуляючы зраблю.

Узлавалася аднойчы жонка.

— Калі так,— кажа,— то я паеду араць, а ты заставайся дома.

Мужык зарадаваўся:

— Добра. Цяпер ты ўбачыш, хто з нас праўду кажа! Араць — гэта не гаршкі ў печы перастаўляць.

Сабралася жонка ў поле і кажа мужыку:

— Толькі ж глядзі, каб усю работу парабіў.

Мужык кінуў вокам на хату:

— А якая тут работа?

— Бачыш, вунь рошчына ў дзяжы?

— Бачу,— адказвае мужык.

— Дык намялі мукі ў жорнах, замясі цеста, а як падыдзе, пасадзі хлеб у печ.

— Ну, гэта работа лёгкая,— махнуў мужык рукою.— Яшчэ якая?

— Збі масла.

— І гэта няцяжкая. Што яшчэ?

— Пільнуй цялят на выгане, каб у шкоду не ўлезлі. Абед звары ды за квактухаю наглядай, каб з рэшата не зляцела, бо яйкі астынуць.

Расказала жонка мужыку, што яму дома рабіць, сабралася і паехала ў поле. Мужык тупае па хаце, пасміхаецца сам сабе: «Я не толькі зраблю гэтую работу, а і выспацца паспею».

Закурыў ён люльку і пачаў муку малоць. А каб спарней работа ішла, прывязаў да пояса бойку са смятанай. Круціць жорны, а сам ківаецца, дык смятана — боўць, боўць! — на масла збіваецца. Добра ідзе работа!

Тут раптам суседскія дзеці як залямантуюць пад акном:

— Дзядзька, вашы цяляты ў шкоду залезлі!

— Ах, каб іх ваўкі з'елі! — закрычаў мужык і, як стаяў, кулём кінуўся на выган.

А бойка — трах, трах! — яго па каленях. Прабег ён крыху ды грымнуўся як сноп вобземлю. Накрыўка ў бойцы выскачыла, і ўся смятана вылілася.

Падняўся мужык, плюнуў са злосці і пабег далей. Выгнаў цялят з аўса і прыгнаў іх дамоў.

— Не хочаце,— кажа,— на выгане пасвіцца, дык стойце ў хляве галодныя!

Вярнуўся мужык у хату. Глядзіць, аж тут замест яго рабая свіння гаспадарыць: рассыпала муку, з'ела рошчыну і сагнала квактуху з рэшата.

Вытурыў мужык свінню вон, стаў пасярод хаты і чухае патыліцу: што ж цяпер рабіць? Трэба, думае, хоць яйкі ратаваць, бо як астынуць, дык і кураняты не выведуцца: бяда будзе ад жонкі... Пакруціўся сюды-туды — няма курыцы.

Сеў мужык з гора сам на рэшата. «Як вернецца квактуха,— думае,— тады я злезу абед варыць, а яе пасаджу».

Ехаў праз вёску казак і зайшоў у хату вады напіцца. Убачыў мужыка на рэшаце.

— Што ты робіш? — пытаецца.

— Куранят выседжваю,— адказвае мужык.

— Хто ж гэта цябе, небараку, пасадзіў на рэшата?

Расказаў мужык пра сваю бяду — як ён дома за гаспадыню застаўся і як не пашанцавала яму.

Парагатаў казак, а потым давай бізуном яго хвастаць... Лупіць і прыказвае:

— Вось табе за тваю дурноту! Жонка поле арэ, а ты што робіш?

Круціўся, круціўся мужык і падушыў усе яйкі. Бачыць — няма ратунку. Саскочыў з рэшата ды ходу. Залез з перапуду на гару і схаваўся там у кораб з пер'ем.

Казак напіўся вады ды паехаў далей. А мужык сядзіць у пер'і, ад страху калоціцца.

Тым часам прыехалі жончыны бацькі ў госці. Зайшлі ў хату. Паглядзела цешча на непарадкі і кажа да дзеда:

— Не дзіва, што зяць з нашаю дачкою сварыцца! Мусіць, такі і праўда, што яна гультайка.



— Калі так,— кажа дзед,— дык аддамо гасцінец не дачцэ, а зяцю!

Мужык усё гэта чуў з гары. «Які ж яны гасцінец прывезлі?» — узяла яго цікавасць.

Перагнуўся ён цераз кораб, каб паглядзець гасцінец, а кораб — бабух! — і паляцеў далоў разам з мужыком.

Пачулі дзед з бабаю грукат, выбеглі ў сенцы і ўбачылі там мужыка ў пер'і.

— Чорт! Чорт! — закрычалі яны ў адзін голас.

Баба пачала хрысціцца, а дзед схапіў качаргу ды давай чорта дубасіць:

— Бач, нячыстая сіла, куды панадзіўся цягацца!

Усхапіўся мужык і кінуўся на агарод. Схаваўся там у каноплях і сядзіць ні жывы ні мёртвы, пабітыя бакі чухае.

Вярнулася ўвечары з поля жонка. Бацькі кажуць ёй:

— Ну, цяпер ты з мужыком будзеш добра жыць.

— Чаму? — пытаецца дачка.

— Бо мы выгналі чорта з вашай хаты. Гэта ён, праклятый, сварыў вас!

І праўда: перастаў пасля таго мужык абзываць жонку гультайкай.





## ПОП І ДЗЯК

Жылі ў адным сяле поп і дзяк: абодва п'яніцы. Хочацца ім піць, ды няма за што.

Вось дзяк і кажа папу:

— Ёсць у цябе, бацюшка, святая кніга тоўстая; я красці буду, а ты па ёй варажыць, то і будзе нам за што выпіваць.

Украў дзяк у суседа вала, завёў у лес ды прывязаў да бярэзіны.

Забегаў сусед — шукае вала. А дзяк кажа яму:

— Ідзі, чалавеча, да бацюшкі: ёсць у яго такая кніга, па якой ён можа любога злодзея ўгадаць. А калі ўжо не ўгадае, хто ўкраў, дык угадае, дзе схаваў...

Прыбег сусед да папа, плюсь яму ў руку:

— Вычытай, бацюшка, у сваёй кнізе, хто майго вала ўкраў!

— А што мне будзе за гэта?

— Нічога не пашкадую!

— Дасі пяць рублёў і гарэлкі, то вычытаю.

— Дам. Вельмі ж добры вол быў!

— То нясі гарэлку, а грошы пасля, як вала знойдзем.

Прынёс сусед гарэлку. Селі поп з дзякам ды папіваюць сабе памаленьку. Выпілі, поп паглядзеў у кнігу, памармытаў сабе пад нос ды кажа:

— Есць твой вол! Жывы і здаровы.

— Няўжо? — зарадаваўся сусед.

— Ідзі ў лес, там ён: каля балотца стаіць, да бярэзіны прывязаны. Яго ўжо зладзеі хочуць далей весці, ды баяцца, што цяпер дзень: чакаюць ночы...

Пайшоў сусед у лес, знайшоў вала.

Прынёс ён папу грошы, дзякуе не надзякуецца. А поп з дзякам купілі гарэлкі, сядзяць, папіваюць.

Ну, цяпер так у іх і пайшло як па масле: калі грошай няма, а выпіць хочацца — ідзе дзяк на промысел: у каго карову ўкрадзе, у каго авечку... Поп, вядома, адразу ўгадае.

Вось аднаго разу фурман, лёкай і кухар укралі ў свайго пана шкатулку грошай.

Дачуўся пан, што поп усім добра ўгадвае, загадаў запрэгчы тройку коней у карэту ды ехаць па яго.

Прыязджае панскі аканом да папа. А той сядзіць п'яны, аж вочы пачырванелі ад гарэлкі. Аканом кажа:

— Прасіў пан, каб бацюшка прыехалі да нас у маёнтак.

Поп зараз прычасаў кудлы, апрануў расу, крыж пачапіў на шыю ды паехаў.

Пан пачаставаў папа як след, а потым і кажа:

— Я чуў, бацюшка, што ты памагаеш людзям

у няшчасці. Памажы і мне. У мяне шмат грошай укралі. Калі ты мне іх знойдзеш, я дам табе за гэта тысячу рублёў і два вазы пшаніцы.

Спужаўся поп.

— Цяпер, пане,— кажа,— не магу нічога сказаць. Кніга мая засталася дома. І хто ведае — можа, давядзецца і цэлую ноч сядзець ды вычытваць... Грошай жа ў пана многа ўкралі!..

А сам сабе думае: хутчэй бы ўцячы адсюль, бо дзяк не ўкраў, то і не вычытаеш...

Пан кажа:

— Добра. Заўтра я прышлю па цябе карэту. А зараз едзь дадому і вычытвай.

Вярнуўся поп дадому, паклікаў дзяка.

— Прапалі мы цяпер, дзяча, са сваёю кнігаю. Трэба ўцякаць з гэтага сяла на новае месца.

— А калі ж будзем уцякаць? — пытаецца дзяк.

— Ды вось пасядзім трохі, а пасля трэціх пеўняў і дамо драла. Бо пан як данясе архірэю, што мы людзей ашукваем,— пападзе нам абодвум.

— Добра,— кажа дзяк.— Ты зноў на новым месцы будзеш папом, а я — дзякам.

Сядзяць поп з дзякам, чакаюць трэціх пеўняў.

Тым часам фурман, лёкай і кухар напужаліся не на жарты — калі поп узяўся гадаць, хто грошы ўкраў, то напэўна выгадае. Не першы раз яму!

— Пойдзем,— кажа фурман,— паглядзім, што ён робіць: гадае ці не?

Як толькі паны паснулі, рушылі яны да папа. Зайшлі на двор; лёкай і кухар кажуць фурману:

— Падыдзі ты да акна адзін, паглядзі, а мы пачакаем.

Падышоў фурман да акна, бачыць — сядзяць

поп з дзякам, чакаюць. А тут якраз і папоў певень закукарэкаў. Поп кажа:

— Ну, дзяча, ужо ёсць адзін!

Фурман аж умлеў. Праўду бо кажуць, што на злодзеі шапка гарыць. Прыбег ён да таварышаў.

— Пазнаў,— шэпча,— мяне... Як толькі я падышоў да акна, ён і кажа: «Ужо ёсць адзін». Як у сук уляпіў, пракляты!

— Пайду і я паслухаю,— кажа лёкай.

Падышоў да акна, а певень:

— Ку-ка-рэ-ку!

Поп кажа:

— Ну, дзяча, ужо два!

Вярнуўся лёкай да таварышаў, калоціцца, слова вымавіць не можа.

— Пазнаў, кажа, заікаючыся,— і мяне...

Пайшоў да акна і кухар. А тут певень трэці раз:

— Ку-ка-рэ-ку!

Поп кажа:

— Ну, дзяча, дачакаліся: усе тры ёсць!

А дзяк ужо і не чуе нічога: зваліўся пад стол ды храпе.

Фурман, лёкай і кухар шусь тады ў хату да папа. Поп напалохаўся, думаў, гэта пан іх па яго прыслаў.

Яны ж адразу бух яму ў ногі:

— Бацюшка, не кажы пану, што мы грошы ўкралі! Мы дамо табе за гэта па трыццаць рублёў, толькі не кажы. Хто з нас богу не грэшны, цару не вінаваты!

Зарадаваўся поп, пытаецца:

— А дзе ж вы падзелі грошы?

— Закапалі, бацюшка, у стайні, каля другога стойла...

— А цэлыя грошы, нічога сабе не ўзялі?

— Цэлыя, бацюшка. Мы іх як укралі, дык адразу і закапалі.

— Добра,— кажа поп,— што з вамі рабіць: павінную галаву і меч не сячэ. Давайце па трыццаць рублёў...

Далі яны папу па трыццаць рублёў, плюснулі ў руку ды пабеглі назад у маёнтак вясёлыя.

Поп пачаў будзіць дзяка:

— Уставай, дзяча, будзем піць да самага дня. Знайшліся зладзеі.

Назаўтра поп яшчэ спіць, а пан прыслаў ужо тройку коней па яго.

Пабудзіў аканом папа. Той ахвотна сабраўся. Узяў сваю тоўстую кнігу ды паехаў.

Уваходзіць у пакой да пана, трасе перад ім кнігаю:

— Вычытаў, пане! Знайшлася панская шкатулка!

Пан пытаецца:

— Дзе ж яна, бацюшка?

— Дайце,— кажа поп,— мне двух работнікаў...

Даў яму пан двух работнікаў. Пайшоў поп з імі ў стайню, разгарнуў сваю кнігу, паглядзеў у яе ды кажа да работнікаў:

— Капайце вось тут, каля другога стойла.

Пачалі работнікі капаць і выкапалі панскую шкатулку з грашыма.

Аддаў поп пану грошы.

— Вось яны,— кажа.— Давайце мне цяпер за турбацыю, што дакляравалі.

Пачухаў пан патыліцу: пшаніцы-то не шкада, а тысячу рублёў не хочацца даваць. «Што тут зрабіць,— думае пан,— каб скруціць папу тысячу рублёў?»

Выйшаў ён на двор, бачыць — ляціць жук. Пан схапіў жука ў жменю, вярнуўся назад ды кажа папу:

— Калі ўгадаеш, бацюшка, што ў мяне ў руцэ, аддам табе ўсё дакляраванае ды яшчэ і прыбаўлю.

Поп так і аслупянеў ад неспадзяванай загадкі.

— Ото ж,— мармыча сам сабе,— папаўся, Жучку, у панскую ручку...

— Бач ты,— здзівіўся пан,— угадаў!

Пан і не ведаў, што поп меў прозвішча Жук.

Ну, рабіць няма чаго. Аддаў пан яму тысячу рублёў, два вазы пшаніцы і яшчэ воз прыбавіў.

Прыехаў поп дадому, паклікаў дзяка і кажа:

— Удалася, дзяча, нам і гэтая штука. Будзем цяпер гуляць ды панскую шкатулку ўспамінаць!

Выпілі поп з дзякам ды пачалі грошы дзяліць. Дзялілі, дзялілі — ніяк падзяліць не могуць.

Поп крычыць:

— Я старшы, мне дзве долі трэба ўзяць!

Дзяк крычыць:

— Ты старшы ў царкве, а не ў варажбе!

Узлаваўся поп ды — трах! — дзяка кадзілам. А дзяк папа — за валасы...

І такая ў іх калатня пайшла — на ўсю аколіцу лямантуюць.

Збегліся на крык людзі. Даведаліся, за што поп з дзякам б'юцца, і прагналі іх з сяла абодвух.



## ЯК ПАНА ВІНШАВАЛІ

Нарадзіўся ў пана сын.

Даведаўся пра гэта аканом. «Трэба,— думае,— павіншаваць пана».

Паклікаў ён старасту, лёкая і фурмана ды кажа ім:

— Пойдзем віншаваць пана з сынам. Я буду гаварыць першы, а ты, стараста, скажаш за мною: «З усім дварам», а ты, лёкай: «З дзецьмі і з жонкаю», а ты, фурман: «І з усім сваім набыткам». Зразумелі?

— Зразумелі!

Толькі ж, глядзіце, гаварыце шчыра, ад душы. Калі ўсё ўдала скажаце, дык пан узнагародзіць нас.

— Добра,— кажуць слугі.— Мы ад душы павіншуем пана. Бо хто ж яго больш любіць, як не мы!

А каб не ісці да пана ў такі дзень з пустымі

рукамі, аканом напакаваў рэшата яек і загадаў парабку несці.

Сабраліся так ды і пайшлі пана віншаваць: спераду парабак з рэшатам яек, за парабкам аканом, за аканомам — стараста, за старастам — лёкай, за лёкаем — фурман.

Падышлі да панскіх пакояў. Тут раптам у парабка развязалася абора ад лапця. Аканом наступіў на абору — парабак так і грымнуўся кулём цераз парог з рэшатам яек...

Як убачыў гэта аканом, забыўся на ўсё ды крыкнуў са злосці:

— Бадай ты прапаў!

Стараста недачуў, што сказаў аканом, і падхапіў шчыра, ад душы:

— З усім дваром!

Лёкай пакланіўся нізка і запеў салодкім голасам:

— З дзецьмі і з жонкаю!

А фурман грымнуў басам на ўсё горла:

— І з усім сваім набыткам!

Пан як пачуў такое віншаванне, дык у яго і вочы на лоб палезлі.



## ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ

Быў адзін дурнаваты чалавек. Захацелася яму пайсці на кірмаш. Злавіў ён белага пеўня, засунуў за пазуху ды пайшоў. «Прадам,— думае,— пеўня, куплю махоркі».

Яшчэ не дайшоў да кірмашу, а тут ужо яго і купцы сустракаюць:

— Што прадаеш, дзядзька?

— Пеўня,— кажа чалавек.

Дастаў ён з-за пазухі белага пеўня. Купцы паглядзелі, галовамі паківалі:

— Які ж гэта певень? Гэта ж заяц!

«Жартуюць,— думае дзядзька,— ліха ім!» Забраў пеўня ды ідзе далей.

Прайшоў крыху — другія купцы падбягаюць:

— Што прадаеш?

— Пеўня.

Паглядзелі:

— Які ж гэта певень? Гэта ж заяц!

Прыгледзеўся лепш чалавек і сам да свайго пеўня: «А можа, і заяц? — думае.— Не вер вачам! Відаць, праўда, калі ўсе як у бубен б'юць».

Прыйшоў ён на самы кірмаш. Людзей там так густа, што і яблыку няма дзе ўпасці. Каля аднае крамы стукаюць у патэльні, каля другой звоняць косамі — пакупнікоў заклікаюць. Такі шум, гоман на кірмашы, што чалавек ледзь не аглух.

Ачухаўся ён трохі і сам пачаў крычаць:

— Купіце зайца! Купіце зайца!

Падыходзіць да яго баба, дзівіцца:

— Які ж гэта заяц? Гэта ж певень!

Ды чалавек стаіць на сваім:

— Заяц, кажу табе, а не певень!

Сабралася куча народу. Жартуюць з бабы:

— Дзядзька праўду кажа! Ці ж ты не бачыш, што гэта заяц!

Тут ужо чалавек зусім паверыў, што прынёс ён на кірмаш зайца, а не пеўня. І калі хто з купцоў гаварыў цяпер, што гэта певень, а не заяц, дык ён ледзь не з кулакамі на яго кідаўся.

Хадзіў, хадзіў чалавек па кірмашы з пеўнем, і ўсё яму здавалася, што гэта заяц.

Надакучыла пеўню цягацца з чалавекам — пара б ужо і на седала збірацца! Залопаў ён крыламі ды як закрычыць на ўвесь кірмаш:

— Ку-ка-рэ-ку!

Пачуўшы гэта, чалавек зусім збіўся з панталыку: заяц, а пеўнем спявае! Выкінуў ён пеўня з-за пазухі, плюнуў ды пайшоў дахаты.

Праўду кажуць старыя людзі: не той дурань, каго завуць дурнем, а той дурань, хто чужым розумам жыве.

Людзей слухай, а свой розум май.



# ПАНСКАЯ ГАВОРКА

Жылі ў адной вёсцы тры браты. Багатыя былі, а гаварылі, як і ўсе мужыкі,— па-простаму. А ім вельмі хацелася навучыцца гаварыць па-панску.

Сабраліся яны і пайшлі ў маёнтак панскай мове вучыцца. Прыходзяць, а ў пана гасцей поўна.

— Нас да гасцей,— кажа старэйшы брат,— пан не пусціць. Дык мы хоць пад акном паслухаем панскую гаворку. Можа, чаму і навучымся. А каб усім не тырчаць пад акном, давайце будзем слухаць па чарзе, цішком.

Першы падышоў да акна ён сам. Слухаў, слухаў — нічога не разабраў: шумяць паны, як восы ў дупле. А адзін наймацней крычыць:

— То естэм мы! То естэм мы![1]

— Ага,— зарадаваўся старэйшы брат,— тры словы ўжо ведаю!

---

[1] Гэта мы.

Падышоў да акна сярэдні брат. З усяго шуму ён таксама разабраў толькі тры словы:

— Ні за цо! Ні за цо![1]

А малодшы брат добра пачуў словы:

— Добжэ. Мы пуйдам хоць да д'ябла![2]

Ну, на першы раз і гэтай навукі братам хапіла. Ідуць яны дахаты, бачаць: на дарозе мярцвяк ляжыць. Сталі браты і глядзяць на мёртвага чалавека. А тут якраз станавы прыстаў едзе. Убачыў мерцвяка і да братоў:

— Гэта вы чалавека забілі?

Браты і думаюць: як жа ім з прыставам гаварыць? Ён жа таксама пан, і, відаць, лепш гаварыць з ім панскаю моваю.

Вось старэйшы брат, набраўшыся панскага гонару, і кажа:

— То естэм мы!

— За што ж вы яго забілі? — пытаецца прыстаў.

— Ні за цо! — умяшаўся ў гаворку сярэдні брат.

Станавы раскрычаўся:

— У Сібір вас, забойцы, заганю!

А меншы брат выпаліў:

— Добжэ. Мы пуйдам хоць да д'ябла!

Вось як добра пагаварылі браты з прыставам на панскай мове.

---

[1] Нізашто.

[2] Добра. Мы пойдзем хоць к чорту.



# ДОБРЫ ЗНАЁМЫ

Выбралі ў адной воласці новага старшыню. Ну, валасны старшыня — чын не такі ўжо вялікі. Але як для каго: разумны на любой пасадзе розуму не траціць, а дурня хоць царом пастаў — дурнем і застанецца.

Адным словам, новы старшыня пан Цырубалка — так яго звалі — гэтак заганарыўся, што да яго і не падступіцца. Як кажуць, крукам носа не дастанеш. На мужыкоў крычыць, як той асэсар[1], у астрог садзіць. Без яго начальніцкага дазволу ніхто ні дыхнуць, ні пікнуць не меў права.

От сядзіць так аднаго разу новы старшыня ў сваім начальніцкім пакоі і думае, чым бы яшчэ праславіцца. Аж бачыць: ідзе вуліцаю нейкі не-

---

[1] Асэсар — член або засядацель у якой-небудзь важнай установе.

знаёмы чалавек. Не стары, не малады. Не сказаць, каб мужык, але, відаць, і не пан. Ідзе сабе, цыгарку курыць, на дарогу паплёўвае.

«Гм,— падумаў старшыня,— трэба праверыць, хто ён і што.»

Паклікаў свайго сакратара.

— Бачыш вунь таго чалавека? — пытаецца.

— Бачу, пан старшыня.

— То выскачы і даведайся, што ён за птушка. Можа, злодзей які?

— Добра, пан старшыня,— адказаў сакратар і кулём кінуўся на вуліцу.

Дагнаў таго чалавека і кажа:

— Наш новы старшыня пан Цырубалка пытаецца, што ты за птушка такая? Можа, злодзей які?

Паглядзеў прахожы на старшынёвага пасланца і адказвае:

— Скажы твайму новаму старшыні пану Цырубалку, што ён дурань з дурняў.

Плюнуў і пайшоў сваёю дарогаю.

Вярнуўся сакратар да старшыні.

— Ну, хто гэта?

— Ды нейкі, відаць, ваш добры знаёмы...

— Мой знаёмы?! — здзівіўся старшыня.

— Але.

— Адкуль жа ён ведае мяне?

— Гэтага ён не сказаў. Але ясна сказаў, што вы, пан старшыня, дурань з дурняў. Дык, я думаю, той, хто вас не ведае, так не сказаў бы.

Новы старшыня толькі скрывіўся як мыла з'еўшы.



## САЛДАТ З ТАГО СВЕТУ

Адслужыў салдат сваю службу і падаўся дахаты. Ідзе дзень, другі, галодны, без капейкі грошай у кішэні.

Зайшоў па дарозе на папоўскі двор. «Хоць вады папрашу»,— думае. Падала яму пападдзя вады і пытаецца:

— Дзе служыў, салдацік?

— На ўсім свеце,— адказаў салдат.

Пападдзі здалося: на тым свеце.

— Ну, як там, служывенькі, на тым свеце? — зацікавілася яна.

— А нішто,— адказвае салдат.— Так, як і на гэтым: ёсць што есці, то ясі, а няма, то зубы на паліцу кладзі.

— Бацьку майго нябожчыка ты часам не бачыў там?

— А як яго завуць?

Пападдзя сказала.

— Дзіва што бачыў,— адказаў салдат.— Яго ўсе ведаюць.

— А што ж ён там робіць?

— Смалу ў пекле на тачцы возіць. Галодны, небарака, не раўнуючы, як той сабака.

Пападдзя забедавала:

— Ай-яй! У нас гэтулькі дабра ўсялякага, а ён там галодны... А скора ты, салдацік, вернешся назад, на той свет?

— Ды, каб не салгаць, заўтра або паслязаўтра буду там зноў...

Зарадавалася пападдзя, напакавала цэлую торбу кілбас, сала, хлеба і просіць салдата:

— Занясі ты, галубок, бацьку, няхай ён хоць трошкі паесць смачненькага.

— Добра,— кажа салдат,— зрабіць гэта мне няцяжка.

Закінуў ён торбу за плечы ды пайшоў з двара падскакваючы.

Прыходзіць неўзабаве поп дахаты. Пападдзя і расказала яму пра салдата з таго свету.

— Што ты, матухна,— не верыць поп.— Ілжэ твой салдат! Абдурыў ён цябе.

Сеў поп на воз і паджгаў салдата даганяць. Ну, конь у папа быў добры, ён як бач і дагнаў яго.

— Куды ідзеш, служывы? — пытаецца поп у салдата.

— Дахаты.

— Садзіся, падвязу.

Салдат сеў. А поп думае сам сабе: падвязу яго да мястэчка, а там здам ураднiку ці прыставу. Няхай у астрог яго пасадзяць за ашуканства.

Але, як кажуць, хіцер Зміцер, ды і Саўка не дурань. Праехалі гэтак з вярсту. І раптам салдат забедаваў:

— Ох, бацюшка, шапку згубіў! Пабягу пашукаю.

Поп думае: хітры нябось салдат — пабяжыць шапку шукаць і ўцячэ.

— Чакай,— кажа ён салдату.— Ты змарыўся за дарогу. Пасядзі лепш на возе. Я сам знайду тваю шапку.

Пайшоў поп па шапку, а салдат па кані, па кані — ды толькі яго і бачылі.

— Вярнуўся поп дахаты. Пападдзя пытаецца:

— А дзе ж конь, калёсы?

— Аддаў салдату,— кажа поп.

— Навошта?

— Табе ж казаў салдат, што бацька твой у пекле на тачцы смалу возіць. То няхай лепш робіць гэта на кані.



## РАЗУМНАЯ ДАЧКА

Жыў адзін бедны чалавек з жонкаю. Нарадзілася ў іх дачка. Прыйшлося спраўляць радзіны. А ў чалавека таго ні хлеба, ні да хлеба. Чым гасцей частаваць?

Пайшоў бядняк на рэчку па ваду. Аж бачыць — ляжыць у кустах цялушачка. Ды такая слабая, лядаштая, што сама і не ўстане.

Прынёс ён цялушачку дахаты і кажа сваёй жонцы:

— Давай зарэжам яе: будзе чым гасцей пачаставаць.

Спадабалася жонцы цялушачка — такая рыжанькая ды лысенькая.

— Не,— адказвае яна,— хай лепш гадуецца.

— Дык жа яна зусім кволенькая. Яе, відаць, нехта знарок выкінуў, каб у хляве не здохла.

— Нічога, можа, як і выгадуем. Падрасце дачка — будзе ёй малако.

Паслухаў чалавек жонку, і пачалі яны гадаваць цялушачку.

Акрыяла тая, расце як на дражджах. І дачка таксама расце як на дражджах. Ды такая разумніца ўдалася, што і старыя ахвотна слухаюць яе.

Выгадавалася з лысенькай цялушкі слаўная карова.

Падрасла дзяўчынка, стала ёй сем гадоў, пачала сама пасвіць карову.

Загледзеўся аднойчы багаты сусед на карову бедняка.

— Адкуль у цябе такая добрая карова? — пытаецца.

Бядняк і расказаў яму ўсё, як было.

— Эге,— кажа багацей,— дык гэта ж мая цялушка! Гэта я выкінуў яе — не думаў, што яна на ногі ўстане. Не, тады я забяру сваю карову назад...

Зажурыўся бедны чалавек.

— Я ж яе гадаваў,— кажа.— І яна цяпер мая.

Не згаджаецца багаты.

— Не аддасі па-добраму — пойдзем да пана на суд.

Што рабіць? Пайшлі да пана на суд.

Багаты падаў пану руку, прывітаўся: ведама, багаты з багатым свае людзі. Пан кажа яму:

— Садзіся ў мяне.

Багаты сеў у крэсла, а бедны стаіць ля парога, шапку зняўшы. Пан на яго і не глядзіць.

— Ну, што скажаш? — пытаецца пан у багатага.

— Ды вось, пане, якая справа,— пачаў скардзіцца багаты.— Сем гадоў таму назад гэты чалавек забраў маю цялушку і цяпер не аддае...

Выслухаў пан і бедняка. А потым і кажа ім:

— Добра. Суд мой будзе такі. Загадаю вам тры загадкі: што на свеце сыцей за ўсё? што на свеце саладзей за ўсё? што на свеце шпарчэй за ўсё? Хто адгадае, таму і карова застанецца. А цяпер ідзіце дахаты, падумайце. Заўтра прыйдзеце з адгадкамі.

Вярнуўся бедны чалавек дахаты, сеў і плача.

— Чаго ты, тата, плачаш? — пытаецца дачка.

— Ды так і так,— адказвае бацька,— хоча багаты сусед адабраць у нас карову. Пайшлі мы з ім да пана на суд. А той загадаў нам тры загадкі. Хто з нас адгадае, таму і карова застанецца. Дзе ж мне адгадаць тыя загадкі!

— А якія, тата, загадкі? — пытаецца дачка.

Бацька сказаў.

— Нічога, тата, не турбуйся,— кажа дачка.— Кладзіся спаць. Заўтра што-небудзь прыдумаем.

А багаты прыйшоў дадому і радуецца:

— Ну, баба, карова будзе наша! Трэба нам з табою толькі адгадаць тры загадкі: што на свеце сыцей, што саладзей і што шпарчэй?

— Вось дзіва! — усміхнулася жонка.— Тут і адгадваць няма чаго. Сыцей за нашага рабога парсюка нікога на свеце няма. Саладзей за ліпавы мёд ад нашых пчол таксама няма нічога. А шпарчэй за нашага гнедага жарабца ніхто не зможа бегчы: ён жа як памчыцца, дык і вецер не дагоніць!

— Праўда,— згадзіўся мужык,— так я і скажу пану.

Назаўтра прыходзяць бедны з багатым да пана.

— Ну што, адгадалі мае загадкі? — пытаецца пан.

Багаты выйшаў наперад:

— Ды тут і адгадваць няма чаго: нікога і нічога на свеце няма сыцей за майго рабога парсюка, саладзей за ліпавы мёд ад маіх пчол і шпарчэй за майго гнедага жарабца.

— А ты,— пытаецца пан у бедняка,— адгадаў?

— Адгадаў, пане: няма нічога сыцей за зямлю, бо яна ўсіх корміць; няма нічога саладзей за сон, бо хоць якое гора, а заснеш, дык і забудзешся; і няма нічога шпарчэй за людскія думкі, бо сам ты яшчэ тут, а думкі ўжо далёка-далёка...

Правільна адгадаў бядняк! Прыйшлося пану прысудзіць яму карову.

— Хто гэта цябе навучыў так адказваць на мае загадкі? — пытаецца пан у бедняка.

— Мая дачка-сямігодка.

Здзівіўся пан: не можа таго быць, каб такая малая беднякова дачка адгадала яго загадкі! Захацелася яму паглядзець разумную дзяўчынку. Прыехаў ён аднойчы да бедняка, а той якраз з жонкаю ў полі быў. Сустрэла пана беднякова дачка-сямігодка.

— Дзяўчынка,— пытаецца пан,— да чаго мне коней прывязаць?

Паглядзела дзяўчынка на сані і калёсы, што стаялі на двары, і кажа:

— Можаш да зімы прывязаць, а можаш і да лета.

Пан і вочы вылупіў: як гэта можна коней прывязаць да зімы або да лета? Смяецца, відаць, з яго гэтае дзяўчо.

— Ну, хоць да саней прывяжы, а хоць да калёс,— растлумачыла дзяўчынка.

Бачыць пан: беднякова дачка сапраўды надта разумная. Не гонар гэта пану. Дачуюцца людзі,

што яна разумнейшая за яго, тады хоць з маёнтка ўцякай.

Пагаварыў пан з дзяўчынкай і паехаў, а ёй сказаў, каб увечары бацька да яго прыйшоў.

Прыйшоў увечары бядняк да пана.

— Нішто,— кажа пан,— разумная твая дачка. Але я ўсё ж разумнейшы.

Даў пан бедняку рэшата яек.

— На,— кажа,— занясі дачцэ і скажы, каб яна пасадзіла на іх квактуху і вывела мне да заўтра куранят на снеданне. А не зробіць гэтага — загадаю бізуноў даць.

Прыйшоў бядняк дахаты засмучаны. Сеў на лаве і плача.

— Чаго, тата, плачаш? — пытаецца дачка.

— Ды вось, дачушка, бяда якая: загадаў табе пан новую загадку.

— Якую?

Бацька паказаў дачцэ рэшата з яйкамі:

— Сказаў, каб ты на гэтыя яйкі квактуху пасадзіла і вывела куранят да заўтра яму на снеданне. Хіба ж гэта можна зрабіць?

Дачка падумала і кажа:

— Нічога, тата. Заўтра што-небудзь прыдумаем. А пакуль што бяры, мама, гэтыя яйкі, пячы яечню на вячэру.

Раніцай дачка кажа бацьку:

— На́ табе, тата, гаршчок, ідзі да пана. Скажы, каб ён за дзень ляда высек, выкарчаваў і ўзараў, проса пасеяў, зжаў і змалаціў ды ў гэты гаршчок насыпаў куранят карміць.

Пайшоў бацька да пана, падаў яму пусты гаршчок і сказаў усё, як дачка загадала.

Пан падкруціў вусы, паморшчыўся і кажа:

— Разумная твая дачка, ды я ўсё ж разумнейшы!

Узяў ён тры сцяблінкі льну, падаў бедняку:

— Скажы дачцэ, каб яна да заўтра гэты лён сцерла, спрала, выткала і пашыла мне з яго кашулю.

Вярнуўся бацька дахаты. Дачка пытаецца:

— Што сказаў табе пан?

Падаў бацька ёй тры сцяблінкі льну і расказаў, што пан загадаў.

— Нічога,— адказвае дачка,— кладзіся, тата, спаць: заўтра што-небудзь прыдумаем.

Назаўтра дае дачка бацьку тры кляновыя дубчыкі і кажа:

— Занясі пану і папрасі, няхай ён іх пасадзіць, за адну ноч вырасціць і зробіць варштат для кросен, каб было на чым палатно яму для кашулі выткаць.

Пайшоў бядняк да пана, падаў тры дубчыкі і сказаў, як дачка навучыла.

Пачырванеў пан і кажа:

— Разумная твая дачка — нічога не скажаш. Ды я ўсё ж разумнейшы! Перадай жа ты ёй, каб яна да мяне не пехатою прыйшла, не на кані прыехала, не голая і не адзетая, і каб падарунак мне прынесла, а я каб не мог яго прыняць. Калі зробіць усё гэта, то вазьму яе за дачку — вырасце, паняй будзе! А не зробіць — дрэнна ёй будзе...

Вярнуўся бацька дахаты яшчэ больш засмучаны.

— Ну, што табе, тата, пан сказаў? — пытаецца дачка.

— Ды вось, дачушка, нарабіла ты сваімі адгадкамі бяды і нам і сабе...

Расказаў бацька, што пан загадаў. Дачка засмяялася:

— Нічога, тата. Як-небудзь абдурым пана і на гэты раз. Злаві ты мне толькі жывога зайца.

Пайшоў бацька ў лес, паставіў сіло і злавіў зайца.

Дачка закруцілася ў рыбацкую сетку замест сукенкі, села на кіёк і паехала з зайцам да пана.

Пан стаіць на ганку і дзівіцца: зноў перахітрыла яго беднякова дачка! Узлаваўся ён і нацкаваў на яе сабак — думаў, тыя разарвуць разумніцу. Дзяўчынка выпусціла з рук зайца — сабакі памчаліся за ім.

Падышла яна да пана.

— Лаві,— кажа,— свой падарунак: вунь у лес пабег...

Давялося пану ўзяць разумную дзяўчынку за дачку.

Паехаў неўзабаве пан за граніцу, а дзяўчынцы сказаў:

— Глядзі ж, каб ты тут без мяне не судзіла маіх людзей, бо дрэнна табе будзе.

Засталася дзяўчынка адна ў маёнтку.

Здарылася ў гэты час такая справа. Пайшлі два дзядзькі на кірмаш. Адзін купіў калёсы, другі — кабылу. Запрэглі кабылу ў калёсы і паехалі дамоў. Па дарозе спыніліся адпачыць. Леглі і паснулі. А як прачнуліся, бачаць: бегае ля калёс малое жарабятка. Дзядзькі заспрачаліся. Той, чые калёсы былі, кажа: «Жарабя маё — гэта мае калёсы ажарабіліся!» А той, чыя кабыла, сваё даводзіць: «Не, жарабя маё — гэта мая кабыла ажарабілася!» Паспрачаліся яны ды парашылі ехаць да пана на суд. Прыехалі, а пана няма дома.

— Рассудзі хоць ты нас,— просяць дзядзькі прыёмную панскую дачку.

Даведалася дзяўчынка, што ў іх за справа, і кажа:

— Няхай той з вас, чыя кабыла, выпража яе



з калёс ды вядзе ў руках, а той, чые калёсы, няхай цягне іх на сабе ў другі бок. За кім жарабя пабяжыць, той яго і гаспадар.

Дзядзькі так і зрабілі. Жарабя пабегла за кабылаю. На гэтым і спрэчка ў іх скончылася.

Вярнуўся пан з-за граніцы і дачуўся, што разумная дзяўчынка без яго суды судзіла. Узлаваўся ён, нарабіў крыку:

— Што ж ты не паслухала мяне? Бяры сабе з маёнтка што пажадаеш ды ідзі дахаты, каб я цябе больш не бачыў!

— Добра,— кажа дзяўчынка.— Але мне хочацца на адыход цябе віном пачаставаць.

— Частуй,— буркнуў пан.— Толькі хутчэй.

Напаіла яго дзяўчынка віном, пан і заснуў без памяці. Загадала тады яна слугам запрэгчы каня, палажыла пана ў карэту і павезла дахаты. Дома з бацькам зняла яго з карэты ды перанесла ў сенцы на салому.

— Вось табе,— кажа,— пасцель замест пярынаў. Ачухвайся тут.

Прачнуўся назаўтра пан, разглядаецца — дзе ж гэта ён? Убачыў сваю прыёмную дачку, якую прагнаў, і пытаецца:

— Чаму я тут, у брудной мужыцкай хаце, ляжу?

— Ты сам так захацеў,— смяецца дзяўчынка.— Ты сказаў мне: «Бяры сабе з маёнтка што пажадаеш ды ідзі дахаты». Я і ўзяла цябе. Уставай ды ідзі замест бацькі паншчыну адбываць. Ты мужык дужы, работнік з цябе будзе нядрэнны.

Пачуўшы гэта, пан усхапіўся на ногі і так драпануў, што толькі яго і бачылі. Нават ад коней з карэтаю адрокся.





## НЕ КАЖЫ «ГОП», ПАКУЛЬ НЕ ПЕРАСКОЧЫШ

Пра паляўнічых расказваюць розныя байкі. Штукары яны на выдумкі, што і казаць. Любяць прылгаць і памарыць аб паляўнічым шчасці.

Дык вось. Жыў-быў некалі адзін такі паляўнічы. Пайшоў ён у лес, глядзіць — заяц пад кустом спіць. Тоўсты шарак, сыты. Адкарміўся за лета на добрых харчах.

Дастаў узрадаваны паляўнічы капшук з тытунём, напіхае люльку, а сам думае, любуючыся зайцам: «Няхай, небарака, яшчэ паспіць. Ад сну не толькі чалавек, а і заяц тлусцее. Нікуды ад мяне ён цяпер не ўцячэ. Але што ж я з ім зраблю, як застрэлю? Ага! От што зраблю. Мяса пасалю, у дзежку складу, буду есці патрошку, а шкуру — хвацкая шкура! — прадам. Немалыя грошы вазьму! Дзешава не прадам. Буду таргавацца. Так, так. А што за тыя грошы куплю?»

Прыкінуў мужык-паляўнічы і так і гэтак: шмат дзірак у гаспадарцы на тыя грошы. «Ага! — падумаў ён.— Лепш за ўсё куплю за іх курачку. Яна яек нанясе. Потым пасаджу яе на тыя яйкі ў рэшата, яна куранятак выведзе: пеўнікаў і курачак. Пеўнікаў, як падрастуць, парэжу — зноў мяса будзе, а курачак прадам — зноў грошы будуць. Немалыя грошы! Што я за іх куплю? Ага! Куплю на гэты раз авечку. Яна прывядзе ягнятак: баранчыка і ярачку. Баранчыка, як падрасце, я на мяса зарэжу — от жа наемся цяпер мяса ўдосталь. А ярачку гадаваць буду. Год за годам — і цэлую чараду авечак развяду. Так, так, далібог, развяду. Гм... Што ж цяпер з імі рабіць буду?»

Думаў-думаў паляўнічы, так і гэтак меркаваў. «Ага! — надумаўся нарэшце.— Чараду авечак я таксама прадам. Цэлы мех грошай за іх вазьму. За тыя грошы куплю карабель, нагружу яго лёнам і семем ды паеду за мора гандляваць. Яшчэ больш грошай утаргую. Вярнуся дахаты, куплю маёнтак, стану панам. Зямлю мужыкам у арэнду аддам, немалыя падаткі на іх накладу, а сам буду піць-гуляць ды на слуг пакрыкваць. Прыйдзе каторы з мужыкоў-арандатараў да мяне ў палацы, паклоніцца нізка: «Паночак, будзь ласкаў, пачакай з падаткам за зямлю. Зараз грошай няма. Аддам пасля з дабаўкаю...» А я вусы падкручу ды як закрычу:

— Прэч, мужык, з вачэй! Нясі падатак хутчэй!»

І так моцна крыкнуў шчаслівы паляўнічы, што заяц прахапіўся — ды толькі яго і бачылі.

Недарэмна ж кажуць: «Не здзірай шкуры з незабітага мядзведзя». Або яшчэ лепш: «Не кажы «гоп», пакуль не пераскочыш».



## ЦІ БЫЛА Ў ПАПА ГАЛАВА

Пасеялі суседзі Лявон ды Парамон на палянцы авёс. Авёс не ўрадзіў — нейкі шкоднік да каліва яго патравіў. Пасеялі на другі год грэчку — і з грэчкай тое ж самае.

Дачуўся пра гэта поп і кажа:

— Трэба малебен адслужыць, тады ўсё будзе добра радзіць.

Згадзіліся суседзі Лявон ды Парамон і заказалі папу малебен.

Ну, поп надзеў расу, сеў у каляску, прыехаў на поле. Пахадзіў, пасвянціў, потым убачыў каля вываратня нару і кажа:

— Вось дзе ён, шкоднік, сядзіць. Лезьце па яго.

Гаспадары гнуцца — не хочуць у нару лезці.

— Тады я сам палезу,— кажа поп.— Толькі прывяжыце мне за ногі вяроўку: калі мяне доўга не будзе, то цягніце.

Палез поп у нару. Пачакалі гаспадары гадзі-

ну, другую — і пацягнулі за вяроўку. Выцягнулі папа з нары, аж бачаць — няма ў яго галавы.

— Цікава,— кажа Лявон,— ці была ў папа галава, як ён у нару лез?

— Нешта я не прыкмеціў,— кажа Парамон.— Трэба хіба ў фурмана запытацца.

Пайшлі да фурмана. Фурман кажа:

— Я хоць і вёз яго, але добра не прыглядаўся: можа, ён з галавою быў, а можа, без галавы. Папытайцеся ў наймічкі: яна ўчора яго прычэсвала.

Пайшлі да наймічкі.

— Ці была ў папа галава, як ты яго ўчора прычэсвала? — пытаюцца.

— Не памятаю,— кажа наймічка.— Можа, матушка ведае: яна яму сёння снеданне падавала.

Пайшлі да пападдзі:

— Ці была ў твайго бацюшкі галава?

— Хто яго ведае,— адказала пападдзя.— Здаецца, як раніцою бліны ўплятаў, дык галавою матаў.

І колькі ў каго тыя суседзі ні пыталі, так толку і не дабралі: была ў папа галава ці не.




## ДЗЯК — БЛАГІ СПЯВАК

Служыў у адной царкве дзяк. Благі ён быў спявак. Ні складу ў яго песнях, ні ладу. Бывала, як заспявае сваім казліным галаском, то хоць ты з царквы ўцякай.

Аднаго разу дзяк вырашыў пастарацца. А ведама, калі чалавек залішне стараецца, то яшчэ горш выходзіць. Спявае гэта дзяк жаласна, а сам усё на людзей паглядае: ці слухаюць яны яго песні? Аж бачыць: стаіць адзін стары дзядок каля кліраса ды плача.

Зарадаваўся дзяк: гэта, думае, я сваімі песнямі яго так расчуліў. І давай дзяк яшчэ танчэй зацягваць. Скончылася абедня. Падышоў дзяк да старога і пытаецца:

— Чаго ты, старэнькі, гэтак плакаў?

— Ай, дзяча,— кажа стары.— Як жа мне было не плакаць? Ты сёння спяваў якраз так, як мая козачка бляяла, калі яе ваўкі душылі...



## ПІСАР-АШУКАНЕЦ

Быў адзін ліхі пан. Цяжка за ім жылося людзям: увесь тыдзень хадзілі на паншчыну, а што заробіш для сябе ў нядзелю, дык і тое аддай пану. То нясі яму сушаных грыбоў, то назбірай свежых, то ягад розных — усё яму трэба. Бывала, як прыйдзе зіма, цэлыя абозы фурманак вязуць усялякае дабро на панскі двор. Сам жа пан рэдка калі і стыкаўся ў маёнтку: то за граніцу ездзіў, то ў Варшаву.

Аднойчы доўга не было пана ў маёнтку. Потым пайшла чутка, што ён і зусім не вернецца. Хто іх там разбярэ, што ў паноў робіцца. Казалі, быццам прадаў ён свой маёнтак з усімі людзьмі другому пану за пару замежных коней і за пяток нейкіх сабак.

І вось па немалым часе прыехаў новы пан.

Сабраліся людзі грамадою і пачалі раіцца, ці не можна было б упрасіць новага пана, каб збавіў

трохі паншчыну і падаткі, каб даў якую палёгку бедным людзям.

Але як жа яго прасіць, таго пана? Ці ж здолее хто з іх расказаць пану ўсё як трэба? Людзі яны цёмныя ды і мовы панскай не разумеюць. Згаварыліся тады напісаць пану пра ўсё на паперы. Ды — новая бяда: ніхто пісаць не ўмее. Карбаваць[1] сяк-так карбуюць, а пісаць — дзе там!

Прачулі мужчыны, што ёсць у мястэчку якісь пісар і што ён умее вельмі добра пісаць. Піша дробна, як макам сыпле, а дзе трэба — кружкі, быццам яйкі, ставіць і гэтак накруціць, што толькі надта пісьменны і разбярэ.

Прывезлі яны таго пісара, частуюць і просяць, каб ён усё добра напісаў пану.

Цэлы тыдзень пісар піў, еў яечню, а пісаць не браўся. Праз тыдзень кажа:

— Трэба раней паперы дастаць.

Пайшлі хлопцы ў мястэчка, купілі ў крамцы аркуш паперы. Тады пісар кажа:

— А цяпер назбірайце дубовых арэшкаў ды насушыце.

Назбіралі арэшкаў, насушылі. Пайшоў пісар у кузню, набраў з-пад тачыла вады, наліў яе ў гаршчок, насыпаў туды дубовых арэшкаў і паставіў гаршчок на печ.

Праз тры дні зняў гаршчок з печы, пагля-дзеў — аж там чорны, як сажа, атрамант[2].

— Цяпер,— кажа пісар,— нарвіце мне гусіных пер'яў.

Нанеслі яму з усяго сяла кучу гусіных пер'яў. Навастрыў іх пісар цэлы пук — прашэнне тое пісаць.

---

[1] Карбаваць — лічыць.
[2] Атрамант — чарніла.

— Ну, а зараз нясіце гарэлку, каб рука лягчэй хадзіла,— загадаў мужчынам.

Прынеслі яму гарэлку — абы толькі пісаў!

Выпіў пісар, закусіў агурком і давай пісаць.

Сышліся людзі з усяго сяла. Адзін кажа:

— Напішы, каб пан даў нам на дым[1] па пяць коп[2] жэрдзя на плот.

— Пішы,— кажа другі,— каб пан збавіў падаткі.

— Пішы,— падказвае трэці,— каб пан зменшыў нам паншчыну хоць на два дні ў тыдзень, бо мы з голаду паўміраем.

Шмат чаго ўспомнілі мужыкі пра сваё гаротнае жыццё і пра ўсё прасілі напісаць пану.

А пісар пацягне з пляшкі ды так піша, што аж пяро скрыпіць, як непадмазаныя калёсы. Аж пот на лбе выступае, быццам не пяром водзіць, а сякерай дровы пляжыць. А лоб у яго вялізны і галава голая, хоць боб малаці.

Напісаў пісар прашэнне. Мужчыны паставілі крыжыкі замест подпісаў і дзякуюць пісару. Сабралі з усяе вёскі курэй, яек, мёду — хто што меў. Забраў усё гэта пісар ды паехаў дахаты, а мужчыны гуртам пайшлі да новага пана.

Выйшаў пан на ганак.

— Чаго прыйшлі? — пытаецца.

— Ды вось, панок, прашэнне прынеслі...

Узяў пан у рукі тую паперу, прачытаў і кажа:

— Ну што ж, дзякую, што вы па добрай волі даяце мне з дыму па валу, па капе яек і па асміне аўса. Ідзіце, збірайце ўсё і вязіце ў маёнтак.

Слухаюць мужчыны пана — вушам не вераць: жартуе ён, ці што?

---

[1] Дым — двор, хата.
[2] Ка́па — 60 штук.

— А калі самі не аддасце ўсяго, што напісалі,— кажа пан,— дык я падам вашу паперу ўрадніку, ён з вас сышча.

Здагадаліся тут мужыкі: ашукаў іх той пісар-п'янчужка!

Пачухалі яны патыліцы ды падаліся дахаты. Ідуць, ледзь не плачуць. Адзін і кажа:

— Эх, і падвёў жа нас гэты недаврак! А я і тады ведаў, што ён піша...

— Адкуль жа ты ведаў? — пытаюцца ў яго мужчыны.

— А вось бачу — піша буйней ды і закруціць. Ну, думаю, гэта валы крутарогія. Піша круглае — гэта вам яйкі, а дробнае — авёс...

— Чаму ж ты нам не сказаў?

Напалі на яго мужчыны, але бядзе гэта не памагло.



## УПАРТАЯ ЖОНКА

Касіў мужык сена. Прыносіць яму жонка абед. Паглядзела на пакошу і кажа:

— Вось жа скасіў, як выстрыг!

Мужык пакруціў галавою:

— Не выстрыг, а выгаліў. Ці ж не бачыш: ніводнай травінкі не пакінуў.

— Не выгаліў, а выстрыг! — запярэчыла жонка. Бо, трэба сказаць, была яна з тых жонак, якія заўсёды мужыкам пярэчаць — варта ці не варта.

Мужык узлаваўся: як гэта, каб усё было так, як жонка захоча!

— Не выстрыг, а выгаліў! — не здаваўся ён.

І пайшла ў іх спрэчка на ўсю ваколіцу:

— Выстрыг!

— Выгаліў!

— Стрыжана!

— Голена...

Спрачаліся, спрачаліся, а да згоды так і не прыйшлі.

Плюнула тады жонка са злосці ды пабегла тапіцца. Балазе блізка рэчка была. Ускочыла ў ваду па самыя вушы і ўсё сваё крычыць:

— Стрыжана!

— Голена! — стаіць на сваім мужык.

Вось жонка ўжо і з галавою схавалася, крычаць нельга, дык яна два пальцы выставіла, стрыжэ імі над вадою: стрыг, стрыг! А мужык, як бык, упёрся:

— Не, любая жоначка, на гэты раз, здаецца, я цябе пераспрачаю.

Так яно і было.





## ПОП-АШУКАНЕЦ

Адзін поп не раз угаворваў веруючых, каб не скупіліся на ахвяры пану богу.

— Бог,— казаў поп,— не толькі любіць ахвяры, але і добра ўзнагароджвае тых, хто яму гэтыя ахвяры прыносіць. Вось, скажам, ты ахвяруеш богу свечку або нават і авечку ці цэлую карову, а ён табе за гэта ў дзесяць разоў больш верне. Так што не скупіцеся, паважаныя парафіяне, нясіце і вядзіце ў святую царкву хто што можа.

Наслухаўся гэтых казанняў адзін бедны чалавек і захацелася яму паспрабаваць шчасця.

Але што ж ахвяраваць пану богу? Каня ў яго няма. Авечак і свіней таксама. Адна толькі худая Рагуля ў гаспадарцы засталася.

— Давай,— кажа ён жонцы,— хоць сваю Рагулю ахвяруем богу. Калі ён нам верне ў дзесяць

разоў больш, то мы адразу разбагацеем: купім і каня, і авечак, і свіней.

— Давай,— згаджаецца жонка.— Няхай будзе так. Бо ідзе зіма, а корму ў нас кот наплакаў.

Накінуў бедны чалавек вяроўку на рогі сваёй кароўцы і павёў яе на папоўскі двор.

— Вось, бацюшка,— кажа,— мая ахвяра пану богу. Бяры яе і маліся, каб ён вярнуў мне ў дзесяць разоў больш.

Зарадаваўся прагны на чужое дабро поп. Забраў беднякову Рагулю і далучыў да сваёй чарады.

— Добра,— кажа,— зрабіў ты, чалавеча. Чакай. Бог табе верне.

Тым часам мінула зіма. Вясною выпусціў поп сваю чараду кароў на пашу. Прыгрэла сонейка. Напалі на кароў сляпні і авадні. Каровы як загізуюць з пашы!

Беднякова Рагуля пабегла па прывычцы не на папоў двор, а да свайго старога гаспадара. А за ёю, не разабраўшыся, яшчэ дзевяць сытых папоўскіх кароў паджгалі.

Убачыў гэта бядняк і крычыць:

— Глядзі, Акуліна, колькі наша Рагуля прыбытку прывяла!

Выбегла жонка з хаты, радуецца:

— Праўду поп казаў. Гані іх у хлеў. Я зараз з даёнкаю прыйду.

Загнаў гаспадар кароў у хлеў. Баба падаіла іх. А тут і поп на двор заходзіць.

— Мае,— кажа,— каровы да цябе прыбеглі.

— Як твае, бацюшка?! — здзівіўся гаспадар.— Гэта мне бог вярнуў за Рагулю ў дзесяць разоў больш, як ты сам казаў.

Поп і туды, і сюды — ды так нічога і не зрабіў.



## ЗА КАНЯ — БРУСОК

Жылі дзед з бабаю. Быў у іх конь. Дзед яго пасвіў, на начлег вадзіў.

Надакучыла яму гэтая работа. Вось аднойчы ён і кажа бабе:

— Баба, а баба. Давай прадамо каня, а купім вала.

— Навошта, дзед, табе вол?

— Вала лягчэй дагледзець: яго на начлег не трэба вадзіць.

Падумала баба.

— Праўда,— кажа.— Ты будзеш дома начаваць. А то мне адной маркотна.

Ну, прадалі каня, купілі вала. Патрымалі яго трохі ды агледзеліся, што вол многа сена есць.

— Давай,— кажа баба,— прадамо вала, а купім лепш казу. Яна будзе малако даваць. А карміць яе можна лазою або бярозавымі венікамі.

— Добра,— кажа дзед.— Няхай будзе каза.

Прадалі вала, купілі казу. А каза такая разбойніца трапілася — бяда. Адну бабу падпускае да сябе. А дзеда ні на вочы. Так і таўчэ яго рагамі.

Панасіў дзед сінякоў ад казіных рагоў і кажа бабе:

— Гэта шалёная каза. Давай прадамо яе ды купім лепш гусь.

— Давай. Яна будзе яйкі несці, гусянят выводзіць.

Ды дзед памыліўся: купіў не гусь, а гусака. Жыве гусак, а яек не нясе, гусянят не выводзіць. Што рабіць? А тут якраз людзі сена касіць пачалі. Сабраўся і дзед касіць, ды няма бруска касу вастрыць. Вось ён і кажа бабе:

— Давай, баба, прадамо гусака, а купім брусок.

— Давай,— згаджаецца баба.— Бо ўсё роўна толку з гусака як з казла малака.

Прадалі гусака, купілі брусок. Пайшоў дзед з касою і бруском сена касіць. Бачыць: у возеры качка плавае. «Заб'ю,— думае дзед,— качку — мяса будзе». Глянуў туд-сюд — няма нідзе камення. А качка вось-вось далей адплыве. Узяў дзед і шпурнуў у качку бруском. Качка ўзнялася і паляцела, а брусок у возеры патануў.

Так і засталіся дзед з бабаю без нічога.





## СТАРЫЯ, ЯК МАЛЫЯ

Пасвілі ў адной вёсцы авечак два пастухі — Дзям'ян і Раман. Абодва немаладыя ўжо.

Дзям'ян быў чалавек справядлівы, работу сваю рабіў сумленна. А Раман усё хітраваў. Бегаць за авечкамі ленаваўся: то ў яго нага раптам забаліць, то жывот схопіць. А што лепшае ў торбу трапляла ад гаспадароў — першы з'ядаў.

Не падабаўся Дзям'яну яго таварыш. Ды што зробіш? Цярпеў да пары да часу.

Аднаго разу ў свята гаспадары расшчодрыліся і паклалі пастухам у торбу з дзесятак яек і добры кавалак сала.

Узялі старыя пастухі з сабою патэльню і пачалі ў полі агонь раскладаць, каб яечню пячы. Гамоняць пра тое ды сёе. Світкі паскідалі — цёпла стала каля агню.

— А помніш, як мы з табою малыя былі? — кажа Раман.

— Дзіва што помню,— адказвае Дзям'ян.— Ты тады ўсё ў чужыя сады лазіў... І авечак мы з табою таксама разам тады пасвілі.

— Але,— згаджаецца Раман.— А помніш, як мы гаварылі тады? Не так, як цяпер.

— Пэўна ж не так. На авечак казалі авецацкі, на агонь — жыжа або зыза...

— Дык давай, братка Дзям'ян, і цяпер так пагаворым. Гэта ж вельмі цікава.

— Давай.

І пачалі яны гаварыць, як малыя.

— Ты, Раманацка, кладзі галавесацкі, а я нарэзу сквалацак у яецаньку.

— Добра, Дзям'янацка. Налэз сквалацак.

Як толькі спяклася яечня, Раман глянуў на авечак і кажа:

— Дзям'янацка! Вунь авецацкі ў яцмені... Бязы адгані. А я яецаньку павалтую.

Усхапіўся паслухмяны Дзям'ян і пабег да авечак. А хітры Раман тым часам хоп-хоп і з'еў усю яечню з салам...

Вярнуўся Дзям'ян. Глядзіць — патэльня пустая.

— А дзе ж яецанька? — пытаецца.

— Жыжа гам-гам,— адказвае Раман і аблізваецца.

Ну, жыжа дык жыжа. Нічога не зробіш. Паселі яны ды зноў гамоняць, як малыя. А тут авечкі — шусь у той жа ячмень.

— Бязы, Дзям'янацка, адгані іх далей,— кажа Раман.

— Не,— упёрся Дзям'ян.— Цяпел твая цалга...

— У мяне зывот баліць...

— А ты не зыватом, а нагамі бязы.

Давялося на гэты раз Раману самому бегчы

да авечак. А Дзям'ян тым часам хоп новую Раманаву світку ды ў агонь...

Вярнуўся Раман. Бачыць — світкі няма.

— А дзе з мая світка, Дзям'янацка?

— Яе жыжа гам-гам...— развёў рукамі Дзям'ян.

Узлаваўся Раман і падаў на Дзям'яна ў суд за тое, што спаліў новую яго світку.

Выклікае суддзя Дзям'яна і Рамана на суд.

— Ты, Дзям'ян, навошта спаліў Раманаву світку? — пытаецца.

— Пан суддзя,— кажа Дзям'ян,— запытайце лепш у яго, калі гэта было.

— А ці ж ён, гіцаль, не помніць? — кажа Раман.— Бачыш, памяць у яго адабрала, як я ў суд падаў? Гэта было, пан суддзя, тады, калі мы малымі былі, па-дзіцячаму гаманілі ў полі каля агню. Няхай успомніць.

— Але,— кажа Дзям'ян,— гэта было мо з паўсотні гадоў таму назад...

Узлаваўся суддзя на Рамана, закрычаў:

— Што ж ты, стары дурань, мне даўнейшае ўспамінаеш? Трэба было тады і на суд падаваць, а не цяпер!

І выгнаў Рамана з суда.

Перастаў ён з таго часу хітрыкамі займацца.

 

## ПАНСКАЯ ЛАСКА

Служыў у аднаго пана ляснік. Добра служыў, вераю і праўдаю, як кажуць. Пан гэта бачыў. Расчуліўся ён аднаго разу і кажа лесніку:

— Люблю я цябе, мой верны слуга. І буду за гэта трымаць я цябе і карміць да самай тваёй смерці.

Ну, а ляснік-то добра ведаў свайго пана. Вось ён і кажа:

— Э, пане, не крыўдуй, але я адкажу табе на гэта прыказкаю: панская ласка, жончын язык ды пасынкава любоў да бацькі-айчыма — аднаго варты.

— Няпраўда! Мая ласка шчырая і непарушная.

— Ну што ж,— кажа ляснік.— Пажывём — пабачым.

Назаўтра ўкраў ён у пана гусака і кажа жонцы:

— Звары, толькі каб ніхто не бачыў...
— Дзе ты ўзяў яго? — пытаецца жонка.
— Украў у пана. Толькі — ша! — ні слова нікому.

Зварыла жонка гусака. Сама са сваім сынам наелася, мужыка накарміла і пайшла ў панскі двор куму пераведаць. Сядзіць там у яе, балакае ды ўсё ваду папівае.

— Што ж гэта, кумка, ты такое ела, што так на ваду накінулася?

Муляецца госця, маўчыць.

— Цікава,— дзівіцца кума.— Ты ж ад мяне ніколі праўды не хавала. Нядобра, кумка.

— Ну што ж,— кажа госця,— скажу табе праўду, толькі ты, глядзі, нікому ні-ні...

Кума нават пабажылася, што будзе маўчаць як рыба.

А калі даведалася пра такі цікавы сакрэт, то ў той жа дзень пабегла да другой кумы. А тая — да трэцяй. Трэцяя — да чацвёртай. А чацвёртая была злосная на лесніка і расказала ўсё пану.

Пан палічыў гусей — праўда, не хапае аднаго гусака. Узлаваўся ён на лесніка, аж калоціць яго. Паклікаў ён свайго вернага слугу-лесніка да сябе і кажа:

— Павешу я цябе!

Усміхнуўся ляснік горка:

— Вельмі ж скора, пане, ты забыўся пра сваю ласку.

— Да д'ябла ласку,— крычыць пан.— Павешу!

— Добра, пане,— згаджаецца ляснік.— Дазволь толькі мне схадзіць дахаты. Там у мяне трохі грошай ёсцека. Падзялю іх жонцы і пасынку.

Пан дазволіў і нават сам пайшоў з леснікoм: каб той, чаго добрага, не збег куды.

Расклаў ляснік свае грошы на тры кучкі і кажа:

— Гэта жонцы, гэта пасынку, а трэцяя таму, хто мяне вешаць будзе.

— Навошта, бацька, каму чужому грошы аддаваць. Дай іх лепш мне, я цябе павешу,— кажа пасынак.

Паглядзеў ляснік на пана і кажа:

— Ну, пане, не мая праўда? Усё выйшла так, як я казаў. Я табе шчыра служыў, не раз цябе на паляванні ад мядзведзя ратаваў, а ты мяне за нейкага аднаго гусака павесіць хочаш. Вось якая твая ласка!



## САПРАЎДНЫ ДУРАНЬ

Жылі тры браты: два разумныя, а трэці — дурань. Разумныя працавалі, вялі гаспадарку, а дурань да работы не меў ахвоты: ляжаў на печы, выграваў плечы.

Паехалі аднойчы разумныя браты араць, а жонкам сказалі:

— У поўдзень прынясіце нам абед.

Згатавалі жонкі абед і кажуць дурню:

— Чаго ты, гультаіна, прыліп да печы? Хоць бы ты абед занёс братам. Тыя, ні свет ні зара ўстаўшы, працуюць, а ты толькі бакі адлежваеш.

— Адчапіцеся! — адмахваецца дурань.— Нясіце самі.

Пабралі братавы дзеркачы ды сілаю сагналі дурня з печы. Далі яму бохан хлеба, гаршчок капусты і гаршчок кашы ды выправілі ў поле.

Ідзе дурань, варон лічыць. Надакучыла лічыць варон, пачаў навокал азірацца. Бачыць —

ідзе за ім яго цень. Дурань падумаў, што гэта злодзей крадзецца, хоча абед адабраць.

— Чаго ты прыстаў да мяне? — закрычаў дурань на цень.— Адчапіся! А то як смальну гаршком, дык табе і канцы будуць!

Пайшоў дурань далей. Азірнуўся — цень не адстае. «Трэба ўцякаць ад гэтага злодзея»,— думае дурань. Кінуўся ён бегчы. Бег, бег, змарыўся. Паглядзеў назад, а злодзей тут... Узлаваўся дурань ды запусціў у цень гаршком з капустаю. А сам стаіць і глядзіць, што будзе. Цень таксама стаіць.

— Ага! — закрычаў дурань ад радасці.— Казаў табе: «Адчапіся, а то канцы зраблю!»

Пайшоў дурань далей. Цень зноў ідзе за ім.

— Ах, каб ты выхвараў — ты яшчэ жыў?! — закрычаў дурань.— Вось жа табе!

І запусціў у цень гаршком з кашаю. А сам пабег. Прабег трохі ды парашыў праверыць, ці забіў злодзея. Азірнуўся, а ён тут...

— Дык табе мала двух гаршкоў, нягоднік! На ж табе яшчэ ў прыдачу!

Размахнуўся дурань ды стукнуў злодзея боханам хлеба. А сам зноў пабег далей. Аж глядзіць праз нейкі час — і цень за ім бяжыць. Бачыць дурань: жывучы злодзей трапіўся, нічым не заб'еш. Напужаўся ён, нарабіў крыку:

— Гвалт! Ратуйце!

Пачулі браты, прыбеглі на дапамогу.

— Чаго ты крычыш? — пытаюцца.

— Ды вось нейкі злодзей прычапіўся... Я яго і прасіў, і гаршкамі біў — не адстае!

— Ах ты, дурань! — смяюцца браты.— Гэта ж твой цень, а не злодзей!

— А чаго ж ён бег за мною?

— Бо ты бег, дык і цень бег.

Палаялі браты дурня, што гаршкі пабіў, і пайшлі дамоў абедаць. А яму загадалі:

— Пасі коней, адганяй аваднёў.

Узяў дурань галінку і пачаў аваднёў адганяць. Згоніць іх, а яны зноў садзяцца.

— Пачакайце ж, праклятыя,— злуецца дурань,— я вам пакажу!

Высек ён дубінку. І як толькі сядзе авадзень на каня, дурань трах яго дубінкаю!

Біў, біў аваднёў і пазабіваў коней.

«Ну, гэта яны наеліся,— думае дурань,— і спаць палеглі. Адпачну і я трохі».

Вярнуліся браты. Пабудзілі дурня.

— Дзе коні? — пытаюцца.

— Ды вунь, у кустах, спяць.

— А ты аваднёў адганяў?

— А няўжо ж не! — адказвае дурань.— Як пазабіваў аваднёў, дык коні адразу супакоіліся і паснулі.

Пайшлі браты па коней, глядзяць, а тыя і ногі выпруцілі. Пабедавалі яны ды вярнуліся дахаты. Дома напалі на жонак:

— Навошта вы нам дурня паслалі? Ён жа і абеду не данёс, і коней са свету звёў. Што мы цяпер рабіць будзем без коней?

Думалі-думалі браты, што ім рабіць, і парашылі ісці ў лес дровы секчы — грошы на коней зарабляць. Узялі з сабою і дурня: там ён шкоды не наробіць.

Браты сякуць добрыя дровы, а дурань да гнілога пня прычапіўся. Выкапаў пень, а пад ім цэлы кацёл грошай...

Убачылі разумныя браты кацёл грошай, зарадаваліся. Насыпалі поўныя кішэні, ды і палавіны не забралі.

— Ідзі ты,— кажуць дурню,— дахаты па



мех. А мы тут застанемся грошы вартаваць.

Выйшаў дурань з лесу і забыўся, па што яго браты паслалі. Вярнуўся назад і пытаецца:

— Браткі, па што вы мяне паслалі?

— Па мех! — кажуць браты.— А каб ты больш не забываўся, дык ідзі ды ўсё гавары: «Мех, мех...»

Ідзе дурань і мармыча сам сабе: «Мех, мех, мех...» У дарозе апанавалі яго сабакі. Дурань гудзе пад нос: «Мех, мех, мех...» А сабакі так і круцяцца каля ног, за лыткі хапаюць.

— Ах, каб вас ваўкі з'елі! — закрычаў дурань на сабак і кінуўся наўцёкі.

Уцёк сяк-так ад сабак ды зноў забыўся, па што ідзе. Вярнуўся назад:

— Браткі, па што вы мяне паслалі?

— Па мех, дурань ты!

— Гэта ж мяне,— кажа дурань,— сабакі апанавалі, дык я пачаў на іх крычаць і забыўся, па што ішоў.

— Дурань ты! — адказваюць браты.— Трэба было ўзяць палку ды таго-сяго па баках, таго-сяго па зубах... Не хадзіце, брахуны, па шляхах, не пужайце людзей!

Узяў дурань добрую палку і пайшоў па мех. Сустракае па дарозе папоў і дзякоў.

— Куды вядзе гэтая дарога? — пытаюцца папы і дзякі ў дурня.

А дурань у адказ:

— Сюды мех, туды мех і туды мех...

Папы і дзякі падумалі, што ён смяецца з іх. Накінуліся на дурня:

— Мы ж табе пакажам зараз і мех і смех!

А дурань як махне палкаю — таму па баках, таму па зубах...

— Не хадзіце,— крычыць,— брахуны, па шляхах, не пужайце людзей!

Паразганяў папоў і дзякоў ды зноў забыўся, па што ідзе. Вярнуўся назад:

— Браткі, па што вы мяне паслалі?

Бачаць браты, што з дурнем кашы не зварыш, плюнулі і пайшлі самі па мех.

Недарэмна ж кажуць: «Пашлі дурнога, а за ім другога».



## РАЗЫШОЎСЯ, ЯК ЗАЕЧАЕ САЛА

Адзін пан вельмі любіў хваліцца. Не было таго дня, каб ён не прылгаў.

Аднаго разу паехаў ён да свайго далёкага сябра. На станцыі наняў фурманку.

Едзе пан, маўчыць. Раптам бачыць: дарогу перабег заяц.

Пан пытаецца ў фурмана:

— А што, ёсць на гэтым зайцы сала?

— Адкуль, пан, у яго тое сала!

— Дрэнныя ж у вас зайцы. Вось у маім маёнтку зайцы водзяцца, дык сала на іх на цэлы корх[1] будзе.

— Ой, пане,— круціць галавою фурман,— дзе ты бачыў такіх зайцоў? Ці не схлусіў ты?

— Не,— цвёрда стаіць пан на сваім.

[1] К о р х — далонь.

— Тут, пане, на дарозе скора брод будзе,— кажа фурман.— Дык у нас хто хлусіць, то ўсе ў тым бродзе топяцца.

Пан спалохаўся:

— Праўда?

— Калі кажу, дык праўда.

— А далёка да таго броду?

— Не, ужо недалёка.

— Ну, то я, можа, трохі і прыхлусіў,— мякчэе пан.— Не на корх, а на тры пальцы.

— А можа, на адзін?

— А далёка брод?

— Ды вот скора і брод...

— Ну, то няхай будзе на адзін.

— А можа, пане, і на адзін мнагавата? — не адстае фурман.

— А брод далёка?

— Ды от-от перад намі.

— Э, чорт з ім, з тым салам. Можа, і на адзін не будзе,— здаўся пан.

Праехалі яшчэ з паўвярсты.

— Ну, дзе ж твой брод? — пытаецца пан у фурмана.

— Няма.

— А дзе ж ён падзеўся?

— Разышоўся, як сала на панскіх зайцах.




## СКУПЫ ПОП

Сабраўся поп з парабкам ехаць па сена. Парабак кажа:

— Дарога, бацюшка, няблізкая: можа, што з яды возьмем?

— Нічога,— кажа поп,— мы скора вернемся. Ты пра яду толькі і думаеш.

Парабак тым часам паклаў цішком кавалак хлеба ў кішэнь: няхай будзе ў запасе.

Ну, пакуль даехалі да сенажаці, пакуль воз наклалі, дык і вечар на двары.

Едуць назад. Парабак шчыпле патрошку свой хлеб у кішэні ды жуе памаленьку. А папу ўжо аж млосна ад голаду.

— Што ты, Іван, ясі? — пытаецца ён у парабка.

— Сена, бацюшка. Што ж яшчэ я магу есці?

— А смачнае яно?

— Нішто. Жую.

Пачаў і поп жаваць сена. Ды адразу зморшчыўся, як смарчок. «Не,— думае ён,— гэта толькі дурны парабак можа есці такую гаркату».

Але, як кажуць: дзе коратка, там і рвецца. Трапіў воз у калдобіну. Конь ірвануў з усяе сілы і парваў гужы.

Што ж рабіць?

— Ідзі, Іван,— кажа поп,— у сяло, пазыч у каго хамут.

Пайшоў парабак у сяло. Зайшоў у першую хату і расказаў, што з бацюшкам у дарозе здарылася і які ён галодны — аж сена, небарака, жуе. Забедавала гаспадыня, паслала мужыка з хамутом да папа, а сама ўзялася вячэру гатаваць.

— Але ж ты, гаспадынька, не ведаеш, які натурысты наш бацюшка,— кажа парабак.

— А што ж у яго за натура?

— А такая: калі ён моўчкі сядзе за стол, то ўсё будзе добра. А калі скажа «дзякую», то лепш хутчэй прыбіраць са стала вячэру, бо ён тут жа ўсё дагары нагамі пераверне. Вось які ён натурысты!

Прыязджае неўзабаве поп. Гаспадыня просіць яго за стол з дарогі.

— Дзякую,— кажа поп, а сам аблізваецца.

«Ну, значыць, занатурыўся»,— падумала гаспадыня, схапіла са стала вячэру ды на прыпечак.



## КСЁНДЗ У РАІ

Адзін ксёндз вельмі хацеў святым стаць. Што ён ні рабіў, як ні стараўся! Сам цэлымі днямі маліўся і прыхаджанам не даваў супакою. Але найбольш цярпеў праз гэта ксяндзоўскі парабак: ведама, яму і дома рабі, і ў касцёле прыслужвай. І ўсё за адну плату.

Надакучыла парабку такая марока. І надумаўся ён набожнага ксяндза правучыць.

Пайшоў на рэчку. Налавіў торбу ракаў. Папрыклейваў воскам да іх свечкі. І калі добра сцямнела, пусціў ракаў з запаленымі свечкамі ў сад. Поўзаюць ракі па садзе. Гараць свечкі ў траве, як зоркі.

Падышоў парабак да акна, пастукаў у шыбу.

— Хто там? — пытаецца ксёндз.

— Анёл з неба.

Зарадаваўся ксёндз, пачуўшы голас самога анёла.

— А што пану анёлу трэба?

— Ды вось прыйшоў забраць пана ксяндза ў рай на неба...

Адчыніў ксёндз акно. Зірнуў, аж бачыць: у садзе свечкі гараць. Такое хараство, як у раі. І ксяндзу вельмі ж захацелася хутчэй трапіць у гэты рай.

Парабак падставіў мех.

— Лезь праз акно, святы ксенджа,— сказаў анёл-парабак.

— Але ж я, пане анёл, у старой кашулі.

— Нічога. Для раю лепшай вопраткі і не трэба.

Ну, ксёндз так і шуснуў у падстаўлены мех.

Завязаў парабак мех вяроўкаю, ускінуў на плечы і панёс у свінушнік. Там укінуў набожнага ксяндза да свіней і добра падпёр дзверы. А сам пайшоў спаць.

Прыходзіць назаўтра наймічка свіней карміць. Бачыць: скача па свінушніку жывы мех. Напалохалася яна, нарабіла крыку.

Збегліся людзі. Развязалі мех. Аж там іх ксёндз сядзіць, ад страху і холаду калоціцца.

— Як жа гэта, пане ксенджа, ты трапіў сюды? — дзівяцца людзі.

Маўчыць ксёндз як вады ў рот набраўшы. А парабак ледзь ад смеху не падае. «Чым тут не рай,— думае,— для набожнага ксяндза!»





## АМІН, КАРОЎКА, АМІН!

Украў поп у адной жанчыны карову і завёў у свой хлеў.

Агледзелася жанчына, забедавала: што рабіць? Адна кароўка была і тая прапала.

— Не шкадуй, маладзіца, грошай,— раіць поп,— закажы малебен, можа, дасць бог, знойдзецца кароўка...

Прадала жанчына што мела, сабрала грошай і заказала папу малебен.

Зайздросна стала дзяку, што поп і карову ўкраў, і яшчэ грошы на малебен у бабы вымантачыў. Прыйшоў ён да папа і кажа:

— Падзяліся, бацюшка...

— Не,— адказвае яму поп.— Гэта мой даход!

Вядома, папоўскае вока, што воўчае горла. У папа, кажуць, дзве рукі: адна, што хрысціць, другая, што бярэ, а той, што дае,— няма.

Пачаўся малебен. Злосны дзяк зацягнуў на ўсю царкву:

Маладзіца маладая,  
Твая кароўка жывая.  
У паповым хляве  
Раве-е-е!..

Бачыць поп, што нявыкруткі: трэба дзяліцца з дзяком. Ён і грымнуў у адказ:

Маўчы лепш, дзяча,  
Будзе і табе ўдача:  
Падзелім каравіну  
Напалавіну-у-у!..

Пачуў гэта дзяк, узрадаваўся і заспяваў весела:

Святы божа, святы божы сын!  
Памяні бабіну кароўку... Амі-ін!





## ЯК ПОП МАЛІЎСЯ

Пачалі поп і дзяк у нядзелю абедню служыць. Поп кадзілам махае, дзяк на кліросе спявае. А слухаць няма каму — царква пустая.

Вось поп і зацягнуў да дзяка басам:

— Дзяча, дзяча, стары няўдача! Годзе табе казлом бляяць, годзе святых пужаць! Палезь ты, дзяча, на званіцу высокую, паглядзі на дарогу далёкую: можа, хто ў царкву ідзе, можа, што папу нясе.

Палез дзяк на званіцу, паглядзеў і адказвае:

— Бачу, бацюшка, бачу добрую ўдачу: у царкву баба Антоля ідзе, пад пахаю пеўня нясе!

Поп радасна замахаў кадзілам:

— Падай, госпадзі-і-і!

Памаліўся трохі поп за пеўня ды зноў да дзяка:

— Дзяча, дзяча, стары няўдача! Годзе табе казлом бляяць, годзе святых пужаць! Палезь ты,

дзяча, на званіцу высокую, паглядзі на дарогу далёкую: можа, хто ў царкву ідзе, можа, што папу нясе.

Палез дзяк на званіцу, паглядзеў і адказвае:

— Бачу, бацюшка, бачу благую ўдачу: Антолін мужык ідзе, сам сабе пад нос гудзе, нясе ён дубіну на папову спіну!

Поп спалохана замахаў кадзілам:

— Табе, госпадзі-і-і!



## ШТУКАР КЛІМКА

Жыў некалі на свеце бедны мужык Клімка. На ўсякія штукі быў ён здатны. Выдумшчык, якога пашукаць — не знойдзеш. Часта ўспамінаюць яго людзі з вясёлаю ўсмешкаю і цяпер.

Вось што пра яго расказваюць.

Знайшоў аднаго разу Клімка на дарозе старое стрэмя. Прынёс дадому і павесіў на варотах. «Падковы на шчасце,— думае,— у мяне няма, дык няхай хоць гэтае стрэмя вісіць».

Прыехаў неўзабаве пан у сяло. Вусаты, фанабэрысты. Крукам носа не дастанеш. Убачыў стрэмя на варотах. «Эге,— думае,— відаць, тут рымар жыве. Закажу яму новае сядло».

Зайшоў пан да Клімкі.

— Ты хто — рымар? — пытаецца.

Падумаў Клімка: сказаць, што ён не рымар, дык навошта стрэмя на вароты павесіў? Эх, было не было!

— Але, пане,— кажа Клімка.— Я — рымар.

— То ці не можаш ты зрабіць мне новае сядло?

— А чаму ж не. Магу. Толькі дарага будзе каштаваць.

Пан быў скупы. Але на новае сядло грошай не пашкадаваў. Згадзіўся на тую цану, якую Клімка запрасіў.

— Але ж, пане,— кажа Клімка,— я такі майстар, што грошы за работу бяру наперад.

Пан і на гэта згадзіўся. Заплаціў Клімку за сядло, даведаўся, калі будзе гатова, і паехаў сабе далей. А Клімка з панскімі грашыма ў карчму падаўся, а пра сядло і не думае.

Мінуў час, прыязджае пан да Клімкі.

— Ну, як,— пытаецца,— зрабіў сядло?

— Якое сядло, пане?

— Ды тое, за якое ты ў мяне наперад грошы ўзяў?

— Авой, вой! — дзівіцца Клімка.— Я не ўмею нават лапцей сплесці, не тое што сёдлы рабіць. Няйначай табе, пане, прыснілася... Відаць, занадта ўчора наеўся перад сном. Гэта бывае...

Пан туды-сюды — не аддае Клімка ні сядла, ні грошай.

— Ну, тады апранайся,— крычыць пан,— паедзем на суд!

Глянуў Клімка на свае босыя ногі.

— Ды ў мяне, пане,— кажа,— няма чаго абуць. Што ж я — босы на суд паеду? Суддзя мяне такога і на парог не пусціць.

— Ах, д'яблы на цябе! Фурман,— паклікаў пан,— прынясі рымару з карэты мае дарожныя боты!

Прынёс фурман боты.

— Ну, абувайся, ды хутчэй! — падганяе пан Клімку.

— Што ж,— кажа Клімка,— я ў адных ботах паеду? На дварэ вунь не цёпла.

— А нех цябе д'яблы возьмуць! — злуецца пан.— Гэй, фурман, нясі яму маё футра!

Абуўся Клімка, апрануўся па-панску. Сеў пан у карэту, а Клімку загадаў пяшком за ім бегчы.

— Што я, пане, сабака, каб пяшком за карэтаю бегчы? — не згаджаецца Клімка.

— Не пасаджу ж я цябе побач! — моршчыцца пан.

— Навошта побач! Дзе гэта хто бачыў, каб просты мужык побач з панам сядзеў! Дай мне, пане, свайго прыпражнога, я вярхом паеду.

Пакрычаў, пакрычаў пан і загадаў фурману адпрэгчы прыпражнога.

Сеў Клімка на прыпражнога і паехаў услед за панам.

Прыязджаюць на суд. Пан расказаў суддзі, як Клімка ашукаў яго — і сядла не зрабіў, і грошы не аддае.

— Ну,— кажа суддзя да Клімкі,— што ты скажаш на гэта? Чаму пану грошы не аддаеш?

— Якія грошы, пан суддзя? — паціскае плячыма Клімка.— Ніякіх грошай я ў яго не браў. Можа, пан зараз скажа, што і боты яго на мне?

— Вядома, мае боты! — не сцярпеў пан.

— Ну вось бачыш, пан суддзя. Можа, ён скажа, што і гэтае футра яго?

— А чыё ж,— злуецца пан,— маё футра!

— Ну, не казаў я, што пан хлусіць,— кажа Клімка.— Можа, ён скажа, што я і на яго кані прыехаў?

Пан аж падскочыў. Аж вусы яго заварушыліся.

— А нех цябе д’яблы! А чый жа конь, калі не мой?!

— Вось бачыш, пан суддзя: ён ужо і майго каня за свайго прызнае. Ці можна ж яму верыць пасля гэтага?

Падумаў суддзя, паківаў галавою і кажа пану:

— Відаць, такі і праўда, што ты хлусіш. Таму не магу я нічога прысудзіць табе.

Пачуўшы гэта, пан ледзь не самлеў, а Клімка сеў сабе на панскага каня і паехаў дахаты ў панскім футры і панскіх ботах.

Прадаў Клімка панскага каня, жыве і бяды не знае. А пан аж учарнеў ад злосці. Усё думае, як Клімку адпомсціць.

Пайшоў аднаго разу Клімка ў мястэчка. Ідзе па вуліцы, шыльды разглядвае. На адной хамут і падсядзёлак намаляваны — значыць, тут рымар жыве. На другой булкі і абаранкі — значыць, пекар. А вось і пляшка з чаркаю — значыць, шынок.

Раптам бачыць Клімка — ідзе насустрач пан.

Не хацелася яму з панам сустрэцца. Завярнуўся ён ды ў шынок. Заказаў гарэлкі, заплаціў і на прылаўку пакінуў.

Тым часам шусь і пан у шынок. Убачыў Клімку.

— А,— крычыць,— ты тут, ашуканец! Пачакай жа, я з табою разлічуся!

Спужаўся Клімка, але выгляду не падае. Зняў з галавы старую саламяную шапку, патрос ёю перад шынкаром і пытаецца:

— Заплачана?

— Заплачана,— адказвае шынкар.— Ідзі сабе, чалавеча, здаровенькі дахаты.

Глядзіць пан і вачам не верыць: Клімка бярэ

гарэлку і не плаціць за яе! Толькі старою саламянаю шапкаю памахвае — і ўсё.

Выйшаў пан услед за Клімкам з шынка і пытаецца ў яго:

— Чаму гэта шынкар з цябе грошай за гарэлку не ўзяў?

— А-а,— кажа Клімка.— Гэта, бачыш, у мяне шапка такая чарадзейная. Мне яе адзін вядзьмар даў. Цяпер я магу ў любым шынку што хочаш набраць, і шапка за мяне заплаціць.

Тут пан аж закалаціўся ад зайздрасці.

«Вось жа шчасце якое дурному мужыку трапілася!» — думае.

— Гэй, Клімка,— кажа пан,— прадай мне сваю шапку.

— А чаму не прадаць? Дасі добрыя грошы — прадам.

— Колькі хочаш?

— Сто рублёў.

— Навошта так дорага браць за старую шапку?

— Дык гэта ж не простая шапка!

Таргаваўся, таргаваўся скупы пан з Клімкам і купіў-такі ў яго тую старую саламяную шапку за пяцьдзесят рублёў.

Пайшоў Клімка дахаты прыпяваючы, а пан надзеў чарадзейную шапку ды — назад у шынок. Заказаў там багаты абед, паклікаў гасцей і давай піць-гуляць. Дзівяцца госці, што пан нейкую парваную шапку ўшчапіў на галаву. Ды кожны па-свойму і весяліцца, і розум траціць,— думаюць. Напіліся госці, наеліся.

— Цяпер,— кажа пан,— глядзіце, як я разлічвацца буду.

Падышоў ён да шынкара, зняў шапку, памахаў ёю перад прылаўкам і пытаецца:

— Заплачана?

— Не,— матае галавою шынкар.— Калі мне хто плаціў? З цябе, пане, тры чырвонцы за банкет...

— Якія чырвонцы! — дзівіцца пан.— За мяне гэтая саламяная шапка заплаціла. Яна — чарадзейная!

Бачыць шынкар: звар'яцеў пан. Паклікаў ён урадніка. Той звязаў п'янага пана вяроўкаю і павёз у вар'яцкі дом. А напалоханыя госці разбегліся хто куды.

Ачухаўся пан і паехаў да Клімкі. «Ну,— думае,— цяпер ён мяне не ашукае. Я яго прыкончу!»

Убачыў Клімка пана. Куды дзявацца? Лёг ён на тапчан і прыкінуўся мёртвым.

Заходзіць пан у хату. Бачыць — ляжыць на тапчане Клімка, рукі на грудзях згарнуўшы.

— Ах,— бядуе пан,— шкада, што не застаў я цябе жывым. Даў бы я табе за тваю шапку-ашуканку!

Пакруціўся злосны пан па хаце, бачыць: на стале качалка ляжыць, што бялізну качаюць. «Спаганю злосць хоць на мёртвым»,— падумаў пан. Схапіў качалку ды трах Клімку па жываце! А Клімка — скок з тапчана! Стаіць перад панам, як нічога і не было.

— Вось дзякуй, панок,— кажа,— што ты ажывіў мяне!

Тут у пана і вочы на лоб палезлі.

— Выходзіць, твая качалка мёртвых ажыўляе?

— Але, але, пане. Яна ў мяне такая — каго хочаш ажывіць. Але пра гэта ведаем толькі я ды жонка мая.

— Дык чаму ж цябе жонка не ажывіла?

— Яна, пане, на полі робіць — бульбу матычыць.

Як пачуў пра гэта пан, дык і пра злосць сваю забыўся.

— Прадай, Клімка, мне сваю чарадзейную качалку,— просіць пан.

— А чаму не прадаць,— кажа Клімка,— добраму чалавеку ды за добрыя грошы.

Заплаціў пан за качалку добрыя грошы ды рушыў дахаты. «Вось,— радуецца,— смерць у маіх руках: каго захачу, таго і ажыўлю!»

Тым часам памерла ў цара дачка. Дачуўся пра гэта пан, сеў на каня і памчаўся ў царскі палац царскую дачку ажыўляць.

Цар зарадаваўся.

— Калі ажывіш маю дачку,— кажа пану,— аддам табе паўцарства.

— Добра,— згаджаецца пан.— Толькі да мёртвай я пайду адзін. Ніхто не павінен бачыць, як я ажыўляю. Гэта мой сакрэт.

Ну, так і зрабілі. Пайшоў пан у пакой да мёртвай, а цікаўны цар паслаў слугу, каб той праз шчыліну ў дзвярах падгледзеў, што будзе пан рабіць.

Зачыніў пан за сабою дзверы, дастаў з рукава чарадзейную качалку ды — трах! — па царэўне. Ляжыць царэўна хоць бы што.

«Эге,— думае пан,— відаць, слаба ўдарыў».

Стукнуў яшчэ раз — не ўстае царэўна.

«Ах,— узлаваўся пан,— дык ты, нягодная, чарадзейнай качалкі не прызнаеш!..»

І давай дубасіць царэўну з усяе сілы.

Прыбег слуга да цара.

— Так і так,— кажа,— гэты пан не ажыўляе царэўну, а дубасіць яе нейкаю палкаю, дзе папала і па чым папала. Усю на цеста змясіў...

Загадаў цар схапіць пана-разбойніка. Прыбеглі царскія стражнікі ў пакой, дзе царэўна ляжала. Бачыць пан — бяда яго чакае, а не паўцарства. Выскачыў ён праз акно, ускочыў на каня ды ходу. Кінуліся стражнікі за ім, але так і не дагналі.

«Ну і ашуканец гэты Клімка! — думае пан.— Як жа мне яго перахітрыць? Ага! Нашлю на яго сваю жонку...»

Паклікаў ён да сябе Клімку і кажа:

— Калі ты такі штукар, то ўкрадзь маю паню...

І зарагатаў на ўвесь маёнтак. Бо, трэба сказаць, пані была баба ліхая. Усіх слуг сваіх біла. Нават сам пан яе як агню баяўся.

— Добра,— згаджаецца Клімка.— Украду я тваю паню. Але... пан жа сам добра ведае: дарэмна і каза не скача...

— А д'яблы на цябе! — усклікнуў пан.— Гэтак ты мяне скора да торбы давядзеш.

— Нічога, пане, жыў будзеш.

Даў пан Клімку задатак, а сам рукі паціраe. «Пагляджу,— маўляў,— як ты маю ліхую паню ўкрадзеш!»

Думаў, думаў Клімка, як паню ўкрасці, і надумаў-такі. Узяў панскія боты і пайшоў на тую дарогу, па якой пані на пагулянку ездзіла. Палажыў адзін бот на дарозе недалёка ад маёнтка. Потым прайшоў з вярсту і палажыў другі бот. А сам сеў за кустом і чакае.

Настаў час, і пані выехала з фурманом на пагулянку. Даехалі да першага бота.

— Глядзі, панечка,— кажа фурман,— гэта ж бот нашага пана. Я падыму яго.

— А навошта пану адзін бот? — адказвае пані.— Паедзем далей.

Праехалі трохі, бачаць, ляжыць другі бот — якраз да пáры.

— Шкада,— кажа пані,— што мы таго бота не ўзялі.

— То я збегаю,— кажа фурман.

— Добра. Бяжы. Я тут цябе пачакаю.

Вярнуўся фурман па бот, а Клімка выскачыў з-за куста, сеў на фурманскія козлы і пагнаў коней. Пані ў крык, нагамі стукае, кулакамі махае. Ды Клімка яе не слухае. Гнаў ён, гнаў коней і прыгнаў іх у самае балота, дзе жылі чэрці.

Выскачылі чэрці з балота, напалі на Клімку:

— Ты такі ды сякі, навошта нас турбуеш?

— Ды вось,— кажа Клімка,— прывёз вам паню прадаваць. Яна такая, што любы чорт не дакажа...

І так расхваліў Клімка паню, што чэрці з ахвотаю купілі яе.

Даведаўся пан, што пані не вярнулася з пагулянкі. Пасылае слугу па Клімку.

Прыходзіць слуга да Клімкі, а той храпе на печы, аж вецер свішча.

— Клімка, а Клімка! — будзіць яго слуга.— Ідзі да пана.

— Га? — пазяхае Клімка.— Да якога яшчэ там пана? Я спаць хачу.

— Чуеш, цябе пан кліча.

— Ідзі ты да д'ябла са сваім панам! — адмахваецца Клімка.— Дай чалавеку паспаць з дарогі.

— У якой жа гэта дарозе ты быў? — дзівіцца слуга.

— У чартоўскім балоце быў.

— Чаго?

— Паню вазіў чарцям прадаваць.

Павярнуўся Клімка на другі бок і зноў захроп.

А слуга кінуўся да пана і расказаў яму, што пачуў ад Клімкі.

Напалохаўся пан ды сам пабег да Клімкі.

— Клімка,— пытаецца пан,— дзе ты маю паню падзеў?

— Прадаў, пане.

— Каму?

— Чарцям.

— Як гэта чарцям? Ці ў сваім ты розуме?

— Ты ж, пане, сам захацеў, каб я яе ўкраў. А навошта яна мне? Такая ліхая баба толькі чарцям да па́ры. Будзе там, у пекле, смалу вазіць.

Бачыць пан — кепскія справы. Пачаў ён прасіцца ў Клімкі, каб вярнуў яму паню з пекла.

— Цяжка, пане, гэта зрабіць,— круціць галавою Клімка.— Не такія чэрці добранькія, каб сваё дабро каму аддаваць. Але паспрабую. Так і быць.

— Паспрабуй, Клімка, паспрабуй. Я ў даўгу не застануся.

Узяў Клімка бубен з бразготкамі і пайшоў на балота. А там як загрукае ў свой бубен, як наробіць шуму! Чарцям аж моташна стала.

— Хто гэта разбушаваўся над нашым пеклам? — дзівіцца старшы чорт Люцыпар.— Ад яго шуму ў мяне галава баліць.

Паклікаў ён пасыльнага — шустрага чорта Рагача.

— Скокні, браток, наверх, глянь, хто там наша пекла калоціць.

Выскачыў чорт Рагач з пекла, бачыць: аж гэта Клімка ў бубен смаліць ды брыдкія прыпеўкі пра чарцей гарлапаніць.

— Ой, Клімка, пакінь шумець,— просіць чорт.— А то ў нашага начальніка, пана Люцыпара, галава трашчыць.

— Не,— кажа Клімка,— не пакіну.

— Вазьмі што хочаш, але пакінь.

— Ну, добра,— згаджаецца Клімка.— Вярніце мне маю паню, тады будзе ціха.

Пабег чорт Рагач да Люцыпара.

— Так і так,— кажа,— гэта буян Клімка расхадзіўся — патрабуе назад сваю паню.

Шкада Люцыпару аддаваць паню: вельмі ж добра яна смалу возіць да катлоў, дзе чэрці грэшнікаў падсмальваюць. Даў ён чорту жалезную палку і кажа:

— Пайдзі з Клімкам у заклад: калі ён падкіне гэтую палку вышэй за цябе, то вернем яму паню. А калі не, то не.

Вярнуўся пасыльны чорт да Клімкі і перадаў наказ свайго начальніка.

— Добра,— кажа Клімка.— Кідай ты першы сваю чартоўскую палку.

Шпурнуў чорт Рагач жалезную палку і аж за хмары закінуў.

Вярнулася палка назад. Узяў яе Клімка ў рукі — цяжкая, ліха на яе! Трымае ён палку, ды ўсё на сонца паглядае.

— Чаго ты, Клімка, на сонца вочы вылупіў? — пытаецца чорт.

— Ды, бачыш, там мой брат кавалём працуе. Дык я выглядаю, дзе яго кузня. Закіну туды гэтую палку, можа, яна яму на што спатрэбіцца.

— Ай, ай! — заенчыў чорт Рагач.— Не кідай, Клімка, яму нашу палку. Мы ёю сваё пекла падпіраем.

Адабраў чорт у Клімкі жалезную палку ды памчаўся да Люцыпара парады прасіць.

«Што ж рабіць? — думае Люцыпар.— Прычапіўся да нас гэты Клімка як смала».

— Добра,— кажа ён пасыльнаму,— дай яму другую задачу. Няхай абнясе каня вакол нашага балота. Калі і гэта не паможа, тады давядзецца з паняю расстацца.

Прыбягае чорт Рагач да Клімкі.

— Вунь,— кажа,— конь пасецца. Хто з нас хутчэй абнясе яго на плячах вакол балота, таго і пані будзе.

— Ну, давай, пакажы, які ў цябе чартоўскі спрыт,— згаджаецца Клімка.

Ускінуў чорт Рагач каня на плечы і памчаўся. Толькі віхор закружыўся. Абабег вакол балота, задыхаўся, язык высалапіў.

— Цяпер ты нясі,— кажа Клімку.

— Добра. Але на плячах мне няма чаго яго несці: ён жа зусім лёгкі. Я панясу яго паміж ног.

— Нясі, як хочаш, абы абнёс.

Сеў Клімка на каня, свіснуў, гікнуў і памчаўся наўгалоп.

Чорт Рагач і аддыхацца не паспеў, як Клімка ўжо тут. Саскочыў з каня, смяецца: ані не змарыўся.

Заплакаў ад жалю чорт Рагач і пабег назад у пекла. Чуваць было, як там усё пекла разраўлося.

Ну, што ж, рабіць чарцям няма чаго: выкінулі яны паню з пекла. Глянуў на яе Клімка і аж напалохаўся: худая, змардаваная, уся ў смале. А ціхая стала, слова сказаць баіцца.

Завёў Клімка паню ў двор. Убачыў яе пан і ажно за галаву схапіўся.

— Не,— кажа,— гэта не мая пані. Мая белая, поўная, а гэта Баба Яга — Касцяная Нага! Ты, Клімка, ашукаў мяне. Я табе гэтага не дарую.

Думаў-думаў пан, як Клімку адпомсціць.

І надумаўся на гэты раз утапіць яго ў возеры. Усадзіў Клімку ў мех, завязаў вяроўкаю і панёс у возера тапіць. А Клімка толькі брыкаецца ў мяшку ды крычыць на ўсё горла: «Не ўмею ні чытаць, ні пісаць, хочуць за караля абраць!»

Нёс, нёс пан Клімку, змарыўся. Кінуў ён мех пры дарозе, а сам вярнуўся ў маёнтак паклікаць аканома на дапамогу.

Ляжыць Клімка ў мяшку ды ўсё сваё крычыць: «Не ўмею ні чытаць, ні пісаць, хочуць за караля абраць!»

Ехаў тою дарогаю багаты пан на чацверыку. Пачуў, аб чым Клімка крычыць. «Дурань нейкі,— думае пан,— не хоча каралём стаць! Вось бы мне такое шчасце! Сядзеў бы я тады на каралеўскім троне ды толькі камандаваў бы. А ўсе — і мужыкі і паны — служылі б мне».

Падышоў пан да Клімкі, развязаў мех.

— Давай,— кажа,— чалавеча, я цябе падмяню. Я ўмею і чытаць і пісаць. І хачу каралём стаць...

— Добра, пане,— згадзіўся Клімка.— Скідай сваю панскую вопратку ды лезь у мех.

Крэкчучы, пан сяк-так улез у мех. Клімка адразу ж моцна завязаў мех вяроўкаю.

— Толькі, пане, сядзі ціха ў мяшку,— раіць Клімка.— А то каралеўскія слугі могуць адрачыся ад цябе, крыклівага, ды выбраць каралём каго спакайнейшага.

— О, не,— кажа ўзрадаваны пан.— Я буду сядзець, як мыш пад мятлою, пакуль каралём не стану. А тады пакажу гэтым слугам, хто я ест!

Апрануўся Клімка ў панскае адзенне і паехаў у панскай карэце дахаты.

Тым часам вярнуўся пан з аканомам, паднялі яны мех ды панеслі да возера.



— Нешта пацяжэў наш Клімка,— дзівіцца пан.

— Відаць, заснуў,— кажа аканом.— Сонны чалавек заўсёды цяжэйшым здаецца.

— Што ж, затое соннаму лягчэй будзе каралём стаць,— задаволена ўсміхнуўся пан.

Знайшоў пан на возеры глыбейшае месца і скаціў туды мех. Толькі бурбалкі забулькаталі.

— Ну,— кажа ён,— цяпер, Клімка, тут табе жыць, галавы мне больш не дурыць.

Паехаў назаўтра пан з аканомам на кірмаш. Бачыць: прадае Клімка на кірмашы коней. Пан ледзь з воза не зваліўся. Перахрысціўся і пытаецца:

— Клімка, гэта ты?

— Я, пане.

— Адкуль?

— Як адкуль? Пан жа сам ведае, куды мяне ў мяшку занёс.

— А карэта... коні...— хаўкае пан, не могучы ад дзіва дзіўнага слова вымавіць.

— Э, пане, у падводным каралеўстве не толькі карэты з коньмі на выбар — там золата цэлыя горы наварочаны... Але золата я пакуль што не чапаў. Думаю, другім разам калі з'езджу.

— Не маніш? — калоціцца пан ад зайздрасці.

— Сам жа здаровенькі, бачыш. Калі гэта я маніў?!

— Ой, Клімка, ці не мог бы ты і мяне завесці ў тое падводнае каралеўства?

— І мяне...— просіцца аканом.

— Чаму ж не. Калі ласка! Але, як сам пан ведае, трапіць туды можна толькі ў мяшку.

— Няхай сабе хоць у мяшку,— згадзіўся

пан,— абы хутчэй да золата дапяць. А там я дурань не буду — цэлую карэту насыплю...

— Ты толькі, пане, глядзі, мне маю долю пакінь.

«Пакіну,— думае пан,— фігу на талерцы...»

Завёз Клімка пана з аканомам да возера, усадзіў у мяшкі.

— Я першы пайду ў падводнае каралеўства! — крычыць пан.— А то мой аканом добрая шэльма — ён і там мяне абкрадзе.

Спіхнуў Клімка ў падводнае каралеўства пана, а за ім і яго слугу-шэльму. На гэтым і казка скончылася.



## ЦЯСЛЯР-САМАХВАЛ

Сабраўся адзін стары чалавек будаваць дом. «Сам я ўжо нядоўга пражыву на свеце,— думае,— дык няхай успамінаюць мяне добрым словам і дзеці і ўнукі».

Наняў ён старога цесляра і пачаў выбіраць месца для дома. Аблюбаваў добрае месца на ўзгорку, дзе з даўніх часоў ляжаў вялікі камень.

— Вось тут і будзе стаяць новы дом,— сказаў гаспадар цесляру.

Цясляр аснаваў дом так, што камень якраз застаўся на покуці пад вуглом.

Вывеў стары цясляр зруб, паставіў кроквы, прыбіў латы, прывязаў паплеціны.

Добры дом выходзіць! Радуюцца, гледзячы на новы дом, і гаспадар і цясляр.

І вось калі дом быў ужо траха не гатовы, трапіў аднекуль сюды другі цясляр, маладзейшы. Паглядзеў на дом і пачаў ганіць работу старога

цесляра: і тое не так, і гэта не гэтак... І вуглы быццам крывыя, і камень не на месцы. Так задурыў галаву гаспадару, што той і сам пачаў думаць: «А можа, і праўду кажа гэты малады цясляр».

— А скажы ж ты мне,— пытаецца гаспадар,— дзе і ў каго ты вучыўся цяслярству? Гаворыш ты складна, а ці ўмееш так і рабіць, як гаворыш?

— Э,— махнуў рукою малады цясляр,— няхай вучыцца той, у каго свайго розуму не стае. А я і без навукі добра абыходжуся.

— Ну што ж,— кажа гаспадар,— калі ты такі разумны ды спрытны да цяслярскай работы, то зрабі лепш. Хто ж будзе ад дабра адмаўляцца.

І наняў ён новага цесляра дом дарабляць.

Пачаў гэты цясляр перарабляць тое ды іншае. Ды такога глупства нарабіў, што брыдка і людзям паказаць.

— Зраблю,— кажа цясляр,— перапынак. Замарыўся я на гэтай рабоце. Вельмі ж сапсаваў дом стары цясляр.

Кінуў будоўлю няскончанай і паехаў дахаты.

Тым часам стары чалавек памёр. Застаўся гаспадаром яго сын.

Тут неўзабаве зноў прыехаў малады цясляр.

— Трэба,— кажа,— дом нанава перабудаваць. Іначай нічога не будзе.

Падумаў малады гаспадар і кажа:

— Трэба дык трэба.

Зноў ухапіўся цясляр за работу. Разбурыў старую страху ды зрабіў новую — з рознымі цацкамі, пеўнікамі ды іншымі выкрутасамі.

Ідуць людзі, смяюцца.

— Гэта,— кажуць,— не дом, а пацеха!

Тады цясляр разбурыў сваю страху і зрабіў такую, як была.

Людзі перасталі смяяцца.

Потым цясляр узяўся перарабляць то адну сцяну, то другую, то вымаць падваліны, то прасякаць новыя дзверы. Нарэшце вывернуў з-пад вугла камень, які яму не падабаўся.

Пасля такой перабудовы дом і зусім набок пахіліўся. Вось-вось упадзе. Паставіў цясляр падпоры і кажа маладому гаспадару:

— Тут мала добрага матэрыялу. Трэба навазіць лепшага.

— Трэба дык трэба,— згадзіўся гаспадар.— Шкада ж пакідаць дом недабудаваным.

Пачаў цясляр вазіць лепшы матэрыял. Навазіў цэлую гару.

— Ну, цяпер дом будзе, як лялька,— цешыць цясляр маладога гаспадара.

І зноў ухапіўся за будоўлю. Выме са сцяны бервяно, уставіць новае, паглядзіць — нягожа! І зноў перарабляе сваю работу.

Мудрагеліць цясляр-самахвал, а дом так і стаіць недабудаваны.





## ПОП І ЗЛОДЗЕЙ

Прыйшоў злодзей да папа на споведзь. Накрыў яго поп чорным пакрывалам, прыгнуўся і пачаў спавядаць:

— Чым грэшны, раб божы?

— Ды вось, бацюшка, выгнаў я сёння свінню з твайго гароху. Ці не грэх гэта?

— Які ж тут грэх? — кажа поп.— Наадварот: табе за гэта падзякаваць трэба. А яшчэ чым грэшны?

— Калі я выганяў свінню з гароху, то ўбачыў мядзведзя ў сенцах твайго дома. Ну, я і яго вытурыў. Ці не грэх гэта?

— Не,— кажа поп.— Добра зрабіў. Мядзведзь той мог маю пападдзю загрызці, маіх кароў падушыць. Чым яшчэ грэшны?

— Ды, бацюшка, маю яшчэ адзін грэх...

— Які?

— Ачысціў тваю святую царкву ад шаптуноў...

— І гэта не грэх,— кажа поп.— Шаптуны з нячыстаю сілаю знаюцца. За гэта табе таксама толькі дзякуй скажу. І ўсе грахі ў цябе?

— Усе, бацюшка.

Перахрысціў поп злодзея:

— Адпускаюцца грахі рабу божаму... Як зваць цябе?

— Аўдзей-зладзей.

— ...Аўдзею-зладзею! — праспяваў поп і адпусціў злодзея.

Вярнуўся поп пасля службы дахаты, сеў абедаць.

— Нясі, матухна, на стол гавядзіну. Нешта выгаладаўся я сёння.

— Гавядзіны, бацюшка, я не варыла,— кажа пападдзя.— Але ўкінула ў гаршчок з гарохам добры кавалак свініны.

— Давай свініну.

Пайшла пападдзя на кухню, пабоўталася ў гаршку — няма свініны... Вярнулася яна і кажа папу:

— Дзіва: няма ў гаршку свініны. Ці не наймічка з'ела?

Тут поп і язык прыкусіў: здагадаўся, чыя гэта работа. Вось табе і свіння ў гаросе!

— Не, матушка,— кажа поп,— не наймічка свініну спажыла, а Аўдзей-зладзей. Ён быў у мяне на споведзі, і я, дурань, дараваў яму гэты грэх...

«А пра якога ж гэта мядзведзя ён мне плёў?» — падумаў поп.

Выйшаў ён у сенцы, глядзіць: няма яго новага футра!

«Вось табе і мядзведзь! — ледзь не заенчыў поп.— Застаецца разгадаць яшчэ, хто такія шаптуны».

А тут якраз пападдзя пытаецца:

— Колькі, бацюшка, часу на тваім гадзінніку?

Хапіўся поп за кішэнь, у якім гадзіннік насіў, а яго і няма...

І тут папу ўсё стала ясна: каго ён спавядаў і каму грахі дараваў.



# ЯК ВЯДЗЬМАР НА ЗОРЫ ГЛЯДЗЕЎ

Жыў у адным сяле вядзьмар. Звалі яго Нічыпар. Слава і пагалоска пра яго ішлі далёка. Адкуль толькі не прыязджалі ды не прыходзілі да яго людзі! Ведама, людзі без бяды не жывуць. Аднаго хвароба апанавала, у другога з жывёлай не ладзіцца, на трэцяга злы сусед ці суседка залом заламала або ліхім словам наклікалі порчу на яго самога ці на яго род і плод. Адным словам, клопату людзям хапае. А вядзьмар — той усё мог зрабіць: ён і заломы вырываў, і ад розных хвароб лячыў, і порчу адрабляў. Ды і не дзіва! Ён, казалі, не толькі з багамі, а і з самімі чарцямі мог гаманіць. А як гляне ўночы на зоры, дык адразу пазнае, чаму ў суседа авечка або вол здохлі. Быццам там на тых зорах так і напісана: на авечку ў суседа Саўкі наслаў порчу сусед Сымон, а на Сымонавага вала — сусед Лявон...

Ды да пары збан ваду носіць.

Было яно так. Заняпала ў аднаго чалавека карова.

— Пакліч, Сцяпанка, ведзьмара,— кажа жонка мужыку,— няхай пашэпча, мо яна і паправіцца.

— Вядзьмар дарэмна шаптаць не будзе,— адказаў мужык,— пачакаем, можа, сама ўстане.

Але карова не ўстала.

Жонка ў плач: апошняя кароўка загінула. А купіць другую — не купіш: на гэта грошы патрэбны. А дзе тыя грошы ў бедняка!

Выйшаў засмучаны Сцяпан на вуліцу, каб не слухаць жончынага ляманту. Тут бачыць: вядзьмар Нічыпар ідзе.

— Што,— кажа вядзьмар,— няшчасце ў цябе, Сцяпане?

— Але ж, няшчасце.

— Гэта, відаць, нейкі злы чалавек табе зрабіў. Трэба на зоры паглядзець.

— Паглядзі, Нічыпарка,— просіць Сцяпан ведзьмара.— Нічога не пашкадую. Зрабі, братка, так, каб і мой ліхадзей плакаў, як я.

— Гэта можна,— адказвае Нічыпар.

Павёў Сцяпан ведзьмара ў хату. Паіў і карміў яго да позняга вечара. Напіўся, наеўся вядзьмар і лёг спаць. У поўнач устаў і пытаецца ў гаспадара:

— Ты спіш?

— Не,— адказвае гаспадар,— сон не бярэ.

— Нічога, спі спакойна. А я пайду на зоры глядзець. Вось пабачыш, заўтра ж не будзе каровы ў таго, хто на тваю скаціну порчу напусціў.

Сабраўся Нічыпар і пайшоў на зоры глядзець.

А назаўтра чуць свет чуе Сцяпан, як на суседнім двары бабы загаласілі: самая лепшая

карова іх прапала. Увечары зусім здаровая была, а тут ні з таго ні з сяго і ногі выпруціла.

— Ну, цяпер бачыш,— хваліцца вядзьмар Сцяпану,— хто тваю кароўку са свету звёў. Як паглядзеў я на зоры, дык усё і ўгадаў. А потым як шапнуў святому Ягору — заступніку скацінкі — адно-два слоўцы, то ліхому суседу і сталася тое, што ён табе зрабіў. Але ты, Сцяпане, не кажы яму пра гэта. Чуеш? Так святы Ягор хоча.

Ну, калі сам святы Ягор так хоча, то трэба маўчаць пра такое дзіва.

Пайшоў вядзьмар да Сцяпанавага суседа Лявона.

— Гэта,— кажа,— няйначай, як нехта наваражыў на тваю карову. Хочаш — пагляджу на зоры і адраблю ліха.

— Адрабі, даражэнькі! — просіць ведзьмара Сцяпанаў сусед.— У даўгу не застануся.

Вось пасля добрай выпіўкі і закускі вядзьмар гэтак жа ўстаў у поўнач і пытаецца ў гаспадара:

— Ты спіш?

— Не, не сплю.

— Спі, спі спакойна, а я пайду на зоры глядзець.

І пайшоў з хаты.

Пачуў гэта гаспадароў сын Пятрок, хлапчук так гадоў дванаццаці. Цікавасць яго ўзяла, як гэта вядзьмар Нічыпар будзе на зоры глядзець.

Устаў Пятрок ды падаўся цішком з хаты. Прытуліўся за вуглом і цікуе, што будзе вядзьмар рабіць. Бачыць: вядзьмар пастаяў на вуліцы, а потым, азіраючыся, пасунуўся на двор суседа Мікіты. І знік там.

Толькі хацеў ужо вярнуцца Пятрок у хату, як раптам чуе: нешта вельмі ж моцна загрукала ў суседа ў хляве.

«Ці не воўк авечак душыць? — падумаў сам сабе Пятрок.— Трэба дзядзьку Мікіту сказаць».

Падбег ён да акна і забарабаніў у шыбу:

— Дзядзька Мікіта, а дзядзька Мікіта!

— Хто там? — пытаецца Мікіта.

— Гэта я — Лявонаў Пятрок. У вашым хляве нешта моцна стукае. Ці не воўк там?

Запаліў Мікіта ліхтар і пабег у хлеў. Бачыць: аж там вядзьмар Нічыпар... Сядзіць на валу і душыць яго пятлёю. Вол ужо і не храпе, толькі нагамі дрыгае.

— Што ж гэта ты, гад, робіш? — закрычаў гаспадар.— Я ж цябе зараз самога задушу!

Схапіў ён добрую паплеціну ды давай лупіць ведзьмара па чым папала.

На крык збегліся людзі. Насілу адратавалі вала, а ведзьмара так прыбілі, што думалі, ён ужо больш і не ўстане. Ажно жывучы быў вядзьмар: паваляўся трохі ды ачухаўся. Але з таго часу годзе ўжо на зоры глядзець.



## ДВОЕ СКУПЫХ

Прадаў цыган каня на рынку ды ішоў дадому, у свой цыганскі табар. Дзень быў халодны, ветраны. Так і працінае цыгана навылёт.

Едзе па дарозе барадаты балагол[1]. Цыган да яго:

— Падвязі, баця.

— Далёка?

Цыган сказаў.

— А колькі за фурманку дасі?

— Дваццаць капеек.

— Не,— матае галавою балагол.— Мала. Давай рубля. У вас, цыганоў, грошай многа.

Таргаваліся, таргаваліся, сышліся на паўрублі.

— Толькі грошы наперад,— дамаўляецца балагол.— А то скруціш потым. Я вас, цыганоў, ведаю.

---

[1] Балагол — возчык.

Даў яму цыган паўрубля і сеў на воз. Праехаў трохі, яшчэ халадней яму стала, як было.

— Гэй, баця,— кажа цыган,— вярні мне грыўню[1], я на грыўню прабягу з вярсту, а то зусім замёрз.

— Не,— кажа балагол.— Дагаварыліся — і справе канец. А хочаш прабегчы, то бяжы сабе на здароўе. Мне ўсё роўна, што з табою ехаць, што без цябе.

Не хочацца цыгану дарэмна бегчы: грошы ж за ўсю дарогу заплаціў. Праехаў ён яшчэ трохі ды зноў да вазака:

— То вярні хоць дзесятку[2].

— Не, не вярну.

Сядзіць цыган на возе, мерзне. Ужо як корч здубянеў. Зубамі ляскае.

— Вярні, баця, хоць капейку,— просіць цыган.

— Не. Дагавор даражэй за грошы.

Так і не спусціў скупы балагол цыгану ні капейкі. А скупы цыган так і не злез з воза да самага канца дарогі.

Прывёз яго балагол у табар і спіхнуў з воза, як калоду, бо сам цыган ужо і на нагах не стаяў.

---

[1] Г р ы ў н я — дзесяць капеек.

[2] Д з е с я т к а — пяць капеек.



## ПЯТРУШКА

Жыў на свеце адзін пан. Вялікі быў у яго маёнтак, і шмат меў ён усялякага дабра. Але найбольш з усяго свайго багацця любіў пан сабакуганчака. Хітры гэта быў сабака — ну, як чалавек, не раўняючы. Што пан яму ні загадае — усё зробіць. І імя яму даў пан не абы-якое, а чалавечае: Пятрушка.

А трэба сказаць, што пан той быў надта люты. Ніводзін парабак не мог выслужыць у яго больш за тыдзень.

Здарылася аднаго разу так, што пан зусім без парабкаў застаўся: усе пазбягалі. Паспрабаваў ён сам за работу брацца. Ды дзе там: і рабіць нічога не ўмее, і лянуецца. Ведама, прывык на гатовым жыць. Запрог тады пан каня і паехаў шукаць парабкаў. Ездзіў, ездзіў — ніхто не ідзе да яго: усе ж ведалі, які гэта паганы пан!

Сярдзіты, варочаецца пан дахаты. Бачыць:

насустрач хлапец ідзе і песню спявае. А сам абадраны, босы.

«Ну,— думае пан,— папытаюся, можа, хоць гэты абадранец пойдзе да мяне ў парабкі».

Прыпыніў ён каня.

— Гэй, хлоп басаногі,— крычыць,— ці не ноймешся ты да мяне за парабка?

Хлапец спыніўся.

— А чаму ж,— кажа,— не наняцца, калі добры пан трапляецца. Давай, наймай.

Усміхнуўся пан сам сабе ды думае: «Эге, відаць, ноймецца, калі добрым мяне палічыў».

— Ну, то садзіся на воз,— кажа пан.

Сеў Янка (так звалі таго хлапца) на воз, і паехалі яны ў маёнтак. Прыехалі дадому, пан і кажа Янку:

— Бяры другога каня ды едзь у лес па дровы.

Янка сумеўся:

— Можа, пане, спачатку паабедаць дасі. Я, бачыш, з дарогі, галодны.

— А хіба я наймаў цябе абедаць, а не рабіць? — закрычаў пан.— Бачыш, які хітры!

Пачухаў Янка патыліцу і кажа:

— Але ж я не ведаю, дзе панскі лес і якія там дрэвы секчы.

— Ну,— адказвае пан,— я змарыўся і не магу табе расказваць. Гэта зробіць мой сабака Пятрушка. Я шапну яму, і ён завядзе цябе куды трэба.

Запрог Янка каня і паехаў услед за сабакам. Сабака ўзрадаваўся, што на волі апынуўся, ды давай гайсаць, куды папала лятаць. І Янка ўслед за ім. Сабака ў лужыну — і парабак з возам за ім, сабака ў кусты — і Янка туды. Гэтак і ў лес прыехалі.

Толькі ссек Янка адно дрэва, як сабака завяр-

нуўся ды пабег дахаты. Кінуў Янка работу, сеў на воз ды за сабакам следам. Куды сабака — туды і Янка.

Убачыў пан, што парабак без дроў вярнуўся, напаў на яго ды давай біць. Біў-біў, ледзь не забіў.

Назаўтра пабудзіў пан Янку і загадвае:

— Ідзі, гультай, барана зарэж: сёння да мяне госці прыедуць.

— А якога, пане, барана зарэзаць? — пытаецца Янка.

Пан махнуў рукою:

— Няма ў мяне ахвоты табе расказваць. Пакліч Пятрушку — да каторага ён падбяжыць, таго і рэж.

Узяў Янка самы большы нож, паклікаў сабаку і пайшоў у аўчарню. А аўчарня ў пана вялікая — і авечак і бараноў у ёй многа. Вось і пачаў сабака бегаць па аўчарні: да аднаго барана падбяжыць, да другога. А Янка ўслед за ім — ды па горле, ды па горле тым баранам, да каторых Пятрушка падбягае. І так усіх бараноў перарэзаў.

Прыйшоў пан паглядзець, ці добрага барана зарэзаў Янка для гасцей. Як глянуў, дык аж за галаву хапіўся: усе яго бараны перарэзаны! Зноў пачаў пан біць Янку. Біў-біў, ледзь не забіў.

Ачухаўся Янка, пан яму і кажа:

— Цяпер, дурань, вары бараніну. Ды глядзі, каб смачная была: перцу падсып і пятрушкі накрышы.

Думаў, думаў Янка, што гэта за пятрушка, а потым успомніў: ды гэта ж панскі сабака так завецца! Зарэзаў ён сабаку, шкуру злупіў, а мяса пакрышыў дробна ды ў кацёл, як пан казаў.

Сабраліся ў пана госці. Пачаў іх Янка бараніною частаваць. Ядуць паны сабачыну, аж за ву-

шамі трашчыць. Наеліся так, што дыхаць не могуць.

— А цяпер, дарагія госці,— кажа пан,— я пакажу вам свайго вучонага сабаку. Гэй, Янка, пакліч сюды Пятрушку!

— Якога, пане, Пятрушку? — дзівіцца Янка.— Ты ж сам загадаў мне пакрышыць яго і бараніну прыправіць.

Як пачуў гэта пан, дык аж учарнеў ад злосці, аж усе вантробы ў яго перавярнуліся.

Ну, з пана і дух вон.



## СУП З СЯКЕРЫ

Ішоў салдат дарогаю. Падбіўся, прагаладаўся. А ў торбе — ні крошкі. Адна старая сякера без тапарышча, якую ён на дарозе знайшоў.

Зайшоў салдат у сяло. Пытаецца ў сустрэчнага мужыка:

— Хто тут у вас на харчы багацейшы?

Падумаў мужык і кажа:

— Ды вунь у трэцяй хаце адна баба жыве. Багацця ў яе хоць адбаўляй, а скупая, не дай бог.

Зайшоў салдат да скупой бабы, добры дзень даў. Разгаварыўся і папрасіў есці.

— А мой ты служывенькі, а мой ты саколік. Няма ж у мяне нічога — ні ў гумне, ні ў клеці. Сама галодная сяджу...

Дастаў салдат сякеру з торбы і кажа:

— Ну, нічога, старая, давай чыгун, будзем суп з сякеры варыць.

Здзівілася баба, але чыгун дала.

Укінуў салдат сякеру ў чыгун, наліў вады і паставіў у печ.

Паварыў трохі свой суп, пакаштаваў і кажа бабе:

— Нішто суп, не хапае толькі солі ды круп.

Пакаштавала і баба салдацкага супу.

— Але,— кажа,— праўда: не хапае солі і круп.

— То, можа, падкінеш трохі? — пытаецца салдат.

Памулялася баба, але ўсё ж прынесла солі і круп.

Паварыў салдат яшчэ свой суп, пакаштаваў.

— Нішто,— кажа,— суп, не хапае толькі цыбулі ды здору або лою. Можа, падкінеш, бабка?

Падкінула баба ў салдатаў суп цыбулі і здору.

І тут такі пах пайшоў, што салдат аж зачхаў на ўсю хату. Ды і ў бабы слінкі пацяклі.

Наеўся салдат супу з сякеры, бабу пачаставаў.

— Ай, служывенькі,— дзівіцца баба.— Век пражыла, а такой стравы не ела: гэта ж і суп смачны, і сякера цэлая!



## САМЫ МУДРЫ

У аднаго палкоўніка здох любімы конь. Пабедаваў палкоўнік ды паслаў дзяншчыка шукаць шкурадзёра.

Прыйшоў дзяншчык у вёску. Каго ні пакліча, усе адмаўляюцца. «Не навучаны,— кажуць,— мы гэтым займацца. Схадзі ты, чалавеча, да панскага цівуна, ён на такія штукі майстар: здзярэ так, што лепш і не трэба».

«Жартуюць,— думае дзяншчык,— які ж гэта цівун згодзіцца з дохлага каня шкуру здзіраць?»

А трэба палкоўніцкі загад выконваць.

Пайшоў дзяншчык да цівуна.

— Хто тут у вас самы мудры? — пытаецца.— Палкоўнік хоча яго ўзнагародзіць.

Пачуў цівун пра ўзнагароду і кажа:

— Ды, здаецца, апрача мяне, нікога няма. Я за ўсіх мудрэйшы.

— Ну, дык хадзем хутчэй,— сказаў дзяншчык і пацягнуў цівуна ў полк.

Прыйшлі да палкоўніка.

— Вось, пан палкоўнік,— кажа дзяншчык,— самага мудрага шкурадзёра знайшоў.

Вылупіў цівун вочы, хацеў нешта сказаць, а палкоўнік нож яму ў рукі:

— Ідзі злупі шкуру з каня! Кру-гом! Шагам марш!

Сагнуўся цівун, прыкусіў язык і пайшоў шкуру здзіраць.

З таго часу ўжо болей не лічыў ён сябе самым мудрым.



## БРАХУН І ПАДБРЭХІЧ

Жыў некалі пад Мазыром адзін чалавек. Рабіць ленаваўся, красці баяўся. А лгун быў — пашукаць — не знойдзеш. Чаго толькі ён не выдумляў!

Жонка жартуе з яго і лае за хлусню, а ён свайго не пакідае.

Аднаго разу жонка і кажа мужыку:

— Каб за тваю хлусню хто плаціў — во багатыя былі б мы!

— А чаму ж! — адказвае мужык.— Можна і плату браць.

— З каго?

— З тых, хто будзе мяне слухаць.

Пажартавала жонка, а мужык сабраўся і падаўся ў заработкі.

Ідзе ды ідзе, сустракае па дарозе чалавека. Спыніліся, разгаварыліся.

— Ты хто будзеш? — пытаецца сустрэчны.

— Брахун,— адказвае мужык.— А ты хто?

Падумаў той і кажа:

— А я — Падбрэхіч.

— О,— узрадаваўся Брахун,— такі таварыш мне і патрэбен. Хадзем са мною!

— Хадзем.

І пайшлі яны разам.

Ішлі, ішлі, бачаць: стаіць пень пры дарозе. Брахун кажа:

— Вунь, брат, воўк пабег!..

— Ну і што! — адказвае Падбрэхіч.— Я двух толькі што бачыў, ды і то прамаўчаў.

— Малайчына! — пахваліў Брахун Падбрэхіча.— З табою мы не прападзём.

Пайшлі далей. Бачаць: панскія агароднікі грады робяць, збіраюцца капусту садзіць. А каля іх цівун з бізуном пахаджвае.

— Памагай бог! — прывітаўся Брахун да агароднікаў.

— Дзякуем! — адказалі агароднікі.— Адкуль вы, людзі добрыя?

— З-пад Мазыра.

Слова за слова, разгаварыліся.

— А як у вашых краях капуста родзіць? — пытаецца Брахун.

— Нішто. Бывае, качаны па вядру вырастаюць.

— Ну,— скрывіўся Брахун,— гэта не капуста, а арэшкі. Вось у нас капуста расце: рота салдатаў пад адным лістом у дождж хаваецца.

Сказаў і адышоўся ўбок.

Цівун пачуў гэтую гаворку. «Вось бы такую капусту нашаму пану завесці!» — думае.

Падышоў ён да Падбрэхіча, пытаецца:

— Хто гэты чалавек?

— Гаспадар мой.

— А пра капусту ён праўду кажа?

— Чыстую праўду! — божыцца Падбрэхіч.— У нас агарод пры дарозе быў. Аднаго разу ехалі паны шасцерыком у карэце. Коні разгарачыліся ды зляцелі з дарогі проста ў капусту. То — дайце веры! Вось у карэце хоць і жалезная была, а як зачапілася за качан, дык і лопнула. А качану хоць бы што: нават з месца не скрануўся. Во якая капуста ў нас расце!

— Ай-яй-яй! — дзівіцца цівун.— А гарбузы?

— Растуць яшчэ лепш,— адказвае Падбрэхіч.— У тым жа агародзе былі і гарбузы. Дык адзін гарбуз рос, рос і ўсю дарогу загарадзіў. Ехалі паны, на гэты раз чацверыком. Коні імчаліся наўгалоп. Ведама, панскія стаеннікі, не спрацаваныя, як нашы. Фурман не мог іх стрымаць. Дык яны проста на той гарбуз наляцелі. Гарбуз — трах і раскалоўся. А коні так і ўваліліся ў яго мякіш разам з карэтаю і з панамі. Фурман ледзьве паспеў сам з козлаў саскочыць. Збегаў ён дахаты па сякеру, прасек у гарбузе дзірку, залез усярэдзіну. Ды так і да гэтага часу шукае там сваіх паноў.

Цівун аж вочы вытрашчыў.

— А ці не мог бы твой гаспадар навучыць і мяне такую капусту і такія гарбузы садзіць? — пытаецца.

— Папрасі, можа, і навучыць.

— Гэй, чалавек! — гукнуў цівун да Брахуна.

Брахун падышоў:

— Што скажаш?

— Навучы мяне, чалавеча, капусту і гарбузы садзіць.

— Можна, чаму не навучыць. Толькі за навуку я дзешава не бяру.

— А колькі возьмеш?



— Пяцьсот рублёў за капусту і пяцьсот — за гарбузы.

— Дарагавата,— паморшчыўся цівун.— Ну, ды вучы!

— Не,— кажа Брахун.— Спачатку задатак давай. А рэшту — як ураджай знімеш.

— Колькі задатку?

— Любую палавіну.

Схадзіў цівун у маёнтак да пана, прынёс грошы.

Узяў Брахун задатак і кажа:

— А цяпер я мушу ў Мазыр па насенне ісці. Тут адмысловае насенне патрэбна. Мой памочнік няхай пакуль што градкі мерае.

Завярнуўся і пайшоў. А Падбрэхіч тым часам узяў палку ды давай градкі мераць. Да вечара мераў, а як сцямнела — толькі яго і бачылі.

Сустрэліся назаўтра Брахун і Падбрэхіч.

— Ну вось,— кажа Брахун,— пяцьсот рублёў ужо зарабілі. Пойдзем далей.

Доўга ішлі ці нядоўга, прыходзяць адвячоркам у вялікі горад. Там майстры касцёл будавалі.

— Памагай бог! — прывітаўся Брахун.

— Дзякуем!

— А што, хлопцы, касцёл ваш высокі будзе?

— Высокі, уга! Сажняў з дзесяць.

— Э, гэта не касцёл, а каплічка. Вось мы з прыяцелем касцёлы будавалі, пад самыя воблакі.

Сказаў так Брахун і адышоўся ўбок, быццам касцёл агледзець. Майстры пытаюцца ў Падбрэхіча:

— Гэта праўда?

— Чыстая праўда! — клянецца Падбрэхіч.— Калі мы пабудавалі ў адным мястэчку касцёл, дык ксяндзоў певень на самы крыж узабраўся і адтуль палавіну месяца здзёўб...

Паглядзелі майстры на месяц, а яго і праўда — усяго палавінка на небе! Яны і паверылі.

— Навучыце і нас такія касцёлы будаваць! — просяцца.

— Можна,— адказвае Брахун.— Толькі дорага будзе каштаваць навука.

— Колькі?

— Тысячу.

— Што ж, пойдзем да ксяндза.

Ксёндз як пачуў пра такі высокі касцёл, што аж да самага месяца крыжам дастае, дык адразу згадзіўся даць тысячу рублёў майстрам за навуку.

Узяў Брахун пяцьсот рублёў задатку і ўхапіўся за работу. Папрацаваў з памочнікам да вечара, а там — шукай ветру ў полі.

Падзялілі Брахун і Падбрэхіч заработкі і пайшлі дахаты.

Ідуць ды ідуць, бачаць: едзе па дарозе пан. Фурман крычыць здалёку:

— Дарогу!

Брахун адказвае:

— Мы — брахунцы, з дарогі не саступаем!

— Якія там яшчэ брахунцы? — дзівіцца пан.

— А такія, пане: калі захочам, выбрашам у пана гэтую пару конікаў.

— Ну, брашыце! — смяецца пан.

— Але ж, пане, гэта доўгая работа,— кажа Брахун.— А вунь там, за лесам, адкуль дымок віецца, жывуць старыя брахуны, тыя адразу могуць выбрахаць. Няхай пан адпражэ аднаго каня і дасць майму памочніку, ён з'ездзіць па іх.

Пана ўзяла цікавасць: што там за старыя брахуны? Ён і кажа фурману:

— Адпражы яму каня, няхай з'ездзіць.

— Што вы, пане,— запярэчыў фурман.— Ён як паедзе, дык і не вернецца.

Брахун паціснуў плячыма.

— Цікава, пане, хто тут пан: ты ці фурман?

— Як — фурман?! — закрычаў пан.— Я естам пан! Рабі,— кажа да фурмана,— што табе загадана.

Выпраг фурман каня. Падбрэхіч сеў на яго і пасмаліў за лес.

Чакаў, чакаў пан — няма ні брахуноў, ні каня.

— Яны майго памочніка, відаць, не паслухаліся,— кажа Брахун.— Вось каб я сам паехаў, дык як бач прывёз бы іх.

— Едзь! — кажа пан.— Толькі хутчэй, бо мне дахаты пара.

Сеў Брахун на другога каня і паджгаў услед за Падбрэхічам.

Прыязджае дахаты. А там жонка накінулася на яго:

— Дзе ты цягаешся, стары лгун? Лепей бы з торбамі пахадзіў, то, можа, хоць хлеба зажабраваў бы.

— Навошта жабраваць? — кажа Брахун. Высыпаў ён на стол цэлую кучу грошай.

— Дзе ты дастаў? — дзівіцца жонка.

— Зарабіў,— смяецца мужык.— Вунь яшчэ і прыдача: панскі гняды конь на двары стаіць. А ты кажаш: за хлусню грошы не плацяць. Яшчэ і як плацяць!



## ЯК МУЖЫК ГУСЕЙ ДЗЯЛІЎ

Жыў адзін бедны мужык. Зіму сяк-так перакідаўся. А прыйшла вясна — хоць зубы на паліцу кладзі. Адна гуска засталася, ды і тая худая.

— Занясу,— кажа мужык жонцы,— я гэтую гуску пану. Можа, ён дасць за яе крыху жыта. А там лебяда вырасце — як-небудзь і перакідаемся да новага хлеба.

— Добра,— адказвае жонка,— нясі. Нам з гускі мала карысці: без хлеба — і мяса не яда.

Зарэзаў бедны мужык гуску, аскуб і прынёс да пана.

— Што хочаш за яе? — пытаецца пан.

— Дорага з пана не вазьму,— адказвае мужык.— Дасі гарцы з два жыта...

Пан падумаў: гуска хоць і худая, але не дарагая.

— Ну, добра,— кажа,— куплю тваю гуску. Але падзялі ты яе на маю сям'ю.

— А якая ў пана сям'я? — пытаецца мужык.
— Я, пані мая, два сынкі і дзве дачкі.
Мужык падумаў і кажа:
— Пан — галава сям'і, пану і выдзелім галаву. Пані — першая пасля пана асоба, ёй няхай шыйка будзе. Сынкі падрастуць трошкі ды пойдуць таптаць бацькоўскія дарожкі — ім няхай будуць ножкі. А дочкам — па крылу, каб хутчэй замуж з дому вылятaлі.
— А рэшту каму? — пытаецца пан.
— А рэшту мне. За тое, што падзяліў.
— Ну і хітры ж ты, мужык! — дзівіцца пан.— Удала падзяліў. Нічога не скажаш.
Аддаў пан мужыку гуску і яшчэ мех жыта ў прыдачу. Ідзе мужык дахаты, пасвіствае.
Даведаўся пра гэта яго сусед, багаты мужык. Схапіў ён пад пахі ажно пяць адкормленых гусак і — да пана.
— Вось,— кажа, засопшыся,— прынёс табе, панок, пяць гусак. Дай мне за іх пяць мяхоў жыта.
Пан кажа:
— Добра, дам табе пяць мяхоў жыта. Але падзялі ты гэтых гусак на шэсць душ маёй сям'і.
Дзяліў, дзяліў багаты мужык гусак — нічога не выходзіць. А тут якраз недалёка бедны мужык праходзіў. Пан паклікаў яго.
— Падзялі ты гэтых гусак,— кажа,— на шэсць душ маёй сям'і. Бо твой сусед зусім бесталковы — не можа падзяліць пяць гусак на шэсць душ.
Падумаў бедны мужык і пытаецца ў пана:
— Ці верыць пан у святую троіцу?
— А як жа! — адказвае пан.— Хіба ж я не каталік?

— Ну, дык будзем дзяліць. Пан, пані і гуска — святая тройца. Два панскія сынкі і гуска — яшчэ святая тройца. Дзве панскія дачкі і гуска — трэцяя святая тройца. А я і дзве гускі — таксама святая тройца.

— Ну, бачыш,— кажа пан да багатага мужыка,— як трэба дзяліць?

Аддаў пан беднаму мужыку дзве гускі, а багатага выгнаў вон.



## ЗАЙЗДРОСНЫ ДЗЯДЗЬКА

Жылі два браты: адзін бедны, другі багаты. Бедны, паміраючы, сказаў сынам-падлеткам:

— Глядзіце на дзядзьку: што ён будзе рабіць, тое рабіце і вы.

Так сыны і рабілі, як бацька навучыў.

Добра сталі жыць браты. А дзядзька аж чарнее ад зайздрасці: гэтак, чаго добрага, пляменнічкі стануць багацейшыя за яго!

Пайшоў аднаго разу да дзядзькі меншы брат даведацца, што ён заўтра будзе рабіць. А дзядзька і кажа:

— Буду двор каля хлявоў капаць...

Вярнуўся брат і расказаў старэйшаму, што іх дзядзька збіраецца рабіць.

— Добра,— кажа брат,— будзем і мы двор капаць.

Капнулі браты разоў колькі і знайшлі цудоўны камень — блішчыць, як сонца!

Пакруцілі хлопцы камень у руках — не ведаюць, што гэта такое.

— Занясём яго, бадай, пану,— кажа старэйшы брат.— Можа, ён ведае.

Узяў пан камень і даў хлопцам за яго цэлы воз збажыны.

Зажылі цяпер браты яшчэ лепш, чым раней. А дзядзьку яшчэ большая зайздрасць грызе.

— Скажыце,— пытаецца ён у хлопцаў,— чым гэта вы дагадзілі пану, што ён вам гэтулькі збажыны не пашкадаваў?

— А нічым асаблівым,— кажа старэйшы брат.— Даведаліся, што пан вельмі любіць на абед жабаў. Ну, налавілі мы іх цэлую торбу ды і прынеслі яму як падарунак. За гэта ён нас і ўзнагародзіў.

Пабег зайздросны дзядзька на балота, налавіў цэлы мех жабаў і павалок пану.

Прыйшоў і кланяецца:

— Добры дзень, панок!

— Ну, што скажаш, Кузьма? — пытаецца пан.

— Ды вось прынёс пану гасцінец.

— Які гасцінец?

— Такі, як пляменнікі прыносілі. Хачу таксама мець ад пана ўзнагароду.

Развязаў Кузьма мех і высыпаў на панскі стол свой гасцінец...

Пан так і падскочыў разам з крэслам.

— Ах ты, нягоднік! — закрычаў ён.— Дык ты з мяне жартаваць надумаўся? Гэй, слугі! На стайню яго!

Схапілі панскія слугі прагнага дзядзьку, пацягнулі на стайню ды так яго ўзнагародзілі, што ён ледзьве ачухаўся.



## СВЯТЫ ДУХ

Служыў у адным касцёле прагны ксёндз. І заработкі былі ў яго нядрэнныя, а ўсё здавалася яму мала. Скупіцца, маўляў, пачалі парафіяне на ахвяры пану богу. І ў касцёл не часта заглядваюць.

«Трэба,— вырашыў ксёндз,— дзіва якое-небудзь прыдумаць. Без святога дзіва справы, відаць, не палепшаюць».

Думаў ён, думаў і прыдумаў. Распусціў па ваколіцы чутку, што ў нядзелю спусціцца з неба ў касцёл дух святы.

І пайшла чутка гуляць па вёсках ды засценках, а ксёндз радуецца: «Цяпер ужо ахвяры пану богу як з мяшка пасыплюцца! Ну, а каля бога можна і мне пажывіцца трохі». Паклікаў ксёндз парабка і кажа яму:

— Злаві белага голуба ды занясі ў касцёл на званіцу. А ў столі зрабі дзірку і пакуль што

дошкаю яе залажы. У нядзелю адслужу я абедню, пачну казань казаць. А ты тым часам лезь на званіцу, злаві голуба і чакай. Як толькі я скажу: «Дух свенты, зыйдзь на мяне!» — пускай у дзірку голуба. Зразумеў?

— Зразумеў, пане ксенжа,— адказаў парабак.

Настала нядзеля. У касцёл народ валам валіць — і старыя і малыя. Набралася парафіян, што няма дзе і яблыку ўпасці. Ды і на цвінтары нямала: ведама, усім цікава паглядзець на жывога святога духа.

А ксёндз ледзь не скача ад радасці — такога збору парафіян яшчэ не бывала! Памагла-такі выдумка!

Адслужыў ён сяк-так абедню, спяшаючыся, з пятае на дзесятае, і хутчэй казань распачаў. А ўсе ўжо чакаюць святога духа і без яго пакуль што нічога на касцёл не ахвяруюць.

Тым часам парабак — шмыг на званіцу. А там глядзіць: няма голуба... Толькі ксяндзоў рыжы кот на званіцы сядзіць, аблізваецца. І галубіныя пер'і каля яго валяюцца...

«Што ж тут рабіць? — думае парабак.— Другога голуба лавіць няма калі». А тут і ксяндзоў голас пачуўся:

— Дух свенты, зыйдзь на мяне!

Схапіў тады парабак рыжага ката ды і кінуў яго ў дзірку замест голуба. «Усё роўна,— думае,— адна ў іх святасць: што ў ката, што ў голуба».

Плюхнуўся кот проста ксяндзу на галаву, агледзеўся — поўна народу, уцякаць няма куды. Запусціў ён вострыя кіпцюры ў ксяндзову лысіну і зафыркаў на ўвесь касцёл.

Цярпіць ксёндз. Думае, і праўда святы дух

сышоў на яго. Але чаму ж ён такі недалікатны? Фыркае злосна ды яшчэ ўчапіўся кіпцюрамі ў лысіну, як сапраўдны кот... Цярпеў, цярпеў ксёндз, а потым і давай прасіцца ў святога духа:

— Свенты дух міласэрны, пакінь мяне, грэшнага, узнясіся назад на неба!

Не слухае святы дух — сядзіць, як клешч, на галаве. А народ ад смеху ледзь не падае: ну і святы дух сышоў на іх набожнага ксяндза! Ад такога духа не паздаровіцца яго лысіне!

Бачыць ксёндз — бяда: прыстаў да яго святы дух як смала. Не вытрымаў ён, падняў сутану і ходу з касцёла. А народ за ім:

— Пане ксенжа, куды ж ты святога духа пацягнуў?

Прыбег ксёндз дахаты з рыжым катом на галаве. Ледзьве там парабкі садралі разам са скурай з яго лысіны святога духа.

Перастаў тады прагны ксёндз дзівы выдумляць, а касцёл з таго часу і зусім апусцеў.





## РЫЖЫ І ЛЫСЫ

Сабраўся адзін хлопец ехаць у горад па сваіх справах. Бацька кажа яму:

— Толькі асцерагайся, сынок, рыжых і лысых.

— Чаму?

— Бо рыжыя надта хітрыя, а лысыя надта разумныя...

Пасмяяўся сын з бацькавай навукі і паехаў.

Трапілася па дарозе карчма. Зайшоў сын у карчму і папрасіў абед. Рыжы карчмар падаў яму міску капусты.

Есць хлопец капусту ды пахвальвае:

— Вось смачная яда, кожная лыжка цэлага рубля каштуе!

Пачуў гэта карчмар, узяў крэйду і, як толькі зачэрпне хлопец лыжку капусты,— чырк пад сталом крэйдаю.

Наеўся хлопец і пытаецца ў карчмара:

— Ну, колькі ж за капусту табе плаціць?

— Сто рублёў,— кажа карчмар.— Па рублю за лыжку, як сам гаварыў.

— Адкуль жа ты ведаеш, колькі я лыжак з'еў?

Перакуліў карчмар стол і пачаў лічыць палачкі. Налічыў роўна сотню.

«Вось,— падумаў сам сабе хлопец,— праўду такі бацька казаў — асцерагайся рыжых».

І як ні прасіў ён — забраў карчмар усе яго грошы. Паехаў хлопец назад: без грошай жа ў горадзе рабіць няма чаго. Раптам бачыць: едзе насустрач нейкі чалавек у брычцы, без шапкі, а галава лысая, blішчыць на сонцы, як патэльня. «Ну,— думае хлопец,— цяпер я зусім прапаў: рыжы грошы забраў, а гэтаму і каня, бадай, з возам давядзецца аддаць». Завярнуў ён з дарогі і памчаўся ў лес.

«Гэта злодзей, відаць, нейкі, калі ад людзей уцякае»,— падумаў лысы і кінуўся наўздагон. Дагнаў хлопца, схапіў за каўнер:

— Прызнавайся, што ўкраў?

Бачыць хлопец: нічога не зробіш, і расказаў лысаму, чаму ён так яго напалохаўся.

Пасмяяўся лысы і кажа:

— Добра, паедзем назад, я табе грошы вярну.

Прыехалі яны ў карчму, а лысы паглядзеў туды-сюды, бачыць: ляжыць на калодзе цялячая лапатка. Падышоў ён да карчмара, пастукаў яго па плячы і пытаецца:

— Колькі каштуе твая лапатка?

Карчмар падумаў, што той хоча купіць цялячую лапатку, і кажа:

— Тры рублі.

Дастаў лысы тры рублі, заплаціў, узяў нож і загадвае карчмару:

— Скідай пінжак.

— Навошта? — здзівіўся карчмар.

— А то я сапсую яго, калі буду выразаць у цябе лапатку.

— Што ты, чалавеча,— заенчыў карчмар,— хіба ж можна за тры рублі сваю лапатку прадаць?

— А хіба можна сто рублёў за міску капусты браць? — кажа лысы.

І як ні выкручваўся хітры карчмар, а давялося яму вярнуць хлопцу грошы. Ды яшчэ і сваіх палавіну аддаў лысаму, каб той лапатку не выразаў.

Зарадаваўся хлопец і дзякуе лысаму.

— Дай бог,— кажа,— каб і ва ўсіх так галовы аблыселі, як у цябе. Тады б мне не прыйшлося нікога асцерагацца.





## ЦЫГАН І ПОП

Наняўся цыган у папа сена касіць. Дагаварыліся. Назаўтра напакаваў цыган добрую торбу ежы і паехаў з папоўскімі парабкамі на сенажаць. Прыехаў, паглядзеў — раса вялікая.

— Раніцою касіць нельга — росна,— кажа цыган.— Давайце пакуль што паснедаем.

Ну, парабкі і рады. Селі снедаць.

Тым часам і сонца прыпякло.

— Удзень,— кажа цыган,— касіць нельга — млосна. Давайце паабедаем.

Паабедалі.

— А зараз,— кажа цыган,— трэба паспаць, каб здор завязаўся.

— А калі касіць будзем? — пытаюцца парабкі.

— Адвячоркам.

Паспалі да вечара. Цыган устаў, пацягнуўся і кажа:

— А цяпер таксама не да касьбы: камары. Давайце вячэраць.

Павячэралі. Цыган кажа:

— Ну, а зараз дахаты пара.

Прыехалі дахаты. Цыган пайшоў да папа:

— Давай, бацюшка, плату: усю тваю сенажаць скасілі.

Заплаціў поп цыгану за работу і даў яму пірог у прыдачу.

Цыган прыстаў:

— Не, бацюшка, гэтага за такую работу мала: дай яшчэ сала.

Поп пачаў таргавацца:

— Хопіць табе і без сала!

— Ну, бацюшка,— кажа цыган,— не даў ты мне сала, каб тваё сена травою ўстала.

І пайшоў сваёю дарогаю.

Назаўтра паехаў поп сам з парабкамі сена грэбці. Глядзіць — і праўда: замест сена трава стаіць...

— Ах,— хапіўся за галаву поп,— лепш бы я даў цыгану кавалак сала, а так уся работа прапала...

 

## ХВОСТ ДЫ ГРЫВА

Быў у бацькі сын Хвядос. Сабраўся бацька яго жаніць. Сам паехаў дзяўчыну сватаць, а сыну загадаў сушыць снапы ў сушылцы.

Пайшоў Хвядос снапы сушыць ды і сушылку спаліў. Прыязджае на досвітку бацька са сватоў, будзіць сына:

— Хадзем малаціць.

Хвядос адказвае:

— А чым, калі цапы пагарэлі?

— Як пагарэлі?

— А так, сушылка згарэла, дык і цапы разам з ёю.

Пабедаваў бацька і думае сам сабе: «Ажаню яго, можа, тады паразумнее».

Паслаў ён Хвядоса да папа на споведзь.

Пайшоў Хвядос да папа.

— Ну што,— пытаецца поп,— жаніцца хочаш?

— Хачу.

— А ці ведаеш ты пацеры[1]?

— Не,— кажа Хвядос.— А вось ёсьцека ў мяне меншы брат, дык той на пацеры, як гад.

Узлаваўся поп на Хвядоса, хацеў яго прагнаць, ды бачыць: нешта трымае ён пад крысом.

— Што гэта ў цябе?

— А гэта, бацюшка, я гасцінца прынёс.

— Якога?

— Ды трохі жывіны, трохі збажыны.

Палажыў перад папом курыцу і вянок цыбулі.

Поп палагаднеў.

— Добра,— кажа,— але сёння спавядаць цябе не буду — позна. Бяры маю кабылу і едзь на начлег. А заўтра я з табою разлічуся.

Назаўтра раніцою прыйшоў Хвядос да папа, надзьмуўся і стаіць на парозе. Поп пытаецца:

— Чаго ты надзьмуўся, Хвядос?

— І ты б надзьмуўся, каб на начлезе пабыў.

— А што там такое было?

— А тое, што тваю кабылу ваўкі ўкусілі.

— Як — укусілі? Будзе жыва?

— Дзе там! Застаўся толькі хвост ды грыва.

---

[1] П а́ ц е р ы — малітвы.



## КУЛАК І ПАРАБАК

Жыў-быў скупы і хітры кулак. Парабкі працавалі на яго ад цямна да цямна. А карміў ён іх толькі адзін раз у дзень.

Вось як гэта было. Пасадзіць кулак парабка снедаць. А снедання дасць з камарыны нос. Паснедае парабак і нават не пачуе — было што ў роце ці не. Тады кулак пытаецца ў яго:

— Можа, паабедаеш заадно? Бо няма чаго табе даваць у торбу.

— Добра,— згаджаецца парабак,— давай і абед.

З'есць парабак і абед, а кулак зноў пытаецца:

— То, можа, ужо і павячэраеш адным заходам? Як вернешся з работы, не трэба будзе час траціць на вячэру — хутчэй спаць ляжаш.

— Давай і вячэру,— кажа галодны парабак.

З'есць парабак і вячэру, а потым цэлы дзень працуе і не еўшы спаць кладзецца.

Шмат перабыло ў скупога кулака парабкаў. Больш тыдня ніхто не мог вытрымаць такога жыцця.

Ды вось знайшоўся адзін парабак, які перахітрыў кулака.

Паснедаў ён, паабедаў, павячэраў ды пытаецца:

— Дзе тут, гаспадар, у вас можна спаць легчы?

— Як гэта спаць? — здзівіўся кулак.— А на работу хто пойдзе?

— Здурнеў ты, гаспадар, ці што? — адказаў парабак.— Дзе ты бачыў, каб пасля вячэры добрыя людзі на работу ішлі? Павячэраўшы, трэба спаць класціся.

І парабак разлёгся на канапе ды моцна захроп.





## ПАГАНЫ ПАН

Жыў-быў пан, ды такі паганы, што слова яму не скажы — засячэ розгамі.

Доўга ён так з людзей здзекаваўся. Ніхто яму нічога не мог зрабіць.

Ды недарэмна прыказка кажа: да пары збан ваду носіць.

Прыйшоў канец і таму пану. Вось як яно было.

Жылі ў адной з панскіх вёсак тры неразлучныя сябры — дужыя ды смелыя дзецюкі. Згаварыліся яны адплаціць пану за здзекі з людзей. І пачалі цікаваць за ім.

Даведаліся хлопцы, што пан любіць у лес ездзіць на пагулянку — свежым паветрам падыхаць.

Пайшлі яны аднойчы ў лес, стаіліся за дрэвамі недалёка ад дарогі, чакаюць.

Ці доўга чакалі, ці нядоўга, раптам бачаць:

коціцца па лясной дарозе павозка, а ў ёй пан сядзіць, сам канём кіруе.

Пад'ехаў пан блізка.

— Стой, паганец! — крыкнулі хлопцы пану.

Пан так і аслупянеў ад нечаканасці.

Падхапілі хлопцы пана, завялі ў лес ды прывязалі да дрэва.

Стаіць пан, дрыжыць, а потым пытаецца ў хлапцоў:

— Хто вы такія? Як вас завуць?

— Адзін кажа:

— Мяне завуць Няруш.

Другі кажа:

— Мяне — Нечапай.

А трэці:

— А мяне — Якая Табе Справа!

Адказалі яму так хлопцы і пайшлі дахаты.

Ішоў назаўтра каля таго дрэва ляснік. Убачыў пана і пытаецца:

— Хто гэта, пане, цябе прывязаў?

— Няруш, Нечапай, Якая Табе Справа! — закрычаў разгневаны пан.

Плюнуў ляснік і пайшоў сваёю дарогаю.

**ЗМЕСТ**

СТАРЫ БАЦЬКА — 5
ЯК МУЖЫК ЦАРСКАГА ГЕНЕРАЛА ПРАВУЧЫЎ — 8
АД КРАДЗЕНАГА НЕ ПАСЫЦЕЕШ — 12
СТРАШНЫ ЗАЛОМ — 15
ЯК СЦЁПКА З ПАНАМ ГАВАРЫЎ — 18
ПАЛЕШУКІ І ПАЛЕВІКІ — 24
ДУРНАЯ ПАНІ І «РАЗУМНЫ» ПАН — 29
ШАПТУХА — 34
НЕДАЛІКАТНЫ СЫН — 37
СТРАЛЕЦ І РЫБАК — 39
НАДАКУЧЛІВЫЯ ГОСЦІ — 43
ЗАМЫКАЙ — 46
ПАНУ НАВУКА — 49
ДВА КАМЕНІ — 55
СЛЯПЫ, ГЛУХІ І БЯЗНОГІ — 57
НЕ СІЛА, А СМЕЛАСЦЬ — 60
ПАН І КАЗАЧНІК — 64
ЯК КСЯНДЗЫ ВЫЛЕЧЫЛІСЯ — 69
КІСЕЛЬ — 73
МУЖЫК І ЖОНКА — 76
ПОП І ДЗЯК — 81
ЯК ПАНА ВІНШАВАЛІ — 87
ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ — 89
ПАНСКАЯ ГАВОРКА — 91
ДОБРЫ ЗНАЁМЫ — 93
САЛДАТ З ТАГО СВЕТУ — 95
РАЗУМНАЯ ДАЧКА — 98
НЕ КАЖЫ «ГОП», ПАКУЛЬ НЕ ПЕРАСКОЧЫШ — 107
ЦІ БЫЛА Ў ПАПА ГАЛАВА — 109
ДЗЯК — БЛАГІ СПЯВАК — 111
ПІСАР-АШУКАНЕЦ — 112
УПАРТАЯ ЖОНКА — 116
ПОП-АШУКАНЕЦ — 118
ЗА КАНЯ — БРУСОК — 120
СТАРЫЯ, ЯК МАЛЫЯ — 122
ПАНСКАЯ ЛАСКА — 125
САПРАЎДНЫ ДУРАНЬ — 128
РАЗЫШОЎСЯ, ЯК ЗАЕЧАЕ САЛА — 134
СКУПЫ ПОП — 136

КСЁНДЗ У РАІ — 138
АМІН, КАРОЎКА, АМІН! — 140
ЯК ПОП МАЛІЎСЯ — 142
ШТУКАР КЛІМКА — 144
ЦЯСЛЯР-САМАХВАЛ — 160
ПОП І ЗЛОДЗЕЙ — 163
ЯК ВЯДЗЬМАР НА ЗОРЫ ГЛЯДЗЕЎ — 166
ДВОЕ СКУПЫХ — 170
ПЯТРУШКА — 172
СУП З СЯКЕРЫ — 176
САМЫ МУДРЫ — 178
БРАХУН І ПАДБРЭХІЧ — 180
ЯК МУЖЫК ГУСЕЙ ДЗЯЛІЎ — 187
ЗАЙЗДРОСНЫ ДЗЯДЗЬКА — 190
СВЯТЫ ДУХ — 192
РЫЖЫ І ЛЫСЫ — 195
ЦЫГАН І ПОП — 198
ХВОСТ ДЫ ГРЫВА — 200
КУЛАК І ПАРАБАК — 202
ПАГАНЫ ПАН — 204

Литературно-художественное
издание

# ЛЮДЕЙ СЛУШАЙ, А СВОЙ РАЗУМ ИМЕЙ

Белорусские
народные
сказки

*Для детей дошкольного
и младшего школьного возраста*

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае
выданне

# ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ

Беларускія
народныя
казкі

Загадчык рэдакцыі М. А. Казбярук
Адказны за выпуск А. М. Каляда
Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова
Мастак В. П. Славук
Мастацкі рэдактар М. У. Чуднікаў
Тэхнічны рэдактар С. А. Абрамчук
Карэктары Л. П. Стэсік, Л. С. Мануленка

ІБ № 619

Здадзена ў набор 31.12.86.
Падпісана да друку 15.07.88.
Фармат $70 \times 108^{1}/_{16}$. Папера афс. № 2.
Гарнітура Школьная.
Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 18,20.
Ум. фарб.-адб. 74,20. Ул.-выд. арк. 9,78.
Тыраж 90 000 экз. (2-і завод 10 001—90 000 экз.).
Зак. 590. Цана 85 к.

Выдавецтва «Юнацтва»
Дзяржаўнага камітэта БССР
па справах выдавецтваў, паліграфіі
і кніжнага гандлю.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка
каляровага друку.
220115, Мінск, Каржанеўская, 20.
Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны
Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга
паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа.
220005, Мінск, Чырвоная, 23.

85 к.



«Юнацтва»

ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ